Ю. П. Шкапляроў
М. А. Волкаў
Р. Д. Галынскі

# ІДЭАЛЬНЫ ГОРАД-КРЭПАСЦЬ. ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ СТАРОГА БЫХАВА Ў XVII СТАГОДДЗІ



Пачаць прагляд

Магілёў 2020

МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
«Магілёўскі інстытут
Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»

**Ю. П. Шкапляроў**
**М. А. Волкаў**
**Р. Д. Галынскі**

# ІДЭАЛЬНЫ ГОРАД-КРЭПАСЦЬ. ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ СТАРОГА БЫХАВА Ў XVII СТАГОДДЗІ

Манаграфія

Пад навуковай рэдакцыяй
доктара гістарычных навук,
прафесара І. А. Марзалюка

Навуковае электроннае сеткавае тэкставае выданне

Магілёў
Магілёўскі інстытут МУС
2020

**ISBN 978-985-7155-68-2 (on-line)**
**ISBN 978-985-7155-06-4**

© Установа адукацыі «Магілёўскі інстытут
Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»
(on-line), 2020

© Установа адукацыі «Магілёўскі інстытут
Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»,
2018

Перайсці да звестак аб выданні 1 2 3 Перайсці да чытання

УДК 94(476)

**Ю. П. Шкапляроў**
**М. А. Волкаў**
**Р. Д. Галынскі**

# ІДЭАЛЬНЫ ГОРАД-КРЭПАСЦЬ. ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ СТАРОГА БЫХАВА Ў XVII СТАГОДДЗІ

*Навуковае электроннае сеткавае тэкставае выданне*

*Рэкамендавана да выдання навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь*

**Шкапляроў, Ю. П.**

Ідэальны горад-крэпасць. Ваенная гісторыя Старога Быхава ў XVII стагоддзі : манаграфія / Ю. П. Шкапляроў, М. А. Волкаў, Р. Д. Галынскі ; пад навук. рэд. доктара гістарычных навук, прафесара І. А. Марзалюка ; М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь, установа адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь». — Магілёў : Магілёўскі інстытут МУС, 2020. — Рэжым доступу: http://elib.institutemvd.by/handle/MVD_NAM/4857. — Загал. з экрана.

ISBN 978-985-7155-68-2.

У прадстаўленай працы разглядаецца архітэктура, арганізацыя абароны і ваенная гісторыя Старабыхаўскай крэпасці ў XVII стагоддзі. Для свайго часу фартэцыя ўяўляла сабой паспяховую рэалізацыю канцэпцыі «ідэальнага горада-крэпасці» на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, а сёння гэта ўнікальны для Беларусі помнік палацава-замкавай архітэктуры канца XVI – XVIII стагоддзяў.

Кніга адрасуецца шырокаму колу чытачоў, перш за ўсё тым, хто цікавіцца ваеннай гісторыяй Беларусі ўвогуле і гісторыяй Быхава ў прыватнасці.

Вул. Крупскай, 67, Магілёў
тэл. +375 222 72 41 58
e-mail: rio@institutemvd.by
http://www.institutemvd.by

© Установа адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», (on-line), 2020

© Установа адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь», 2018

Перайсці да звестак аб выданні 2 3 Перайсці да тытульнага экрана
Перайсці да чытання

**Ю. П. Шкапляроў**
**М. А. Волкаў**
**Р. Д. Галынскі**

# ІДЭАЛЬНЫ ГОРАД-КРЭПАСЦЬ. ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ СТАРОГА БЫХАВА Ў XVII СТАГОДДЗІ

*Навуковае электроннае сеткавае тэкставае выданне*

Аснову дадзенага выдання складае друкаванае выданне:

Аўтары:
*Ю. П. Шкапляроў* (уводзіны, раздзелы 2, 3, заключэнне),
*М. А. Волкаў* (раздзел 1, заключэнне),
*Р. Д. Галынскі* (раздзел 2)

**Шкапляроў, Ю. П.**

Ідэальны горад-крэпасць. Ваенная гісторыя Старога Быхава ў XVII стагоддзі : манаграфія / Ю. П. Шкапляроў, М. А. Волкаў, Р. Д. Галынскі ; пад навук. рэд. доктара гістарычных навук, прафесара І. А. Марзалюка ; М-ва ўнутр. спраў Рэсп. Беларусь, установа адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь». — Магілёў : Магілёўскі інстытут МУС, 2018. — 140 с.

ISBN 978-985-7155-06-4.

Перайсці да тытульнага экрана Перайсці да звестак аб выданні 1 3
Перайсці да чытання

**Ю. П. Шкапляроў**
**М. А. Волкаў**
**Р. Д. Галынскі**

# ІДЭАЛЬНЫ ГОРАД-КРЭПАСЦЬ. ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ СТАРОГА БЫХАВА Ў XVII СТАГОДДЗІ

**Рэцэнзенты:**
рэктар установы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», доктар гістарычных навук, прафесар *Д. У. Дук*;
загадчык аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат гістарычных навук *А. Б. Доўнар*

**Звесткі аб праграмным забеспячэнні:**
сучасныя праграмы прагляду вэб-старонак (браўзеры) Opera, Mozilla Firefox, Google Chrome і іншыя. Такія браўзеры не патрабуюць дадатковых настроек і ажыццяўляюць адкрыццё pdf-файла пры націсканні на адпаведную спасылку.

Рэдактар *І. Л. Даніленка*
Рэдактар тэхнічны *Н. А. Навумовіч*
Карэктар *Т. Ю. Лухтанава*

Установа адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь».
Вул. Крупскай, 67, 212011, Магілёў, тэл. +375 222 72 41 58.
www.institutemvd.by

Дата падпісання да выкарыстання: 14.10.2020.
Аб'ём 20 Мб. Заказ № 11.

Перайсці да тытульнага экрана Перайсці да звестак аб выданні 1 2
Перайсці да чытання

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........................................................................................ 7

Раздзел 1 БЫХАЎ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст. ............................................... 9

Раздзел 2 СТАРАБЫХАЎСКАЯ КРЭПАСЦЬ У XVII ст.: АРХІТЭКТУРА І АРГАНІЗАЦЫЯ АБАРОНЫ ........................................ 36

Раздзел 3 ГОРАД-ГЕРОЙ XVII ст.: СТАРЫ БЫХАЎ У ВАЙНЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ З РУСКІМ ЦАРСТВАМ 1654–1667 гг. ........................... 83

ЗАКЛЮЧЭННЕ ................................................................................ 130

ДАДАТКІ ..................................................................................... 132

# УВОДЗІНЫ

Рэшткі Быхаўскай крэпасці, якія складаюцца з замка, земляных абарончых збудаванняў вакол яго і гістарычнай часткі горада, уяўляюць сабой унікальны помнік палацава-замкавай архітэктуры канца XVI – XVIII стст. Сёння гэта адзіны ў Беларусі адносна захаваны горад-крэпасць узору XVII ст. Акрамя таго, гэта прыватны горад-крэпасць. Прыватныя крэпасці, якія належалі магнацкім родам, былі важным элементам абароны Вялікага Княства Літоўскага (далей — ВКЛ) і Рэчы Паспалітай. Гэтыя гарады мелі свае гарнізоны, артылерыю і арсенал. Уладкаванне і арганізацыя гарадоў-крэпасцей былі прыстасаваны для абароны. Нават размяшчэнне жылых кварталаў служыла патрэбам вайны: іх планіроўка дазваляла весці паспяховыя баі і пасля прарыву ворага праз знешнія ўмацаванні.

Старабыхаўская фартэцыя ўвайшла ў гісторыю, галоўным чынам, дзякуючы сваёй важнай ролі ў абарончых баях падчас вайны Рэчы Паспалітай з Рускім царствам 1654–1667 гг. Менавіта ў гэты час Стары Быхаў стаў прыкладам паспяховай рэалізацыі канцэпцыі ідэальнага горада-крэпасці.

У прадстаўленай працы разглядаецца архітэктура, этапы будаўніцтва, арганізацыя абароны і ваенная гісторыя Старабыхаўскай крэпасці выключна XVII ст. Выбар зроблены аўтарамі не выпадкова. Менавіта ў гэтым стагоддзі ў Старым Быхаве была пабудавана бастыённая сістэма ўмацаванняў і забяспечана на найвышэйшым узроўні арганізацыя яе абароны. Менавіта ў гэтым жа стагоддзі настаў час выпрабавання як для крэпасці, так і для яе гераічных абаронцаў. І, на жаль, падзенне крэпасці ў другой палове XVII ст. і жахлівыя страты, панесеныя жыхарамі горада падчас баёў, абумовілі яе далейшы заняпад. Вядома, можна ўспомніць аблогі Старога Быхава падчас Хатняй вайны ў Рэчы Паспалітай (1702 г.) і Паўночнай вайны (1707 г.). Аднак характар гэтых войнаў і мэты, якія ставілі вайскаводцы пры аблогах і абароне крэпасці, а таксама паводзіны жыхароў горада вельмі адрозніваюцца ад таго, што мела месца некалькі дзесяцігоддзяў раней. Такім чынам, Стары Быхаў можна параўнаць са знічкай, якая ярка ўспыхнула на цёмным небасхіле XVII ст., прарэзала дымы ад ваенных пажарышчаў таго стагоддзя і згасла, пакінуўшы на небе свой яскравы след. Можна гаварыць аб тым, што для гэтага горада цесная ўзаемасувязь з узброенымі сіламі з’яўляецца як шчасцем, так і праклёнам. Менавіта развіццё ў Старым Быхаве вайсковай справы і наяўнасць ваенных гарнізонаў абумоўлівалі як яго рост і развіццё, так і заняпад. Так было і ў XVII, і ў XX стст.

Дадзеная праца складаецца з трох раздзелаў. У першым раздзеле «Быхаў у першай палове XVII ст.», падрыхтаваным М. Волкавым, паведамляецца пра этапы будаўніцтва замка і фартыфікацыйных збудаванняў, аналізуюцца перадумовы і прычыны росквіту Быхава. Таксама аўтар разглядае некаторыя пытанні, звязаныя з гісторыяй быхаўскай людвісарні і гарнізона фартэцыі. Другі раздзел «Старабыхаўская крэпасць у XVII ст.: архітэктура і арганізацыя

абароны» за аўтарствам Р. Галынскага і Ю. Шкаплярова прысвечаны апісанню ўладкавання і арганізацыі абароны Старабыхаўскай фартэцыі ў XVII ст. У трэцім раздзеле «Горад-герой XVII ст.: Стары Быхаў у вайне Рэчы Паспалітай з Рускім царствам 1654–1667 гг.» падрабязна разглядаюцца ваенныя дзеянні і падзеі вакол Старога Быхава падчас згаданай вайны. Аўтарам апошняга раздзела з'яўляецца Ю. Шкапляроў.

Кніга адрасуецца шырокаму колу чытачоў, перш за ўсё тым, хто цікавіцца ваеннай гісторыяй Беларусі ўвогуле і гісторыяй Быхава ў прыватнасці.

## Раздзел 1

## БЫХАЎ У ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

З пачатку XVI ст. у ВКЛ стала пашырацца прыватнаўласніцкае рэзідэнцыянальнае будаўніцтва, што было звязана з палітычным і эканамічным умацаваннем магнатаў. Пэўны час мураваныя магнацкія замкі мелі даволі сціплыя памеры (Геранёны, Іказнь, Дубінкі). Выключэннем з'яўляецца разбудаваны рэзідэнцыянальны комплекс Юрыя Ільініча першай чвэрці XVI ст. у Міры, але па сваіх памерах ён не мае аналагаў у ВКЛ. У апошняй чвэрці XVI – першай палове XVII ст. адбываецца росквіт рэзідэнцыянальнага будаўніцтва, а памеры і значэнне магнацкіх рэзідэнцый значна ўзраслі. У гэты час паўсталі вялікія мураваныя замкі ў Біржах, Гальшанах, Ляхавічах, Нясвіжы, Смалянах і Быхаве. Акрамя развітай жылой часткі, многія з іх мелі першакласныя фартыфікацыйныя ўмацаванні. Таму гэты перыяд з'яўляецца вельмі цікавым і важным у гісторыі архітэктуры ВКЛ.

Вывучэнне магнацкіх рэзідэнцый апошняй чвэрці XVI – першай паловы XVII ст. з'яўляецца важным не толькі для мастацтвазнаўства і гісторыі архітэктуры, а таксама дазваляе лепей зразумець гэты час. Паколькі рэзідэнцыі магнатаў былі цэнтрамі палітычнага жыцця, іх вывучэнне пралівае святло на спецыфіку грамадска-палітычнага ладу ў дзяржаве. Неабходнасць будаўніцтва і ўтрымання вялікіх рэзідэнцыянальных комплексаў, у склад якіх, акрамя ўласна сядзіб, уваходзілі таксама гарады, была выклікана шмат у чым імкненнем уласнікаў да рэарганізацыі эканамічнага ўкладу зямельных латыфундый і павышэння іх прыбытковасці[1]. Таму ад рэзідэнцый залежала сацыяльна-эканамічнае развіццё вялікіх рэгіёнаў. У архітэктурнай праграме рэзідэнцыянальных будынкаў знаходзілі адлюстраванне культура і ідэйныя перакананні вышэйшых слаёў грамадства, у тым ліку характар знешніх культурных уплываў[2]. Урэшце характар абарончых умацаванняў магнацкіх рэзідэнцый сведчыць аб узроўні ваеннай небяспекі ў тых ці іншых рэгіёнах і спецыфіцы ваеннага тэатра дзяржавы ў цэлым.

---

[1] Bania Z. Nowożytne zamki polskiej magnaterii. Uwagi o reprezentacji na wybranych przykładach // Studia nad sztuką renesansu i baroku. T. IX : Ceremoniał i obyczaj w XVI–XVIII wieku. Lublin, 2008. S. 111–112 ; Яго ж. Pojęcie rezydencji w architekturze polskiej XVII i XVIII w. na przykładzie Podhorzec i Brodów // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI–XVIII w. Lublin, 2000. S. 385–388.

[2] Волкаў М. Абарончыя рэзідэнцыі як сімвал самарэпрэзентацыі магнатэрыі (на прыкладзе роду Радзівілаў) // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2015. Вып. 30. С. 67–74.

Нягледзячы на вялікае значэнне рэзідэнцый магнатаў апошняй чвэрці XVI – першай паловы XVII ст., аб гісторыі будаўніцтва і функцыянавання многіх з іх нам вядома вельмі мала. Гэтая сітуацыя тлумачыцца ў першую чаргу недахопам крыніц. Але мэтанакіраваныя пошукі ў архівасховішчах дазваляюць пашырыць нашыя веды аб гісторыі асобных рэзідэнцый. У прыватнасці, у выніку апрацоўкі карэспандэнцыі Хадкевічаў і Сапегаў намі выяўлены новыя звесткі пра будаўніцтва рэзідэнцыі ў Быхаве, які належаў гэтым магнацкім родам. Найбольшую каштоўнасць уяўляюць лісты мясцовых ураднікаў да ўладальнікаў. Гэтыя лісты маюць характар справаздач і змяшчаюць інфармацыю аб выкананні даручэнняў, у тым ліку аб будаўнічых і іншых працах, а таксама паведамленні аб розных падзеях, якія адбываліся ў дадзенай мясцовасці[1]. Дзякуючы гэтым матэрыялам, мы можам паглыбіць нашыя веды аб Быхаве, які быў адной з самых вялікіх магнацкіх рэзідэнцый на ўсходніх землях Беларусі ў першай палове XVII ст.

**Ранняя гісторыя Быхава**

Гісторыя Быхава ў XV–XVI стст. даволі заблытаная, аднак яе вывучэнне дазваляе зразумець важнасць гэтага паселішча для роду Хадкевічаў, якія сфарміравалі вакол яго вялікую латыфундыю і пачалі будаўніцтва рэзідэнцыі. Упершыню Быхаў згадваецца ў «Спісе рускіх гарадоў дальніх і бліжніх», датаваным канцом XIV ст.[2]. Згадка ў гэтай крыніцы сведчыць аб наяўнасці ў Быхаве ўмацавання, бо «гарадамі», ці «градамі», у гэты час называлі менавіта ўмацаваныя аб’екты. Наступнай па храналогіі з’яўляецца згадка пра «двор Быхаў», які князь Дзмітрый Сямёнавіч Зубравіцкі з роду князёў Друцкіх разам з дваром Добасна і іншымі маёнткамі ў 1444 г. ці 1459 г. запісаў сваёй жонцы Зоф’і[3]. Дачка апошняй Марына Сямёнава Трабская ў 1496 г. падарыла Быхаў (фігуруе ў дакументах і як двор, і як «дворац») разам з дваром Добасна Альбрэхту Гаштольду (1470–

---

[1] Значную колькасць лістоў ураднікаў Хадкевічам і Сапегам, у якіх распавядаецца аб справах у Быхаве, удалося выявіць у бібліятэцы Літоўскай акадэміі навук імя Урублеўскіх (ф. 139) і аддзеле рукапісаў Львоўскай нацыянальнай навуковай бібліятэкі Украіны імя Васіля Стэфаніка (ф. 103).

[2] Тихомиров М. Н. Список русских городов дальних и ближних // Русское летописание. М., 1979. С. 94 ; Дедук А. В. «Список русских городов дальних и ближних»: история изучения // Русский книжник. М., 2015. С. 129–141.

[3] Lietuvos Metrika. Knyga 1 (1380–1584): Užrašymų knyga 1. Vilnius, 1998. № 393. У 1470 г. запіс аб перадачы згаданых маёнткаў быў пацверджаны Казімірам, прычым у гэты час князь Дзмітрый Сямёнавіч згадваецца ўжо як нябожчык (Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. Warszawa, 1895. S. 57). Паколькі запіс быў зроблены 31 мая 7 індыкту, гэта мог быць або 1444 г., або 1459 г.

1539)[1]. У 1515 г. Жыгімонт I надаў гэтаму магнату дадаткова маёнтак Тайманава[2]. Але пасля смерці яго сына Станіслава (каля 1507–1542), які не пакінуў нашчадкаў, усе землі Гаштольдаў разам з быхаўскім дваром перайшлі ва ўласнасць вялікага князя.

Быхаўскі маёнтак Гаштольдаў быў толькі часткай колішняй быхаўскай воласці, падзеленай, як вынікае з крыніц, ужо ў канцы XIV ст. Другой яе часткай разам з вёскамі на паўночны захад ад Быхава валодаў Іван Хадкевіч (пам. каля 1484)[3]. Пазней гэты маёнтак перайшоў яго сыну Аляксандру (1457–1549). У першай палове XVI ст. Быхаў атрымаў права на гандаль, г. зн. у юрыдычным плане быў ператвораны ў «места», ці горад. Так, у 1529 г. згадваецца быхаўскі «мешчанін» Аляксандра Хадкевіча Іван Бык, які вёў замежны гандаль, што, дарэчы, ускосна сведчыць аб заможнасці паселішча ўжо ў той час[4]. Акрамя таго, «места» Быхаў згадваецца сярод спадчыны Гаштольдаў[5]. Верагодна, горад быў падзелены паміж двума ўласнікамі. На гэта ўказвае і судовая справа 1541 г., паводле якой і Аляксандр Хадкевіч, і Станіслаў Гаштольд мелі сваіх асобных быхаўскіх ураднікаў[6].

Пасля смерці Аляксандра Хадкевіча яго сыны Геранім (1500–1561), Рыгор (пам. 1572) і Юрый (1524–1569) падзялілі маёнткі бацькі. Прычым у дзельчым акце Быхаў быў згаданы першым і перадаваўся старэйшаму брату Гераніму, што сведчыць аб вялікім значэнні гэтага маёнтка для роду[7]. У 1556 г. Жыгімонт II Аўгуст надаў Рыгору Хадкевічу адразу два зямельныя комплексы: колішнюю гаштольдаўскую частку Быхава разам з дваром Добасна і «двор» Быхаў з вёскамі Холстава, Людчыцы, Камарычы, Тайманава, Абідавічы, Лазаравічы і Палкі[8]. Апошні маёнтак уяўляў сабой трэцюю частку колішняй быхаўскай воласці і пазней атрымаў назву Новы Быхаў. Для перадачы гэтых зямель на месца быў высланы ранейшы быхаўскі дзяржаўца князь Іван Васільевіч Саламярэцкі[9]. У 1560 г. Геранім

---

[1] Lietuvos Metrika. Knyga 1. № 372, 401, 455 ; В. Насевіч. Друцкае княства і князі Друцкія // Беларусы: станаўленне этнасу і нацыянальная ідэя. Смаленск, 2015. С. 353–354.

[2] Lietuvos Metrika. Knyga 1. № 457.

[3] Там жа. № 321.

[4] Lietuvos Metrika (1528–1547): 6-oji Teismų knyga. Vilnius, 1995. № 116.

[5] НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). КМФ-18. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 277.

[6] НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). Ф. 694. Воп. 7. Спр. 832.

[7] Kossakowski S. Monografie historyczno-genealogiczne niektórych rodzin polskich. Warszawa, 1859. T. 1. S. 313–318.

[8] НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). КМФ-18. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 277 ; Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius. F. 18. № 139. Рэестр папераў Стара- і Новабыхаўскага графстваў. 1541–1751. L. 2–2v; № 140. Архіўная кніга Быхаўскага графства. 1541–1751. P. 5.

[9] Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 43 (1523–1560). Кніга запісаў 43. Мінск, 2003. № 16.

Хадкевіч выкупіў частку быхаўскага маёнтка, якая знаходзілася ў заставе ў Марыі Янавай Гарнастай. У тым жа годзе браты Хадкевічы абмяняліся землямі ў быхаўскім маёнтку паміж сабой і такім чынам дакладна размежавалі свае часткі[1]. У выніку ўтварылася вялікая зямельная латыфундыя, якая сучаснікамі ўспрымалася як сумеснае валоданне Хадкевічаў[2] і, верагодна, мела важнае значэнне для ўмацавання пазіцый роду ў ВКЛ. Большая частка Быхава, магчыма, належала Гераніму Хадкевічу, бо ў 1568 г. падаткі з Быхава сплочваў не Рыгор Хадкевіч, а сын Гераніма Ян (каля 1530–1579), якому пасля смерці бацькі ў 1561 г. адышла яго частка быхаўскай латыфундыі[3]. Прычым у валоданне Быхавам Ян Хадкевіч уступіў адразу, у той час як іншымі маёнткамі бацькі (Мыш, Свіслач і інш.) пэўны час кіравала яго маці Ганна[4]. Аб тым, што малады магнат адразу ўзяўся за справы свайго быхаўскага маёнтка, сведчыць прывілей на заснаванне мястэчка ў Гарадцы непадалёк ад Быхава, выдадзены вялікім князем на яго імя ў 1561 г.[5].

Сярод быхаўскіх дакументаў у архіве Сапегаў захоўваўся прывілей, выдадзены ў 1560 г. вялікім князем Рыгору Хадкевічу на заснаванне горада і замка. Аднак незразумела, якім чынам ён тычыўся самога Быхава, бо месца, дзе планавалася збудаваць замак і заснаваць горад, у апісанні дакумента не названа[6]. Магчыма, праз атрыманне гэтага прывілея Рыгор Хадкевіч мог паспрыяць развіццю Быхава, часткай якога ён валодаў. Разам з тым гэты прывілей мог тычыцца зусім іншага паселішча, напрыклад Новага Быхава. У 1572 г. Рыгор Хадкевіч памёр, а яго сыны не пакінулі нашчадкаў, у выніку чаго землі магната, у тым ліку значная частка быхаўскай латыфундыі, перайшлі ў валоданне іншых родаў. Нягледзячы на значнае змяншэнне быхаўскага маёнтка Хадкевічаў, новазбудаваны замак і большая частка Быхава засталіся ва ўласнасці роду і пазней перайшлі ў спадчыну сынам Яна Хадкевіча. У XVII ст. Сапегі змаглі вярнуць частку страчаных зямель, у тым ліку Новы Быхаў, і ізноў далучылі іх да быхаўскай латыфундыі.

Асобна трэба спыніцца на праблеме першага быхаўскага замка. Так, у пачатку Старадубскай вайны з Маскоўскай дзяржавай у 1534 г.

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 18. № 139. L. 2v; № 140. P. 6.

[2] Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 44: Кніга запісаў 44 (1559–1566). Мінск, 2001. № 32.

[3] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 18. № 140. P. 253.

[4] Там жа. P. 252.

[5] НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). КМФ-18. Воп. 1. Спр. 41. Арк. 213 адв.

[6] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 18. № 139. L. 2v; № 140. P. 5–6.

згадваецца «замак Быхаў», які належаў Аляксандру Хадкевічу[1]. Але ў гэтым выпадку, верагодна, меўся на ўвазе ўмацаваны двор, якім валодаў яшчэ Іван Хадкевіч, бо ў дзельчым акце 1549 г. замак у Быхаве не згадваўся. Пры гэтым у крыніцах першай паловы XVI ст. сустракаюцца звесткі, якія дазваляюць меркаваць, што меўся яшчэ адзін «замак Быхаў», які меў асобную воласць і належаў вялікаму князю[2]. Недзе ў першай палове – сярэдзіне XVI ст. замак Быхаў ад караля і замак Рагачоў ад каралевы трымаў Павел Папяльжынскі[3]. У крыніцах няма звестак аб тым, каб нейкі замак меўся на землях, што належалі Гаштольдам і ў далейшым перайшлі ва ўласнасць вялікага князя. Разам з тым вядома, што пры перадачы ў 1556 г. Рыгору Хадкевічу Быхава, які пазней стаў называцца Новым, там згадваўся двор. На нашу думку, гэта і быў той самы вялікакняжацкі замак, які да сярэдзіны XVI ст. ужо прыйшоў у заняпад. Аб тым, што вялікі князь надаваў мала ўвагі гэтаму ўмацаванню, сведчыць выдадзены ў 1545 г. дазвол на выкарыстанне яго быхаўскіх падданых на будаўніцтве замка ў Рагачове[4]. Іншымі словамі, манарх не бачыў патрэбы ў тым, каб будаваць ці рамантаваць свой быхаўскі замак, а неўзабаве ўвогуле аддаў яго ў прыватнае валоданне. Тым не менш гэта было даволі значнае ўмацаванне, якое ў другой палове – сярэдзіне XVII ст. было адноўлена і выкарыстоўвалася па прамым прызначэнні. Паводле археалагічных даных, вал гэтага замка датуецца XIV–XVII стст.[5]. Такім чынам, можна выказаць гіпотэзу, што менавіта тут мог знаходзіцца «град» Быхаў, згаданы ў «Спісе гарадоў рускіх дальніх і бліжніх» канца XIV ст. У сваю чаргу, назвы «Стары Быхаў» і «Новы Быхаў» з’яўляюцца пазнейшымі: яны сталі выкарыстоўвацца з сярэдзіны – другой паловы XVII ст., пасля таго як Сапегі далучылі да свайго Быхава маёнтак Быхаў-Тайманава. Такім чынам, у іх адлюстраваны не рэальны ўзрост гэтых паселішчаў, а паслядоўнасць фарміравання сапегаўскай латыфундыі.

Падагульняючы папярэднія разважанні, яшчэ раз звернем увагу на факт існавання ў XV–XVI стст. у межах сучаснага Быхава двух двароў. Верагодна, адзін з іх варта атаясамліваць з невялікім гарадзішчам, якое знаходзіцца ў 0,3–0,4 км на поўдзень ад цэнтра горада і датуецца археолага

[1] Радзивилловские акты из собрания Российской национальной библиотеки: первая половина XVI века. М. ; Варшава, 2002. С. 73.

[2] Там жа. С. 121, 122.

[3] НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). Ф. 694. Воп. 4. Спр. 1087. Арк. 64.

[4] Lietuvos Metrika. Knyga 1. № 387.

[5] Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. Мінск, 2009. Т. 1. С. 138.

X–XIII стст[1]. На нашу думку, гэта мог быць двор Дзмітрыя Сямёнавіча Зубравіцкага, якім у першай палове XVI ст. валодалі Гаштольды, а ў трэцяй чвэрці XVI ст. — Рыгор Хадкевіч. У сваю чаргу, двор, якім ужо з канца XV ст. валодалі Хадкевічы, мог размяшчацца на месцы, дзе ў трэцяй чвэрці XVI ст. быў узведзены замак, або недзе побач з ім. Цалкам верагодна, што двор Хадкевічаў знаходзіўся на поўнач ад замка, а ў пачатку XVII ст. яго зямля была перададзена кляштару латэранскіх канонікаў, заснаванаму ў гэты час. Такая лакалізацыя гэтых двароў тлумачыцца шэрагам ускосных фактаў. Так, землі, якія належалі Хадкевічам, у канцы XVI ст. размяшчаліся на паўночны захад ад Быхава, а Дзмітрый Сямёнавіч Зубравіцкі, верагодна, валодаў часткай быхаўскай воласці на паўднёвы захад ад горада, паколькі ў гэтым баку знаходзіўся двор Добасна. Лагічным выглядае і наданне Рыгору Хадкевічу двара на поўдзень ад Быхава разам з Новым Быхавам і яго воласцю. У гэтым выпадку магнат мог аб’яднаць іх у адзін маёнтак. У сваю чаргу, верагодна, у 1560-я–1570-я гг. Янам Хадкевічам на месцы старога хадкевічаўскага двара ці побач з ім быў узведзены новы драўляна-земляны замак, на месцы якога пазней паўстала мураваная рэзідэнцыя. Тады ж была праведзена лакацыя — закладзены новы горад з вялікім рынкам у цэнтры і рэгулярнай сеткай вуліц. У сваю чаргу, далакацыйны горад першай паловы XVI ст. мог размяшчацца недзе паміж дварамі Хадкевічаў і Гаштольдаў і не мець рэгулярнай планіроўкі.

## Стварэнне рэзідэнцыі пры Яне Каралю Хадкевічу

Пасля смерці Яна Хадкевіча ў 1579 г. яго маёнткі пэўны час знаходзіліся ў сумесным валоданні сыноў — Аляксандра (1560–1626) і Яна Караля (1570(?)–1621)[2]. Вядома, што ў 1590 г., калі на Быхаў напалі нізавыя казакі, замак, які здолеў абараніцца, знаходзіўся ва ўласнасці братоў Хадкевічаў[3]. У 1592 г. у выніку канчатковага падзелу маёмасці паміж імі Быхаў адышоў Яну Каралю. Апошні ў 1601 г. здолеў праз замену з Шчасным Яраславам Галаўчынскім завалодаць той часткай Быхава, якая,

---

[1] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мінск, 1986. С. 130.

[2] Доўгі час лічылася, што Ян Караль нарадзіўся ў 1560 ці 1561 г., але, паводле апошніх даследаванняў польскіх гісторыкаў, гетман павінен быў нарадзіцца паміж 1570 і 1572 гг. (Жойдзь К. Захады Сапегаў па атрыманні ўладанняў Яна Караля Хадкевіча пасля яго смерці // ARCHE. 2016. № 3. С. 375).

[3] Наезд низовых казаков на город Быхов. 4.II.1590 // Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильня, 1867. Т. 1. С. 175–178.

верагодна, у свой час належала Рыгору Хадкевічу, і стаў адзінаасобным уласнікам горада[1].

У папярэдняй публікацыі намі была выказана думка, што Я. К. Хадкевіч па шэрагу прычын не мог ініцыяваць маштабнае будаўніцтва ў Быхаве. Па-першае, першапачаткова, будуючы сваю вайсковую кар'еру, ён быў вымушаны выдаткоўваць значныя сродкі на войска (у 1605 г. ён заняў пасаду вялікага літоўскага гетмана)[2]. Па-другое, у 1607–1620 гг. укладваў значныя рэсурсы ў будаўніцтва бастыённага замка ў Ляхавічах[3]. Аднак больш глыбокае вывучэнне крыніц паказала памылковасць гэтага меркавання.



*Мал. .. Ян Караль Хадкевіч. Партрэт першай чвэрці XVII ст.*

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 18. № 139. L. 4–4v, 6v–7; № 140. P. 8–9.

[2] Волкаў М. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 5. С. 21–22.

[3] Волкаў М. Будаўніцтва бастыённага замка Яна Караля Хадкевіча ў Ляхавічах // Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.) : зб. навук. пр. / пад рэд. А. М. Янушкевіча. Мінск, 2014. С. 343–356.

Як вынікае з карэспандэнцыі, будаўнічыя работы ў Быхаве Я. К. Хадкевіч пачаў паралельна з узвядзеннем Ляхавіцкага замка. Аб *«пачатку валоў»* у Быхаве згадваецца ў лісце мясцовага ўрадніка Міхайлоўскага да гетмана ад 18 чэрвеня 1611 г. У ім служэбнік запрашаў Я. К. Хадкевіча прыехаць асабіста і прасіў *«работу, дрэнная ці добрая, каб Ваша Міласць агледзеў, каб пазней не шкадаваць, лягчэй было б направіць пакуль не высока»*[1]. Размова ў дадзеным выпадку ішла, відавочна, пра пачатак насыпання земляных умацаванняў вакол горада. Прычым з ліста выразна бачна, што гетман, які меў вялікі вайсковы вопыт, асабіста кантраляваў будаўніцтва ўмацаванняў. У лісце, складзеным Я. К. Хадкевічам у 1616 г., ужо згадваецца пра «замак і вал», на якіх былі ўсталяваны гарматы[2]. З пазнейшых крыніц вядома, што бруствер наверсе валоў Быхава быў зроблены з драўляных зрубаў, якія былі напоўнены пяском, а наверсе закладзены каменнем. Іх вышыня на паўлокця перавышала рост чалавека[3].

Пра будаўнічыя работы на замку ў карэспандэнцыі Я. К. Хадкевіча не ўдалося знайсці ніводнай згадкі. Аднак калі зяць гетмана Ян Станіслаў Сапега (1589–1635) пасля спрэчак з іншымі прэтэндэнтамі за права валодання Быхавам змог узяць яго пад свой кантроль, магнат меў справу з няскончанай папярэднім уласнікам мураванай рэзідэнцыяй[4]. З гэтага вынікае, што будаўніцтва пачалося пры Я. К. Хадкевічу. Вядома, што ў 1614 г. з Цімкавіч у Быхаў былі высланы двое «стрыхарыкаў» для вырабу цэглы[5]. Магчыма, дадзены факт сведчыць аб нарыхтоўцы будаўнічых матэрыялаў для ўзвядзення мураванага палаца. Аднак на вядзенне буйнамаштабных будаўнічых работ і ў Ляхавічах, і ў Быхаве ў гетмана не хапала сродкаў. Большая частка рэсурсаў канцэнтравалася на Ляхавіцкім замку. Так, у 1618 і 1619 гг. Я. К. Хадкевіч загадаў прыбыткі з усіх сваіх маёнткаў, у тым ліку Быхава, накіроўваць на заканчэнне рэзідэнцыі ў Ляхавічах[6]. Таму

---

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 2823. P. 4. Міхайлоўскі да Я. К. Хадкевіча. Быхаў, 18.VI.1611.

[2] AGAD (Archiwum Główne Akt Dawnych). AR. Dz. XXIII. T. 28. Sygn. 4. S. 13–15.

[3] ЛННБУ ВР (Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника, відділ рукописів). Ф. 103. Оп. 1. Т. 5. Арк. 21. Е. Бака да Я. С. Сапегі. Іказнь, 21.II.1626.

[4] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 7–8. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 6.V.1624.

[5] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 757. P. 1. С. Здзітавецкі да Я. К. Хадкевіча. 26.III.1614.

[6] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 3238. S. 96. Я. К. Хадкевіч да К. Каменскага. Вязьма, 26.I.1618; S. 99–100. К. Каменскі да Я. К. Хадкевіча. Гарадзішча, 20.II.1618; S. 134. Я. К. Хадкевіч да К. Каменскага. Крэтынга, 14.VI.1619.

будаўніцтва быхаўскай рэзідэнцыі вялося вельмі марудна і ўрэшце не было завершана да смерці магната.

Узвядзенне мураванай рэзідэнцыі ў Быхаве, па ўсёй верагоднасці, пачалося на месцы старога драўляна-землянога замка, збудаванага ў трэцяй чвэрці XVI ст. Я. Хадкевічам. Рэшткі падобных правільных па форме драўляна-земляных замкаў гэтага магната захаваліся ў Шклове і Мышы. Таму новы замак, верагодна, пераняў планіроўку папярэдняга. У 1611 г. у адным з лістоў гетмана называецца сталовая ізба ў Быхаве[1]. Яна, відавочна, знаходзілася ў драўляным палацы на тэрыторыі замка. У 1617 г. згадваецца, што гетман меў тры кухні: у Ляхавічах, у Быхаве і ў вайсковым лагеры[2]. Такім чынам, нягледзячы на павольнае будаўніцтва мураванага палаца, Я. К. Хадкевіч актыўна карыстаўся сваёй быхаўскай рэзідэнцыяй. Аб гэтым сведчыць і запрашэнне гетманам у Быхаў латэранскіх канонікаў для заснавання кляштара. Чацвёра манахаў з Кракава прыбылі ў Быхаў вясной 1618 г. Ім быў перададзены дом памерлага быхаўскага ўрадніка, а для новага службніка было вырашана збудаваць новы[3].

Унікальным з'яўляецца той факт, што Я. К. Хадкевіч наважыўся на будаўніцтва адразу дзвюх вялікіх рэзідэнцый: у Ляхавічах і Быхаве. Верагодна, гэта тлумачыцца рознымі функцыямі і ролямі гэтых сядзіб. Магутны бастыённы замак у Ляхавічах уяўляў сабой рэзідэнцыю новага тыпу, якая, акрамя забеспячэння надзейнай абароны, з'яўлялася таксама новай формай рэпрэзентацыі палітычнага і сацыяльнага статусу яго ўласніка[4]. Выбар Ляхавіч для ўзвядзення сядзібы такога кшталту тлумачыцца блізкасцю паселішча да палітычных цэнтраў дзяржавы. У сваю чаргу, Быхаў знаходзіўся на ўсходняй мяжы дзяржавы і магчымасці яго выкарыстання для рэпрэзентацыі ў палітычнай дзейнасці былі абмежаваныя. Аднак гэтае паселішча было цэнтрам найбольшай зямельнай латыфундыі Я. К. Хадкевіча, а яго жыхары атрымлівалі значныя прыбыткі ад гандлю па Дняпры. Таму асноўныя намаганні былі скіраваны на ўзвядзенне абарончых умацаванняў вакол самога паселішча. Ператварэнне Быхава

---

[1] Я. К. Хадкевіч да С. Хадкевіч. Рыга, 24.II.1611 // Korrespondencye Jana Karola Chodkiewicza poprzedzone opisem rękopismów z archiwum radziwiłłowskiego, znajdujących się w Bibliotece Ordynacyi Krasińskich połączonej z Muzeum Konstantego Świdzińskiego / oprac. Wł. Chomętowski. Warszawa, 1875. S. 94.

[2] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 3238. S. 87–89. К. Каменскі. Ляхавічы, 28.XI.1617.

[3] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 3236. S. 483. К. Каменскі да Я. К. Хадкевіча. Быхаў, 15–20.II.1618; Rkps 3238. S. 106. К. Каменскі да Я. К. Хадкевіча. Гарадзішча, 3.IV.1618.

[4] Волкаў М. Абарончыя рэзідэнцыі як сімвал самарэпрэзентацыі магнатэрыі (на прыкладзе роду Радзівілаў). С. 70–71.

ў горад-фартэцыю давала магчымасць забяспечыць абарону мяшчанам, а разам з тым дэмаграфічны і эканамічны патэнцыял усёй латыфундыі. У сваю чаргу абарончы патэнцыял замка ў Быхаве пасля яго перабудовы Я. К. Хадкевічам і яго наступнікам Я. С. Сапегам знізіўся. Новазбудаваная мураваная рэзідэнцыя выконвала найперш рэпрэзентацыйныя і адміністрацыйныя функцыі.

Раптоўная смерць у 1613 г. Geraніма Хадкевіча (1597–1613), які быў адзіным сынам гетмана, паставіла апошняга перад праблемай вызначэння будучыні яго ўладання. У сувязі з адсутнасцю ў Я. К. Хадкевіча нашчадкаў мужчынскага полу маёнткі павінны былі праз яго адзіную дачку адысці ў валоданне іншых родаў. Але гетман вырашыў захаваць Быхаў у валоданні Хадкевічаў і па прыкладзе Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі заснаваць на ім ардынацыю, якая б заставалася непадзельнай і перадавалася толькі мужчынскім прадстаўнікам роду Хадкевічаў. У 1616 г. гетман склаў запіс, паводле якога Быхаў павінен быў адысці яго брату Аляксандру, а ў выпадку смерці апошняга — іншаму мужчынскаму прадстаўніку роду Хадкевічаў. У судовыя кнігі Аршанскага павета гэты запіс быў унесены ў пачатку 1619 г.[1]. Аднак для стварэння ардынацыі патрабавалася згода сойма, якой магнат не атрымаў. Таму яго зяць Я. С. Сапега змог абскардзіць гэты запіс і завалодаць Быхавам[2]. Імкненне Я. К. Хадкевіча да заснавання ардынацыі тлумачыць яго ўвагу да разбудовы рэзідэнцыі. Прыклады іншых магнатаў ВКЛ сведчаць аб тым, што гэтыя дзве з'явы былі цесна звязаныя паміж сабой і з'яўляліся важнымі элементамі стратэгіі па ўмацаванні пазіцый родаў у палітычным жыцці краіны на доўгую перспектыву. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка стварыў ардынацыю і разбудаваў сядзібу ў Нясвіжы, Крыштаф Радзівіл — у Біржах, Павел Сапега — у Гальшанах, Сымон Самуэль Сангушка — у Смалянах. Біржанскае княства, гальшанская і смалянская латыфундыі фармальна не сталі ардынацыямі, тым не менш іх уласнікі намагаліся стварыць на іх падставе непадзельныя зямельныя комплексы для нашчадкаў.

20 чэрвеня 1621 г., літаральна за некалькі месяцаў да смерці, Я. К. Хадкевіч склаў тэстамент, паводле якога запісаў сваёй маладой жонцы Ганне Алаізе з Астрожскіх (1600–1654) значную частку сваіх

---

[1] AGAD (Archiwum Główne Akt Dawnych). AR. Dz. XXIII. T. 28. Sygn. 4. S. 13–15.

[2] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 18. № 139. L. 9v, 18v–19; № 140. P. 12 ; Жойдзь К. Захады Сапегаў па атрыманні ўладанняў Яна Караля Хадкевіча пасля яго смерці. С. 389–391.

маёнткаў у ВКЛ, у тым ліку Быхаў[1]. З гэтага вынікае, што планы магната адносна быхаўскай латыфундыі ў апошнія гады яго жыцця не набылі пэўнай яснасці. Гэтым можа тлумачыцца як адсутнасць намаганняў з боку Я. К. Хадкевіча па зацвярджэнні быхаўскай ардынацыі на сойме Рэчы Паспалітай, так і незавершанасць будаўніцтва мясцовай рэзідэнцыі.

**Разбудова рэзідэнцыі пры Яне Станіславе Сапегу**

Пасля смерці Я. К. Хадкевіча некалькі гадоў працягваліся спрэчкі за яго спадчыну паміж жонкай Ганнай, братам Аляксандрам і зяцем Янам Станіславам Сапегам, жанатым з адзінай дачкой гетмана Ганнай. Урэшце большая частка маёмасці, у тым ліку дзве галоўныя рэзідэнцыі ў Ляхавічах і Быхаве, адышла зяцю. Кантроль над Быхавам Я. С. Сапега атрымаў не пазней за 1624 г. і ў далейшым прыклаў шмат намаганняў для яго разбудовы. У шматлікай карэспандэнцыі быхаўскіхураднікаў з магнатам, якая захавалася да нашага часу, можна знайсці многа звестак пра завяршэнне будаўніцтва палаца ў замку і пра ўзвядзенне гарадскіх умацаванняў.



*Мал. 2. Ян Станіслаў Сапега*

[1] Kempa T. "Przezacna matrona" Anna Alojza Chodkiewiczowa, córka Anny za Sztemberku Ostrogskiej, protektorka jezuitów // Острозька давніна : науковий збірник. Остріг, 2014. Вип. 3. S. 66–67.

Ужо ў студзені 1624 г. у Быхаў быў накіраваны ляхавіцкі цесля Юрка з мэтай нарыхтоўкі і сплаву лесу для будаўнічых работ. Быхаўскі ўраднік Адам Юдыцкі адзначаў, што знайсці іншага здольнага цеслю для работ у палацы ў гэтым краі цяжка, а ў выпадку неабходнасці трэба будзе наймаць у Вільні. Вясной для ўзгаднення да Я. С. Сапегі былі высланы формы аздаблення вокнаў і дзвярэй, зробленыя рэзчыкам Васілеўскім. Адначасова рабіліся захады па пошуках муляра для заканчэння сцен і вывядзення скляпенняў у палацы. А. Юдыцкі пісаў, што муроўку сцен мог скончыць і чаляднік, але для больш складаных работ трэба шукаць кваліфікаванага майстра[1].

Першапачаткова было вырашана звярнуцца да муляра Урбана з Вільні, які, як вынікае з лістоў, пачаў будаваць мураваны замак у Быхаве яшчэ пры Я. К. Хадкевічу. Супрацоўніцтва з Урбанам для ўраднікаў Я. С. Сапегі складвалася не найлепшым чынам, тым не менш ён працаваў у Быхаве да 1627 г. Вясной з пачаткам будаўнічага сезона за ім і яго памочнікамі ў Вільню пасылалі падводы, а таксама давалі задатак. У 1626 г. Урбану было выслана 100 злотых, у 1627 г. — 100 коп грошаў і 8 падвод, у 1628 г. — 300 злотых. У Быхаве майстра і яго чаляднікаў забяспечвалі харчаваннем. Увосень з заканчэннем будаўнічага сезона яны вярталіся дадому[2].

У 1625 г. з Вільні прыехалі двое муляроў, якія працавалі над завяршэннем муроў. Пасля гэтага цесля пачаў класці на сцены бэлькі і ўзводзіць дах. У 1626 г. Урбан прыехаў з некалькімі таварышамі. Па прыездзе ён атрымаў 150 злотых і яшчэ 100 злотых далі яго чэлядзі. Астатнія грошы мусілі быць выплачаны па завяршэнні работ. Аднак у вызначэнні абавязкаў муляра паўсталі праблемы. Урбан, якога А. Юдыцкі назваў «надзвычай дрэнным і ўпартым» (dziwnie zły i uparty), быў згодны ўзвесці скляпенні і коміны, але падвалы і шчыт на версе камяніцы без дадатковай дамовы рабіць адмаўляўся. Пры гэтым ураднік адзначыў, што кантракт Я. К. Хадкевіча з муляром не захаваўся. У 1626 г. будаўнічыя работы на замку дасягнулі значных маштабаў і паглыналі значныя сродкі, асноўная частка якіх ішла з прыбыткаў быхаўскага маёнтка. Шмат грошай пайшло на жалеза, якое выкарыстоўвалася для ўмацавання муроў, акавання бэлек

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 542. P. 5. А. Быхавец да Я. С. Сапегі. Цімкавічы, I.1624; № 1837. P. 14–15. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 8.I.1624; P. 7–8.

[2] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 24–25. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 26.IV.1627; № 4912. P. 35. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 8.IX.1628; Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника відділ рукописів. Ф. 103. Оп. 1. Т. 5. Арк. 127–129. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 29.III.1626; Арк. 193–197. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 13.V. 1626.

і крокваў, а таксама на латныя і гонтавыя цвікі. Прычым мясцовае жалеза не задавальняла майстроў па якасці і даводзілася закупаць прывазное, кошт на якое быў высокі. Грошы і прадукты харчавання ішлі на шматлікіх рамеснікаў — муляроў, цесляў, сталяроў і кавалёў. Што цікава, рамы для вокнаў быхаўскага палаца меркавалася вырабіць у Ляхавічах, куды сталярам былі высланы абмеры. Відаць, пасля ўзвядзення ляхавіцкай рэзідэнцыі там меліся кваліфікаваныя спецыялісты, якіх імкнуліся выкарыстоўваць пры будаўніцтве замка ў Быхаве. Па словах А. Юдыцкага, у 1627 г. выдаткі на будаўніцтва значна ўзраслі, што было звязана з пачаткам работ унутры палаца. Да згаданых вышэй рамеснікаў дадаліся таксама слесар, шкляр і пячур[1].

Дзякуючы лістам Максіміліяна Хацімоўскага, прысланага ў Быхаў у якасці рэвізора, шмат вядома пра будаўнічыя работы ў 1628 г. Пасля смерці А. Юдыцкага ў тым жа годзе ён асабіста адказваў за ўзвядзенне мураванай рэзідэнцыі. У сакавіку 1628 г. у Вільню былі высланы падводы па Урбана, а тым часам на замку ўжо працавалі цеслі, сталяры і шкляры. Ізноў выявіліся праблемы з будаўнічымі матэрыяламі: не хапала жалеза, шкла і свінцу. Завозіць іх даводзілася з Караляўца. Нягледзячы на высланы задатак, муляр так і не з'явіўся ў Быхаве і не скончыў работы паводле дамовы, на што з абурэннем наракаў М. Хацімоўскі. Урэшце летам ураднік пачаў шукаць новага майстра для заканчэння палаца. Прычым М. Хацімоўскі не спадзяваўся, што ў гэтым годзе атрымаецца пакласці хаця б адну цагліну ў замку. Аднак яму пашанцавала, і ў канцы лета ў Быхаве з'явіўся муляр-немец, які перад гэтым 10 гадоў працаваў на будаўніцтве замка Сымона Самуэля Сангушкі ў Смалянах[2]. Пэўны час майстар згубіў на набор чэлядзі, але ў пачатку верасня змог приступіць да працы. М. Хацімоўскаму было вядома, што Быхаў неўзабаве збіраецца наведаць гаспадар, аднак ураднік не быў упэўнены, што палац паспеюць дарабіць да яго прыезду. Тым не менш работы ішлі хутка, і ўжо ў кастрычніку М. Хацімоўскі пісаў, што магнат зможа спыніцца ў самім палацы. Да канца 1628 г. былі скончаны прыгожа аздоблены ганак перад палацам, сталовая ізба,

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 12. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 31.V.1625; P. 13. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, [1625]; P. 24–25; P. 27–29. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 22.III.1627; P. 35–36. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 26.IX.1627; № 4912. P. 35; Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника відділ рукописів. Ф. 103. Оп. 1. Т. 5. Арк. 127–129; Арк. 193–197.

[2] Дадзеная згадка, між іншым, дазваляе вызначыць час узвядзення Смалянскага замка — 1617–1626 гг.

2 пакоі, 2 сяней, капліца, якая знаходзілася ў вежы, прыбудаванай з усходняга боку да палаца. Будаўніцтва самой вежы таксама было завершана: у верасні на ёй быў усталяваны абабіты белай бляхай купал з залацістым крыжам наверсе. Усе згаданыя пакоі прызначаліся для размяшчэння гаспадара. У іх былі зроблены печы, коміны, падлогі, вокны і дзверы. Апошнія атрымалі каштоўныя замкі, якія вырабляў спецыяльна наняты і прывезены ў Быхаў майстар. Акрамя пакояў для гаспадара, былі таксама скончаны два жылыя памяшканні для слуг на першым паверсе. Усяго за год на розныя патрэбы ў Быхаве, і найперш на будаўніцтва замка, М. Хацімоўскім было выдаткавана 6800 злотых[1].




*Мал. 3. Казімір Леў Сапега. Гравюра 1644 г.*

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 40–41. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 28.VIII.1628; № 4912. P. 35; P. 37–38. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 11.X.1628; P. 39–40. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 15.XII.1628.

Скончыць работы ў палацы планавалася ў 1629 г. Як пісаў М. Хацімоўскі, важным было, каб сам Я. С. Сапега прыехаў, агледзеў зробленае і выказаў сваё меркаванне па завяршэнні будаўніцтва[1]. На жаль, аб далейшых работах у Быхаве ў нас няма дакладнай інфармацыі. Пасля заканчэння палаца, верагодна, былі ўзведзены яшчэ некаторыя будынкі на тэрыторыі замка. У прыватнасці, вядома, што будаўнічыя работы ў рэзідэнцыі ішлі ў 1630 г.[2]. З рэестра выдаткаў Я. С. Сапегі за 1632 г. вядома, што пры яго двары меўся надворны архітэктар, які мог кіраваць будаўніцтвам у Быхаўскім замку[3]. У самім жа Быхаве жылі і працавалі на замак рамеснікі розных спецыяльнасцей. Пра іх вядома з пазнейшых наданняў Казіміра Льва Сапегі (1609–1656), які з'яўляўся малодшым братам Яна Станіслава і атрымаў Быхаў пасля яго смерці ў 1635 г. У гэтых дакументах згадваюцца зэгармайстар Валенты і яго наступнік Ян Куркевіч. Апошні называецца касцёльным зэгармайстрам, што сведчыць аб наяўнасці гадзінніка на вежы ці званіцы касцёла. Але ці меўся ў азначаны час гадзіннік у самім замку, невядома. Пры Я. С. Сапегу ў Быхаве ўтрымліваўся замкавы каваль Грышка Харкевіч. Акрамя таго, у 1637 г. К. Л. Сапега наняў слесара Яна Кухляровіча, які сярод іншага мусіў вырабляць «замкі, завесы і скоблі ў Быхаўскім замку»[4].

Адначасова з завяршэннем мураванай рэзідэнцыі ў Быхаве пры Я. С. Сапегу актывізаваліся работы на абарончых умацаваннях горада. Узвядзенне валоў вялося ўжо ў 1625 г. Прычым у некаторых месцах іх сыпалі «з фундаменту». Гэта можа сведчыць аб пэўнай змене абрысу абарончых умацаванняў. У тым жа годзе згадваецца вялікі кавальер — адзін з ужо існуючых элементаў абарончых умацаванняў горада[5]. Вясной 1627 г. А. Юдыцкі ў лісце да Я. С. Сапегі абяцаў паслаць з Быхава ў Іказнь валмайстра. Верагодна, у Быхаве быў не адзін спецыяліст па насыпанні валоў, бо з пазнейшых крыніц вынікае, што работы на гарадскіх умацаваннях не спыняліся. У 1628 г. на насыпанні валоў былі задзейнічаны і

---

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 41–42. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 4.I.1629; P. 47–48v. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 3.II.1629.

[2] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 4969. P. 14–15. Г. Цехановіч да Я. С. Сапегі. Быхаў, 16.VI.1630.

[3] VUB RS (Vilniaus universiteto biblioteka Rankraščių skyrius). F. 4. № 34104. Скарбавыя кнігі Я. С. Сапегі.

[4] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 1653. Копіі розных актаў, якія тычацца адміністрацыі маёнткаў, К. Л. Сапегі. 1635–1648. S. 80–83 ; LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 17. № 108. Зборнік скаргаў быхаўскіх падданых да К. Л. Сапегі. S. 13.

[5] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 13.

мяшчане, і сяляне з воласці, «як і перад тым», хаця работы ішлі цяжка з-за шматлікіх дажджоў. Пра насыпанне валоў у Быхаве ў 1629–1630 гг. у сваіх лістах да Я. С. Сапегі згадваў Г. Цехановіч[1].

Па ўсёй верагоднасці, пры Я. С. Сапегу абарончыя ўмацаванні былі рэфармаваны паводле правілаў старагаландскай фартыфікацыйнай сістэмы і набылі той выгляд, які бачны на панараме горада другой паловы XVII ст. і планах XVIII–XIX стст. Распаўсюджванне старагаландскай фартыфікацыі ў ВКЛ пачалося ў 1620-я гг., а важным стымулам для гэтага стала вайна Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600–1629 гг.[2]. Я. С. Сапега прымаў актыўны ўдзел у згаданай вайне і добра ведаў практыку абарончага будаўніцтва шведаў, якія шырока выкарыстоўвалі дасягненні галандцаў у фартыфікацыйным майстэрстве, таму асабістая ініцыятыва магната ў мадэрнізацыі абарончых умацаванняў Быхава вельмі верагодная. Як можна меркаваць па планах канца XVIII — пачатку XIX ст., у сувязі з мадэрнізацыяй фартэцый была часткова зменена і вулічная сетка горада. Логіка будаўніцтва фартыфікацый абумовіла неабходнасць размяшчэння дзвюх брам горада — Магілёўскай і Навабыхаўскай — з боку ад галоўных вуліц. Таму да новазбудаваных брам былі пракладзены дадатковыя вуліцы.

### Людвісарская справа і забеспячэнне артылерыяй

Пры Я. К. Хадкевічу і Я. С. Сапегу ў Быхаве працаваў людвісар, які адліваў гарматы і званы для мясцовага арсенала і Ляхавіч. Гэта мела істотнае значэнне для забеспячэння зброяй Быхаўскай і Ляхавіцкай фартэцый. Размяшчэнне людвісарні ў Быхаве, на нашу думку, тлумачылася значнымі памерамі і рэсурсамі быхаўскай латыфундыі, што дазваляла забяспечыць дзейнасць людвісарні. Вядома, што ў студзені–лютым 1618 г. у Ляхавічы былі высланы тры новаадлітыя гарматы[3]. У 1629 г. таксама «зімовай дарогай» для ляхавіцкай царквы быў высланы звон, адліты з бронзы, закупленай для вырабу гармат[4]. У лютым 1630 г.

---

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 24–25; № 4912. P. 35. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 8.IX.1928; № 4969. P. 26. Г. Цехановіч да Я. С. Сапегі. Смаленск, 28.V.1629; P. 14–15.

[2] Dybaś B. Znaczenie wojen polsko-szwedzkich dla rozwoju fortyfikacji stałych w Rzeczypospolitej w XVII wieku (na przykładzie wielkich miast Prus Królewskich) // Z dziejów stosunków Rzeczypospolitej Obojga Narodów ze Szwecją w XVII wieku. 2007. S. 201–214.

[3] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 3236. S. 475–478. Я. К. Хадкевіч да К. Каменскага. Вязьма, 25.I.1618; S. 483–486. К. Каменскі да Я. К. Хадкевіча. Гарадзішча, 20.II.1618; S. 495–496. Я. К. Хадкевіч да К. Каменскага. Вязьма, 25.II.1618.

[4] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 4912. P. 41–42. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 4.I.1629; P. 43. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 10.I.1629. З апошняга ліста вядомая вага звона: 6 пудоў і 2 бязмены быхаўскай вагі (1 пуд складаў 48 фунтаў).

у Ляхавічы планавалі адправіць чатыры малыя гарматы, аднак з-за дрэннай дарогі адпраўка адкладвалася[1].

Вясной 1625 г. у выніку значнага пад'ёму вады ў рацэ быхаўскую людвісарню затапіла, а печ у ёй была пашкоджана. У сувязі з гэтым згадвалася, што майстэрня знаходзілася каля вялікага кавальера, г. зн. на ўскрайку горада каля ўмацаванняў[2]. З лістоў служэбнікаў Я. С. Сапегі вядома, што ў 1627–1628 гг. у Быхаве працаваў людвісар Крыштаф. Вясной 1627 г., даведаўшыся аб пагаршэнні здароўя свайго бацькі, які працаваў у каралеўскай людвісарні ў Вільні, Крыштаф паехаў у сталіцу ВКЛ. А. Юдыцкі ў лісце да Я. С. Сапегі характарызаваў Крыштафа як добрага майстра, які быў «вядомы на ўсёй Русі», і з жалем пісаў, што людвісар не меў жадання заставацца ў Быхаве і хацеў заняць месца бацькі ў Вільні. Пры гэтым у Быхаве заставалася яго жонка, за якой ён мусіў вярнуцца. Апошняе сведчыць аб тым, што майстар пражываў тут стала. У канцы 1627 г. М. Хацімоўскі, каб затрымаць людвісара ў Быхаве, надаў яму і яго дзецям у пажыццёвае валоданне тры валокі ў сяле Глухі і засценак у тры валокі. Жаданне пакінуць Быхаў у Крыштафа ўзрасло ў 1628 г., пасля атрымання каралеўскага прывілея на працу ў віленскай людвісарні. Аднак у час знаходжання ў Вільні людвісар забіў чалавека і, хаця быў вызвалены ад пакарання смерцю, вырашыў застацца ў Быхаве. Неўзабаве ён атрымаў заданне вырабіць некалькі малых гармат, памеры якіх павінен быў вызначыць Я. С. Сапега[3]. Прыклад людвісара Крыштафа вельмі яскрава паказвае, што ўтрымаць добрага рамесніка ў Быхаве, які знаходзіўся на ўсходняй мяжы ВКЛ, было няпростай справай.

Пры Я. К. Хадкевічу Быхаў быў забяспечаны артылерыяй, аб чым сведчыць запіс у тэстаменце гетмана 1621 г., а таксама спрэчкі паміж спадчыннікамі ў першыя гады пасля яго смерці[4]. Зрэшты, забеспячэнне Быхава гарматамі было адной з галоўных задач людвісарні, заснаванай магнатам. Папаўненне арсенала фартэцыі працягнулася пры Сапегах. Вядома, што ў 1655 г. у Быхаве мелася 30 гармат[5]. Наколькі паўплывала на склад быхаўскага артылерыйскага парка вайна 1654–1667 гг., у час якой

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 4969. P. 66. Г. Цехановіч да Я. С. Сапегі. Быхаў, 17.II.1630.

[2] Там жа. № 1837. P. 13.

[3] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 19–20. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 11.V.1627; P. 35–36; P. 40–41; № 4912. P. 29–30. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. 15.XII.1627.

[4] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 18. № 139. L. 10v, 13v.

[5] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Санкт-Петербург, 1889. С. 715–716.

фартэцыя перажыла шэраг аблог і разбурэнняў, сказаць цяжка. Паводле апісанняў быхаўскай артылерыі 1692 і 1707 гг., арсенал фартэцыі на той час складаўся з 34–35 гармат, гербы і надпісы на якіх даюць магчымасць ахарактарызаваць намаганні ўласнікаў па забеспячэнні Быхава ўзбраеннем. У прыватнасці, у названых апісаннях згадваюцца дзве гарматы Жыгімонта II Аўгуста, адна Гераніма Хадкевіча, адна шведская і адна інфлянцкая. Усе яны трапілі ў Быхаў, верагодна, пры Я. К. Хадкевічу. Прычым дзве апошнія маглі быць трафеямі, захопленымі гетманам у час вайны са Швецыяй у Інфлянтах. Пры Сапегах быхаўскі арсенал мог папоўніцца дзвюма гарматамі, вырабленымі пры Уладзіславе IV, а таксама дзвюма гарматамі з гербамі К. Л. Сапегі[1].

Аб практыцы забеспячэння быхаўскага арсенала порахам сведчыць наступны факт. У 1637 г. К. Л. Сапега пацвердзіў прывілей быхаўскім мяшчанам і пушкарам Гапею і Сахону Жываткевічам на трыманне трох валок, за што ім трэба было вырабляць порах. Быхаўскі староста мусіў даваць ім неабходныя матэрыялы і работнікаў у дапамогу. Адносна вырабу пораху пушкары павінны былі кансультавацца з цэйгвартам. Салетра і сера выдаваліся пушкарам з замка, а вугаль ім неабходна было вырабляць самім[2]. У 1627 г. А. Юдыцкі паведамляў, што ў Быхаве салетра дарагая, а бліжэйшымі месцамі, дзе яна магла каштаваць танней, былі Кіеў і Магілёў. Аднак у Кіеве на той час яе дастаць было нельга, а ў Магілёве кошт на салетру быў усё ж высокі. У такіх умовах больш выгадна стала набываць салетру ў Вільні[3].

### Гарнізон

На падставе згадак у лістах служэбнікаў Я. С. Сапегі можна ўявіць, як выглядаў гарнізон, ці замкавая пяхота, Быхава ў 1624–1633 гг. На чале гарнізона стаяў капітан або паручнік. Арсеналам апекаваўся цэйгварт. У 1637 г. цэйгвартам служыў нейкі Крыштаф[4]. На пачатку 1624 г., калі Быхаў перайшоў пад кантроль Я. С. Сапегі, у складзе замкавай пяхоты налічвалася 20 чалавек. У 1625 г. А. Юдыцкі пісаў, што колькасць жаўнераў неабходна павялічыць да 60. Аснову залогі складалі выбранцы, ці сяляне, якія за выкананне вайсковай службы былі вызвалены ад падаткаў са сваіх зямельных надзелаў. Аднак у рэгіёне, дзе былі моцныя праказацкія настроі, даверу да прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва было

---

[1] Савіцкі М. Артылерыя, замак і цэйхгаўз у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 г. // Гістарычны альманах. 2009. Т. 15. С. 45–74.

[2] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 1653. S. 78.

[3] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 19–20; P. 24–25.

[4] BCz (Biblioteka Czartoryskich).Rkps 1653. S. 78.

мала. У такіх умовах частку гарнізона было вырашана фарміраваць з наёмных жаўнераў. Гэта, з аднаго боку, гарантавала большую вернасць гарнізона ўласніку горада, а з іншага — павышала яго баяздольнасць. Магчымасці наняць жаўнераў на месцы не было, таму прапаноўвалася шукаць наймітаў «у Літве»[1]. Вясной 1625 г. у Быхаве было 10 служылых жаўнераў. Праз два гады, вясной 1627 г., Я. С. Сапега загадаў павялічыць замкавую пяхоту да 30–40 чалавек. Неўзабаве 30 пахолкаў (10 служылых жаўнераў і 20 выбранцаў) былі высланы ў Іказнь. Да восені 1628 г. памер быхаўскага гарнізона быў павялічаны да 60 чалавек. На пачатку наступнага года 50 пахолкаў (10 служылых жаўнераў і 40 выбранцаў) былі адасланыя да Я. С. Сапегі. Астатнія засталіся ў Быхаве «для пільнавання брам». Адсылка значнай часткі замкавай пяхоты з Быхава тлумачылася неабходнасцю абароны іншых маёнткаў, як у выпадку з Іказню, або неабходнасцю суправаджэння ўласніка на важных мерапрыемствах. Так, восенню 1632 г. на элекцыйны сойм у Варшаву магната суправаджалі 177 чалавек пяхоты: 48 жаўнераў (6 дзясятнікаў, 42 пахолкі) на чале з паручнікам з Быхава, 58 — з Іказні, 21 — з Блудзені. Пасля завяршэння сойму жаўнеры дайшлі з Я. С. Сапегам да Слоніма, а адтуль былі адпраўлены ў Быхаў, Іказнь і Блудзень. Пры гаспадару засталіся толькі 47 пахолкаў[2].

Памеры гарнізонаў у рэзідэнцыях Я. С. Сапегі шмат у чым залежалі ад патэнцыялу зямельных латыфундый. Як бачна з прыведзеных вышэй звестак, самыя вялікія залогі меліся ў Быхаве і Іказні, якія з’яўляліся цэнтрамі найбольшых зямельных комплексаў Я. С. Сапегі. Крыху меншым быў гарнізон Ляхавіцкага замка, у які ў 1626 г. планавалася набраць 40 выбранцаў[3]. Паводле тэстаменту К. Л. Сапегі 1656 г., толькі ў трох гэтых яго рэзідэнцыях меліся значныя запасы ўзбраення[4]. Такім чынам, у першай палове — сярэдзіне XVII ст. сярод сапегаўскіх рэзідэнцый толькі Быхаў, Іказнь і Ляхавічы ўяўлялі сабой значныя абарончыя аб’екты. На падставе колькаснага складу замкавай пяхоты можна параўнаць фартэцыі Сапегаў з радзівілаўскімі, што дапаможа ацаніць іх абарончы патэнцыял у азначаны

[1] Літвой у вузкім сэнсе ў азначаны перыяд называлі ўсходнюю частку сучаснай Літвы і заходнюю частку Беларусі.

[2] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 5–6. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 4.I.1624; P. 7–8; P. 9–10. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. 22.IV.1625; P. 11. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 30.V.1625; P. 14–15; P. 19–20; P. 22–23; P. 24–25; P. 27–29. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 22.III.1627; № 4912. P. 37–38; P. 41–42 ; VUB RS (Vilniaus universiteto biblioteka Rankraščių skyrius). F. 4. № 34104.

[3] ЛННБУ ВР (Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника, відділ рукописів). Ф. 103. Оп. 1. Т. 4. № 144. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. 11.II.1626.

[4] VUB RS (Vilniaus universiteto biblioteka Rankraščių skyrius). F. 4. № 13341. Тэстамент К. Л. Сапегі. 6.II.1656. P. 10.

перыяд. Так, для абароны Мірскага замка прыцягвалася каля 30 выбранцаў, Біржанскага замка — 80, Слуцка — 100[1]. Апошні знаходзіўся ў цэнтры найбольшай прыватнай зямельнай латыфундыі на тэрыторыі ВКЛ, што дазваляла сканцэнтраваць значныя рэсурсы на забеспячэнне яго абароны.

Вялікім клопатам для быхаўскіх ураднікаў было забеспячэнне замкавай пяхоты вопраткай і ўзбраеннем. Сукно на адзенне жаўнеры павінны былі атрымліваць кожны год. У 1624 г. А. Юдыцкі прапаноўваў набыць яго ў Вільні, дзе было танней, чым у блізкім Магілёве. У 1625 г. служэбнік меркаваў купіць для жаўнераў чорнае мараўскае сукно. Вясной 1626 г. пяхота была апранута ў новае, аднак вопратка хутка зношвалася. І ўжо праз год, вясной 1627 г., пахолкі мелі абшарпаны выгляд і наракалі на А. Юдыцкага, што той не забяспечыў іх матэрыялам для пашыву адзення. Служэбнік меркаваў паслаць за сукном у Вільню або ў Каралявец, на што Я. С. Сапега адпісаў, што сам забяспечыць жаўнераў вопраткай. У канцы 1628 г. А. Юдыцкі паведамляў, што ў Вільні сукно дарагое, і чакаў пастаўкі з Яраслава. Акрамя адзення, жаўнеры забяспечваліся зброяй — мушкетамі, шаблямі і сякеркамі. Падчас выправы ім выдавалася па фунце пораху, паўтара фунта свінцу, служылыя жаўнеры атрымлівалі месячны заробак, а выбранцы — па 3 злотыя ці 3 злотыя 15 грошаў. У студзені 1629 г., калі быхаўская пяхота была накіравана да Я. С. Сапегі, ёй быў дадзены таксама барабан, але пахолкі пайшлі без харугвы, якая была ў дрэнным стане. Новую харугву яны мусілі атрымаць у Ляхавічах. Вядома, што ў Быхаве працаваў слесар, які вырабляў гроты, ці наканечнікі для коп'яў. У далейшым яны высылаліся ў іншыя сапегаўскія рэзідэнцыі. Так, вясной 1627 г. у быхаўскага слесара мелася 100 гатовых наканечнікаў, а А. Юдыцкі загадаў зрабіць 150 дрэўкаў і 50 коп'яў, частка з якіх была неўзабаве выслана ў Іказнь[2].

### Перадумовы і прычыны росквіту Быхава

У першай палове XVII ст. Быхаў дасягнуў значнага росквіту. Найбольш выразным сведчаннем гэтага з'яўляецца панарама Л. Куўро другой

---

[1] НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10729. Скарбавая кніга Я. Радзівіла. 1618–1620. Арк. 10 адв.; AGAD. AR. Dz. VII. Nr. 641. S. 1–2. Інвентар слуцкага арсенала. 1620 ; AGAD (Archiwum Główne Akt Dawnych). AR. Dz. VII. Nr. 675. S. 1–7. Спіс жаўнераў Нясвіжскага замка. X.1656 ; Wisner H. Wojsko litewskie I poł XVII wieku. Cz. 1. // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. 1973. T. 19. S. 119.

[2] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 7–8; P. 11; P. 19–20; P. 22–23; P. 24–25; P. 27–29; № 4912. P. 35; P. 37–38; P. 41–42 ; ЛННБУ ВР (Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника, відділ рукописів). Ф. 103. Оп. 1. Т. 5. Арк. 127–129; Арк. 193–197.

паловы XVII ст. На ёй бачны горад, абкружаны магутным земляным валам, у якім меліся тры мураваныя брамы — Навабыхаўская, Магілёўская і Дняпроўская. Галоўнай архітэктурнай дамінантай Быхава быў велічны мураваны замак. Сярод шчыльнай гарадской забудовы ўзвышаліся праваслаўная і ўніяцкая цэрквы, каталіцкі касцёл, кляштар латэранскіх канонікаў і яўрэйская сінагога [1]. Відавочна, галоўнай прычынай росквіту Быхава стала мэтанакіраваная дзейнасць яго ўласнікаў, найперш Яна Караля Хадкевіча і Яна Станіслава Сапегі. Разбудова рэзідэнцыі і ператварэнне горада ў магутную фартэцыю адпавядала іх інтарэсам і спрыяла развіццю быхаўскай латыфундыі. Але перадумовы і прычыны, якія падштурхнулі Хадкевічаў і Сапегаў сканцэнтраваць свае намаганні на развіцці Быхава, варта разгледзець больш падрабязна.

Стварэнне вялікіх зямельных латыфундый магнатамі стала з XVI ст. адной з найбольш эфектыўных стратэгій для ўмацавання пазіцый сваіх родаў у доўгатэрміновай перспектыве. Магчымасці для атрымання ці набыцця зямель у межах гістарычнай Літвы, ці ядра дзяржавы, былі абмежаваныя, таму абсалютная большасць такіх латыфундый былі створаны на землях далучаных да ВКЛ старажытнарускіх княстваў, якія маглі цалкам ці па частках перадавацца ва ўласнасць набліжаным да манарха прадстаўнікам знаці. Так сталася і з быхаўскай воласцю, якая ўжо XV ст. была падзелена на часткі і знаходзілася ў прыватным карыстанні. У сярэдзіне XVI ст. браты Геранім і Рыгор Хадкевічы здолелі сабраць у сваіх руках усе гэтыя часткі і ўтварыць вялікую латыфундыю. У гэты час былі зроблены значныя захады для развіцця Быхава: закладзены новы горад і ўзведзены абарончы замак. Аднак пасля смерці Рыгора Хадкевіча і яго бяздзетных сыноў іх уладанні, у тым ліку значная частка быхаўскай латыфундыі, перайшлі ва ўласнасць іншых родаў.

У пачатку XVII ст. Ян Караль Хадкевіч здолеў сканцэнтраваць у сваіх руках увесь Быхаў і значную частку зямель вакол яго, што стварыла перадумовы для далейшага развіцця маёнтка. Напрыканцы свайго жыцця гетман атрымліваў 40–41 тыс. злотых прыбытку з усіх сваіх

[1] Волкаў М. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 5. С. 16–24. Шчыра дзякуем А. Ярашу, які знайшоў адзін з іканаграфічных узораў, на які арыентаваўся Л. Кууро пры выкананні панарамы Быхава. Ім стаў малюнак Кальварыі Мікалая Зебжыдоўскага 1600 г., з якога была скапіравана група асоб, выяўленая ў левым ніжнім вуглу быхаўскага малюнка. Факт капіравання даволі простых сюжэтаў пацвярджае нашае меркаванне аб нізкім узроўні мастацкай тэхнікі выканання панарамы, аўтар якой быў, найверагодней, вайскоўцам.

маёнткаў, з іх 12 тыс. ішлі з Быхава[1]. Для параўнання: агульны прыбытак канцлера ВКЛ Льва Сапегі з уласных маёнткаў і дзяржаўных стараstваў у 1605 г. павінен быў скласці 40 175 злотых. Пры гэтым найбольш значным маёнткам магната была Іказнь, прыбытак з якой складаў 5 тыс. злотых. Столькі ж прыносіла Магілёўскае староства, адно з самых вялікіх у ВКЛ[2]. Гэтае параўнанне пацвярджае значнасць быхаўскай латыфундыі Я. К. Хадкевіча ў першай палове XVII ст. Таксама становіцца зразумелым жаданне магната закласці ардынацыю менавіта ў Быхаве.

У далейшым Сапегі яшчэ больш узбуйнілі быхаўскую латыфундыю. Так, паводле плана Быхаўскага графства 1826 г., на той час да яго належаў 1 горад (Стары Быхаў), 6 мястэчак (Баркалабаў, Буйнічы, Дашкаўка, Гайшын, Новы Быхаў, Чэгрынка) і 31 фальварак. Паводле перапісу 1816 г., насельніцтва маёнтка складала 12 611 рэвізскіх душ мужчынскага полу, а з улікам жанчын — каля 25 тыс. чалавек[3]. Значная частка гэтых зямель (маёнткі Баркалабаў, Буйнічы, Дашкаўка і Новы Быхаў) трапіла ў валоданне Сапегаў у другой палове XVII ст. У 1690 г. колькасць дымоў іх складала: Стары Быхаў — 1417, Новы Быхаў — 412, Баркалабаў, Дашкаўка і Буйнічы — каля 590 (разам больш за 2,4 тыс.)[4]. Такім чынам, насельніцтва старабыхаўскага маёнтка, які, па ўсёй верагоднасці, быў сфарміраваны намаганнямі Я. К. Хадкевіча, напрыканцы XVII ст. павінна было складаць каля 10,6 тыс. чалавек. Усяго ва ўсіх гэтых маёнтках налічвалася больш за 18 тыс. жыхароў[5].

У канцы XVII ст. быхаўскі маёнтак не быў самым вялікім зямельным комплексам Сапегаў. Так, у 1690 г. у Чарэі з Мялешкавічамі, Бабром налічвалася 5,4 тыс. дымоў, у Іказні, Друі і Асвеі, якія складалі адзін вялікі зямельны комплекс, — 3 762 дымоў, у Горах — 2 603, у Дуброўне —

---

[1] ЛННБУ ВР (Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника, відділ рукописів). Ф. 103. Оп. 1. Т. 2. № 92. Л. Сапега да Я. С. Сапегі. 15.I.1622 ; Archiwum Narodowe w Krakowie. Archiwum Młynowskie Chodkiewiczów. № 973.

[2] ЛННБУ ВР (Львівська національна наукова бібліотека України ім. В. Стефаника, відділ рукописів). Ф. 103. Оп. 1. Т. 1. № 32. Я. Прашыцкі да Л. Сапегі. 23.VII.1604.

[3] VUB RS (Vilniaus universiteto biblioteka Rankraščių skyrius). F. 23. № 102. План Быхаўскага графства. 29.V.1626.

[4] Віцько Д. В. Міжусобная барацьба магнацкіх і сярэднешляхецкіх груповак у Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XVII – пачатку XVIII ст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2007. С. 23–25, 137–139. Па Баркалабаве, Дашкаўцы і Буйнічах вядома намінальная колькасць дымоў — 250. Паводле падлікаў Д. В. Віцько, Сапегі заніжалі колькасць сваіх падданых у сярэднім у 2,356 разоў, што дазваляе вызначыць рэальную колькасць дымоў у гэтым маёнтку.

[5] Паводле падлікаў Ю. Можы, у другой палове XVII ст. на дым прыпадала 7,5 чалавекі. Morzy J. Kryzys demograficzny na Litwie i Bialorusi: w II polowie XVII wieku. Poznań, 1965. S. 130.

2 503, у Шкудах — 1 693, у Ружанах з Дзітвай — 1 387[1]. Але ў першай палове XVII ст. сітуацыя выглядала інакш: для Я. Х. Хадкевіча і яго зяця Я. С. Сапегі быхаўская латыфундыя з’яўлялася найважнейшай часткай іх зямельнай уласнасці, таму яны ўкладвалі значныя сродкі ў развіццё Быхава. Менавіта тады былі ўзведзены шыкоўная мураваная рэзідэнцыя і магутныя фартыфікацыі вакол горада. Аб значнасці заслуг Я. Х. Хадкевіча і Я. С. Сапегі для развіцця Быхава можа сведчыць і наступнае параўнанне. Найбольшым прыватнаўласніцкім зямельным комплексам у ВКЛ было Слуцкае княства, у якім у 1690 г. намінальна налічвалася 7 205 дымоў[2]. Гэта значыць, яно ў некалькі разоў пераўзыходзіла па сваім эканамічным патэнцыяле быхаўскую латыфундыю. Тым не менш у Слуцку так і не была ўзведзена мураваная рэзідэнцыя, а гарадскія абарончыя ўмацаванні Быхава не саступалі слуцкім.

Асноўнай крыніцай прыбыткаў з быхаўскага графства быў чынш, ці грашовыя выплаты яго жыхароў на карысць уласнікаў. Разам з тым магнаты імкнуліся павысіць прыбытковасць латыфундыі шляхам эксплуатацыі лясных рэсурсаў і продажу дзякла, ці прадуктаў, што ў якасці падаткаў здавала насельніцтва. Так, у 1618 г. службоўцы Я. К. Хадкевіча сплавілі ў Каралявец 8 віцін са 105 лаштамі попелу і 1100 бочкамі жыта[3]. А ў 1624 г. Я. С. Сапега, які толькі атрымаў кантроль над Быхавам, загадаў выправіць з маёнтка ажно 1000 падвод з рознага кшталту таварамі. Праўда, Ян Лазоўскі — службовец, што атрымаў гэтае даручэнне, — не змог сабраць такую колькасць падвод з-за адсутнасці грошай. Тым не менш у пачатку студзеня, як толькі рэкі пачаў скоўваць лёд, ён выправіў тавары з Быхава[4]. У 1627 г. М. Хацімоўскі згадваў аб неабходнасці вырабу струг. Гэты факт сведчыць аб тым, што адміністрацыя графства вяла гандаль па Дняпры[5].

Вясной 1627 г. Я. С. Сапега вырашыў здаць Быхаўскае графства ў арэнду з мэтай атрымання наяўных грошай. У верасні таго ж года вяліся перамовы з віленскім яўрэем Самуэлем Мойзешавічам, які дапамагаў шукаць арандатара. Той напісаў да свайго бацькі Лазара Мойзеша ў Берасце, а таксама паведамляў, што 50 тыс. гатовымі грашыма маюцца ў скарбовага

---

[1] Па Чарэі з Мялешкавічамі, Бабром вядома намінальная колькасць дымоў — 2316. (Віцько Д. В. Міжусобная барацьба магнацкіх і сярэднешляхецкіх груповак у Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XVII – пачатку XVIII ст. С. 137–139).

[2] VUB RS (Vilniaus universiteto biblioteka Rankraščių skyrius). F. 4. № 39747. Спіс дымоў у маёнтках Л. К. Радзівіл. 1690.

[3] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 3236. S. 530–533. К. Каменскі да Я. К. Хадкевіча. Гарадзішча, 6.V.1618.

[4] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 2425. P. 1. Я. Лазоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 3.I.1624.

[5] Там жа. F. 139. № 4912. P. 26. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 5.XI.1627.

пісара Паўла Якімовіча Галаўні, а нейкі Чуркоўскі не хацеў ні аб чым дамаўляцца без агляду інвентароў маёнтка. У сувязі з апошняй згадкай робіцца зразумелым, чаму летам 1627 г. у Быхаў з рэвізіяй быў высланы М. Хацімоўскі. У верасні ўраднік пісаў да Самуэля Мойзешавіча, што гадавы прыбытак з графства складае 25 тыс. злотых і яго можна з цягам часу павысіць. Для гэтага М. Хацімоўскі пачаў праводзіць упарадкаванне землекарыстання ў воласці і горадзе, што планаваў скончыць вясной 1628 г. Нягледзячы на поспехі ў рэфармаванні маёнтка, павялічыць прыбыткі з яго перашкодзілі неўраджаі і голад, якія працягваліся з 1627 па 1630 г. Тым не менш на пачатку 1630 г. графства было здадзена ў арэнду яўрэю Лазару Давідовічу, які прыехаў у Быхаў, каб асабіста кіраваць гаспадаркай маёнтка[1].

Адной з прычын, якая падштурхоўвала ўласнікаў Быхава ўкладваць значныя рэсурсы ў будаўніцтва ўмацаванняў вакол горада, была ваенная небяспека. У выніку войнаў з Маскоўскай дзяржавай канца XV — пачатку XVI ст. граніца ВКЛ адсунулася на захад, а гарады Падняпроўя набылі істотнае значэнне ў сістэме абароны дзяржавы. Вялікая ўвага да забеспячэння гарнізонам Быхава ў першай палове XVI ст. сведчыць аб узрастанні яго ваеннага значэння[2]. У канцы XVI — першай палове XVII ст. найбольшую пагрозу ўяўлялі нізавыя казакі. Адзін з першых нападаў на Быхаў яны здзейснілі ў 1590 г., і ў далейшым адміністрацыя графства пастаянна збірала інфармацыю пра дзеянні казакоў, каб папярэдзіць напад і зберагчы маёнтак і горад[3]. У час ваенных кампаній у Маскоўскай дзяржаве ў першай чвэрці XVII ст. Я. К. Хадкевіч актыўна выкарыстоўваў Быхаў і рэсурсы гэтага маёнтка для забеспячэння палявой арміі. У прыватнасці, зімой 1617–1618 гг. у горадзе збіраўся правіянт для будучай летняй кампаніі

---

[1] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1351. Л. Давідовіч да Я. С. Сапегі. Быхаў, 27.V.1630; № 1432. P. 1. І. Дземідовіч да Я. С. Сапегі. Быхаў, 2.I.1629; № 1837. P. 22–23. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 21.V.1627; P. 27–29; P. 32. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 14.IX.1627; № 2883. P. 10. С. Мойзешавіч да Я. С. Сапегі. Вільня, 15.IX.1627; № 4912. P. 15–16. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 18.VIII.1627; P. 18. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 13.IX.1627; P. 20. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 24.IX.1627; P. 26; P. 47–48. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 3.II.1629; № 4969. P. 66. Г. Цехановіч да Я. С. Сапегі. Быхаў, 17.II.1630.

[2] Радзивилловские акты из собрания Российской национальной библиотеки. Первая половина XVI в. / сост. М. М. Кром. М. : Варшава, 2002. С. 73, 105, 120.

[3] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 3236. S. 605–608. Я. К. Хадкевіч да К. Каменскага. Лагер пад Масквой, 18.X.1618 ; LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 5–6; P. 9–10; P. 14–15; P. 27–29; P. 35–36. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 9.II.1625; № 3661. P. 9. А. Пукель да Я. К. Хадкевіча. Быхаў, 5.I.1614; № 4912. P. 27–28. М. Хацімоўскі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 10.XII.1627; P. 29–30; P. 35; № 4969. P. 14–15.

на ўсходзе[1]. Пры Я. С. Сапегу рэсурсы быхаўскай латыфундыі накіроўваліся на іншыя мэты. Нават ва ўмовах неўраджаю значныя запасы жыўнасці з Быхава высылаліся ў 1627 г. у Сапежын, у 1627–1628 гг. — на трыбунал у Менск[2]. Гэта сведчыць аб значным гаспадарчым патэнцыяле маёнтка.

Размяшчэнне Быхава на Дняпры, які з'яўляўся выгодным гандлёвым шляхам, садзейнічала росту і развіццю паселішча. Таму быхаўскія мяшчане адчувалі сябе досыць упэўнена ў адносінах да ўласніка. Гэта пацвярджаецца намаганнямі быхаўчан атрымаць вольнасці. Аб «даўняй» просьбе мяшчан атрымаць прывілей ад уласніка ў 1627 г. пісаў А. Юдыцкі. Неўзабаве быхаўчане самі паехалі за прывілеем да Я. С. Сапегі[3].

Сіла гарадской абшчыны бачная па змаганні супраць увядзення уніі ў горадзе. У першай палове XVII ст. уласнікі Быхава паслядоўна намагаліся прымусіць мяшчан наведваць уніяцкую царкву. У 1624–1625 гг., карыстаючыся тым, што адміністрацыя Я. С. Сапегі толькі пачала ўсталёўвацца ў горадзе, быхаўчане адкрыта выступалі з патрабаваннем адкрыць праваслаўныя цэрквы, закрытыя, відавочна, яшчэ пры Я. К. Хадкевічу[4]. Аднак дабіцца гэтага ім не ўдалося, і напружанасць у рэлігійным пытанні захоўвалася да сярэдзіны XVII ст. Так, у 1648 г. у Быхаве не было дзеючай праваслаўнай царквы, а К. Л. Сапега спрабаваў прымусіць праваслаўных мяшчан хаваць памерлых і ахвяраваць грошы на ўніяцкую царкву[5]. Сітуацыя змянілася ў выніку выбуху паўстання казакоў на Украіне ў 1648 г. і пачатку вайны з Расіяй у 1654 г. Перадумовы гэтых войнаў палягалі шмат у чым у рэлігійнай глебе. Таму, каб захаваць лаяльнасць быхаўчан, уласнікі былі вымушаны пайсці ім на саступкі, і ў другой палове XVII ст. у Быхаве была збудавана праваслаўная царква.

### Высновы

Першая палова XVII ст. стала часам росквіту Быхава. Ён быў ператвораны ў наймагутнейшую фартэцыю на землях ВКЛ, абарончы патэнцыял і ваенна-стратэгічнае значэнне якой сталі добра бачныя ў час войнаў

---

[1] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 3236. S. 447–448. К. Каменскі да Я. К. Хадкевіча. Ляхавічы, 3.XII.1617; S. 450. К. Каменскі да Я. К. Хадкевіча. Ляхавічы, 28.XI.1627; S. 523–524. К. Каменскі да Я. К. Хадкевіча. Ляхавічы, 5.XII.1617.

[2] LMAVB RS (Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skyrius). F. 139. № 1837. P. 24–25; P. 27–29; P. 30. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 30.VIII.1627; P. 32; P. 40–41.

[3] Там жа. F. 139. № 4912. P. 45; № 5300. P. 1–2. А. Юдыцкі да Я. С. Сапегі. Быхаў, 19.I.1627.

[4] Там жа. F. 139. № 1837. P. 9–10; P. 14–15.

[5] BCz (Biblioteka Czartoryskich). Rkps 1653. S. 266–268. К. Л. Сапега да праваслаўных мяшчан Быхава. Бялынічы, 6.I.1648.

сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст. Разам з тым у першай палове XVII ст. у Быхаве паўстала адна з найбольш вялікіх мураваных рэзідэнцый на ўсходзе Беларусі, што значна павысіла статус паселішча. Перадумовай для гэтага стала тое, што Быхаў з'яўляўся цэнтрам даволі вялікай зямельнай латыфундыі. Такое становішча забяспечвала магчымасці для росту і развіцця паселішча. Аднак не менш важнае значэнне меў суб'ектыўны фактар, а менавіта дзейнасць уласнікаў горада Я. К. Хадкевіча і яго зяця Я. С. Сапегі. Для іх Быхаў з'яўляўся адным з найбольш значных зямельных комплексаў, асновай для ўмацавання пазіцый сваіх родаў у палітычным жыцці дзяржавы. Гэта тлумачыць імкненне Я. К. Хадкевіча да ўтварэння ардынацыі на Быхаве, а таксама ўзвядзенне мураванай рэзідэнцыі. Акрамя таго, абодва гэтыя магнаты былі дасведчаныя ў ваеннай справе і мэтанакіравана ўкладвалі рэсурсы ва ўмацаванне абараназдольнасці горада, што спрыяла яго росту і развіццю. Прыклад Быхава дае магчымасць больш дакладна зразумець прычыны з'яўлення і разбудовы магнацкіх рэзідэнцый, ход іх будаўніцтва, а таксама асаблівасці функцыянавання ў азначаны перыяд.



*Мал. 4. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст.*

## Раздзел 2

# СТАРАБЫХАЎСКАЯ КРЭПАСЦЬ У XVII ст.: АРХІТЭКТУРА І АРГАНІЗАЦЫЯ АБАРОНЫ

Развіццё артылерыі ў XV ст. падштурхнула фартыфікатараў да адмовы ад будаўніцтва традыцыйных каменных крэпасцей. XVI стагоддзе ў Еўропе адзначылася росквітам бастыённых сістэм, якія ўяўлялі сабой земляныя валы з выступамі пяцівугольнай формы (бастыёнамі). Апошнія прызначаліся для вядзення агню ўздоўж валоў і размяшчэння гармат. Сярод «заканадаўцаў мод» італьянскіх архітэктараў, а затым і ўсёй Еўропы пачала дамінаваць ідэя «ідэальнага горада-крэпасці», горада з кругавой абаронай, прамымі вуліцамі, абнесенага ровам, валам і бастыённымі збудаваннямі па перыметры. Не стала выключэннем з гэтага працэсу і ВКЛ: большасць умацаваных гарадоў абзавяліся бастыённымі сістэмамі (Магілёў) ці былі перабудаваны па сістэме «ідэальнага горада-крэпасці» (Слуцк, Стары Быхаў, Шклоў).

Нягледзячы на шматмесячныя аблогі XVII ст. — пачатку XVIII ст., а таксама інтэнсіўную гаспадарчую дзейнасць у гістарычнай частцы Старога Быхава ў апошнія 200 гадоў, сёння гэта адзіны ў Беларусі адносна захаваны горад-крэпасць узору XVII ст.




а



б

*Мал. 5. а — Вінчэнца Скамоцці. План ідэальнага горада (пач. XVII ст.): 1 — гандлёвая вуліца, 2 — галоўная плошча з палацам князя і саборам, 3–6 — рынкі і біржавая плошча*[1]*; б — план г. Быхава 1781 г.*[2]

---

[1] Саваренская Т. Ф. История градостроительного искусства. Рабовладельческий и феодальный периоды : учебник для вузов. М. : Стройиздат, 1984. С. 258.

[2] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. Минск : Бел. навука, 2005. С. 121.

Умацаванні Старога Быхава ўвайшлі ў гісторыю галоўным чынам дзякуючы сваёй важнай ролі ў абарончых баях вайны Рускага царства з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. Аблажаны войскамі ўкраінскіх казакоў, а таксама маскоўскімі войскамі А. М. Трубяцкога і І. А. Хаванскага з 29 жніўня 1654 г. да вясны 1657 г., горад не здаўся нават тады, калі практычна ўся тэрыторыя ВКЛ была захоплена непрыяцелем, а сталіца Вільня пала. Такім чынам, Стары Быхаў стаў прыкладам паспяховай рэалізацыі канцэпцыі ідэальнага горада-крэпасці на землях сучаснай Беларусі.

Трэба сказаць, што фактычна ўся гісторыя горада звязана з ваеннай справай. Існуе нават міф, што назва горада звязана з тым, што на яго месцы мясцовыя жыхары хаваліся ад нападаў — «быў хоў». Аднак, як пераканаўча паведамляе А. Рогалеў, назвы паселішчаў на -аў/-оў/-еў (Быхаў, Рагачоў, Шклоў, Лоеў, Магілёў, Тураў, Петрыкаў і інш.) з'яўляюцца «паўднёвым» тапанімічным тыпам, які распаўсюджваўся па тэрыторыі Беларусі разам са славянскімі перасяленцамі з поўдня (паўднёвага захаду) пачынаючы з II стагоддзя да н. э. Назва «Быхаў» магла разумецца як «пасяленне, якое заснаваў Бых ці якое належыць Быху». Імя Бых існавала, яно з'яўлялася гутарковай, усечанай формай поўнага славянскага імя Збыслаў. Ад імя Бых утворана назва вёскі Быхаўшчына (Нясвіжскі р-н, Беларусь)[1], в. Быхаў (Валынская вобл., Украіна), с. Быхава (Бранская вобл., Расія). Ёсць і іншыя, менш верагодныя версіі ўзнікнення назвы «Быхаў» — ад імя рэчкі з назвай Бык, парога на Дняпры і інш.[2], але да вайсковай справы і яны дачынення не маюць.

Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што Стары Быхаў не адразу быў магутным умацаваным цэнтрам абароны. Да канца XVI ст. ён уяўляў сабой звычайны горад сваёй эпохі з драўляным замкам і, верагодна, абнесены драўлянай крапасной сцяной, аб чым сведчаць гістарычныя крыніцы. У прыватнасці, А. Гваньіні паведамляе, што ў 1578 г. у Старым Быхаве быў драўляны замак[3]. Аднак усё змянілася ў 1590 г., калі «нізавыя казакі войска Данскога», узначаленыя гетманам Мацюшам Федаровічам, захапілі Стары Быхаў. Пры гэтым было забіта і паранена шмат гараджан, а іх маёмасць — разрабавана. У першую чаргу казакі забіралі коней і зброю (пулгакі, рушніцы, шаблі і інш.). Возны Аршанскага павета Валентый

[1] Рогалеў А. Быхаў // Чырвоная змена. 1995. 29 жніўня. С. 3.

[2] Там жа.

[3] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов). Минск : Наука и техника, 1975. С. 216.

Садоўскі, які аглядаў замак, зафіксаваў у яго сценах и варотах «есмо кули и стрел не мало»[1].

Адносна часу пачатку будаўніцтва ўмацаванняў існуе шэраг меркаванняў. А. П. Грыцкевіч паведамляе, што Стары Быхаў у магутную фартэцыю з умацаваным замкам ператварыў Я. К. Хадкевіч у перыяд з 1590 па 1620 г.[2]. Але найбольш распаўсюджаным раней з'яўляўся пункт гледжання, паводле якога каменны замак быў пабудаваны да 1619 г., а астатнія ўмацаванні збудаваны пазней К. Л. Сапегам[3]. Разам з тым у папярэднім раздзеле М. Волкаў аргументавана даказаў, што валы пачалі ўзводзіць прыкладна ў 1611 г., а замак — усяго праз некалькі гадоў пасля гэтага.

З пачаткам будаўнічых работ, верагодна, быў здзейснены старажытны паганскі абрад — прынясенне «будаўнічай» ахвяры. Дадзены абрад быў даволі распаўсюджаным ва Усходняй Еўропе і ажыццяўляўся для забеспячэння трываласці і даўгавечнасці пабудовы. Сутнасць яго заключалася ў тым, што будаўнікі на месцы падмурка жыўцом закопвалі жывёлу ці чалавека. Пры гэтым чалавечыя ахвяры прыносілі, як правіла, пры пабудове крэпасцей. Лічылася, што крэпасці пасля гэтага станавіліся непрыступнымі. Пра ахвяру, прынесеную падчас будаўніцтва быхаўскіх земляных умацаванняў, захавалася паданне, паводле якога земляныя насыпы не маглі пабудаваць: уначы ўсё, зробленае днём, знікала. Тады будаўнікі накіравалі некалькіх работнікаў на дарогу, якая вяла ў горад, каб яны схапілі першага сустрэчнага і прывялі яго на будоўлю. Праз некаторы час работнікі сустрэлі хлопца і схапілі яго. Аднак тым часам на дарозе з'явілася дзяўчына. Доўга не сумняваючыся, работнікі схапілі і яе, а затым абодвух павялі ў Стары Быхаў да месца будаўніцтва. «А в городі вже й яму їм наготували: так їх обойко, хлопця і дівчину, живих і засипали землею…»[4]. Гэтае паданне было запісана са слоў быхаўца, які пачуў яго ад сваёй маці.

Улічваючы, што Ян Караль быў прафесійным вайскоўцам, ён падышоў да ўзвядзення фартыфікацыйных збудаванняў адказна і з веданнем справы. Пасля смерці 24 верасня 1621 г. Я. К. Хадкевіча пачалася спрэчка за горад сярод спадчыннікаў вялікага гетмана. Пры гэтым пад сумненнем засталося заканчэнне фартыфікацыйных работ. Насмешка гісторыі

[1] Археографический сборник документов, относящийся к истории Северо-Западной Руси : издаваемый при Управлении Виленского учебного округа. Т. 1. Вильна : Печатня Губернского правления, 1867. С. 175–176.

[2] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975. С. 213.

[3] Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік. Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993. С. 98.

[4] Драгомиров М. П. Малорусские народные предания и рассказы. Киев : Типография М. П. Фрица, 1876. С. 246.

заключаецца ў тым, што Стары Быхаў стаў ідэальным горадам-крэпасцю дзякуючы проціпраўным дзеянням знакамітага палітычнага дзеяча ВКЛ Льва Сапегі і яго сына Яна Станіслава. Паводле тэстаменту Я. К. Хадкевіча, усе яго маёнткі павінны былі адысці ў пажыццёвае валоданне яго маладой жонцы Ганне Алаізе, а родная дачка Ганна Схаластыка Сапега са спадчыны была выключаная. Гэта выклікала абурэнне не толькі сярод Сапегаў, якія былі зацікаўлены ў набыцці маёмасці памерлага, але і іншых людзей, што аб'ектыўна ацэньвалі тэстамент вялікага гетмана як несправядлівы. У сувязі з гэтым Сапегі вырашылі парушыць апошнюю волю Я. К. Хадкевіча і адабраць у яго ўдавы частку маёмасці. Дзеля гэтага яны яшчэ восенню 1621 г. захапілі Ляхавічы і Цімкавічы. Пасля гэтага паміж Сапегамі і Хадкевічамі пачалася барацьба, якая вялася шляхам судовых спрэчак, наездаў і вядзення нефармальных перамоў. Урэшце рэшт 23 траўня 1623 г. падчас сесіі Кароннага Трыбунала варагуючыя бакі прыйшлі да пагаднення аб падзеле маёмасці Я. К. Хадкевіча, у выніку чаго Стары Быхаў перайшоў да Сапегаў. Пры гэтым трэба адзначыць, што Ганна Алаіза, маючы перавагу з пункту гледжання права, пайшла на пагадненне толькі з-за адсутнасці сродкаў на далейшую барацьбу і чаканне вырашэння справы. Кропку ў гэтым канфлікце паставіла рашэнне соймавага суда ад 18 лютага 1625 г.[1].




*Мал. 6. Адам Фрэйтаг. Умацаванне горада, змешчанага над ракой значнай шырыні*[2]

---

[1] Жойдзь К. Захады Сапегаў па атрыманні ўладанняў Яна Караля Хадкевіча пасля яго смерці // ARCHE. 2016. № 3. С. 373–391.

[2] Zarębska T. Początki polskiego piśmiennictwa urbanistycznego. Warszawa : Państwowe wydawnictwo naukowe, 1986. S. 313.

Такім чынам, пачынаючы з гэтага часу Ян Станіслаў Сапега, а затым Казімір Леў Сапега працягвалі работы па ўмацаванні Старога Быхава і ўрэшце рэшт зрабілі з яго ідэальны горад-крэпасць, якім ён і ўвайшоў у гісторыю. Фактычна гэта ўжо быў новы горад, перабудаваны на аснове перадавога еўрапейскага вопыту фартыфікацыі, які адпавядаў поглядам таго часу на «ідэальную» мадэль умацаванага горада (мал. 5). У якасці ўзору фартыфікацыйнага забеспячэння горада ў падобных тапаграфічных умовах можна прывесці чарцёж з трактата А. Фрэйтага 1631 г.[1] (мал. 6). Некаторыя парушэнні сіметрыі пры будаўніцтве Старога Быхава тлумачацца асаблівасцямі рэльефу мясцовасці.

З паўночнага, заходняга і паўднёвага бакоў Стары Быхаў быў абнесены земляным валам у форме паўкруга дыяметрам каля 800 м. Вышыня вала складала 7–8 м, а шырыня ў аснове — прыкладна 30 м[2]. З боку Дняпра вал адсутнічаў, бо Стары Быхаў стаіць на высокім (18–20 м) абрывістым плато ў пойме гэтай ракі, якая прыкрывала подступы да горада з усходу. Акрамя таго, паралельна Дняпру ўздоўж гарадскіх умацаванняў праходзіла рэчышча р. Макранкі, у раёне замка перакрытае плацінай. Сляды гэтага рэчышча яшчэ бачныя ў пойме Дняпра (мал. 7).



*Мал. 7. Сляды р. Макранкі і гаці на ёй каля Старабыхаўскага замка (фота з сайта holiday.by)*

[1] Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце : у 4 т. Т. 2. XV – сярэдзіна XVII ст. / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. Мінск : Бел. навука, 2006. С. 103.

[2] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск : Навука і тэхніка, 1991. С. 81.

На гарадскім вале размяшчаліся 12 бастыёнаў аднатыпнай пяцівугольнай формы. Выключэнне складалі чатырохвугольны замкавы, а таксама трохвугольны крайні паўночны паўбастыёны[1]. Сёння нельга адназначна адказаць на пытанне пра тое, якой формы быў вуглавы паўднёвы бастыён. Па меркаванні Ю. В. Чантурыі, ён быў класічным пяцівугольным[2]. Адной з крыніц, на падставе якой можна зрабіць такую выснову, з’яўляецца План Старога Быхава 1778 г. (мал. 8). Аднак гэты дакумент — схематычны і не зусім дакладна адлюстроўвае асаблівасці гарадской планіроўкі. Акрамя таго, на Панараме Старога Быхава, створанай у другой палове XVII ст., усе бастыёны, за выключэннем крайняга паўночна-ўсходняга, намаляваны пяцівугольнымі (мал. 4)[3]. На іншых планах Старога Быхава (напрыклад, на планах 1707 (мал. 9) і 1781 гг. (мал. 5)) вуглавое паўднёвае земляное ўмацаванне выступае ў форме паўбастыёна (мае трохвугольную форму). Пры гэтым на плане 1707 г. перад дадзеным бастыёнам намаляваны даволі магутны горнверк[4]. А на плане 1781 г. пасярэдзіне паўднёвага паўбастыёна можна разгледзець вузкі праезд ці яр, які дзеліць бастыён на дзве часткі.




*Мал. 8. Фрагмент Плана Старога Быхава 1778 г.*

---

[1] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. С. 119.

[2] Там жа.

[3] Волкаў М. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 5. С. 16–24.

[4] Горнверк (нямец. hornwerk — літар. «рагавое ўмацаванне») — у бастыённай сістэме фартыфікацыі: знешняе дапаможнае ўмацаванне, якое служыла для ўзмацнення крапаснога фронта і складалася з бастыённага фронта з двума паўбастыёнамі, высунутага ў бок праціўніка перад галоўным валам крэпасці.

Пры гэтым крайні паўднёвы бастыён быў двух’ярусны, што пацвярджаецца названай Панарамай Старога Быхава, а таксама фотаздымкамі часоў Вялікай Айчыннай вайны (мал. 10).

Зыходзячы са сказанага, а таксама ўлічваючы той факт, што любыя прадбастыённыя збудаванні канструктыўна будаваліся ніжэй бастыёнаў (у выпадку іх захопу абаронцы маглі бесперашкодна абстрэльваць праціўніка), можна з вялікай доляй верагоднасці казаць пра тое, што вуглавое паўднёвае і вуглавое паўночнае земляныя ўмацаванні з’яўляліся паўбастыёнамі (прынамсі — першапачаткова). Дадзеная тэза ўскосна пацвярджаецца сучасным рэльефам надабалоннага плато з боку Дняпра. Адносна названага вышэй горнверка можна выказаць здагадку, што ён быў пабудаваны ў канцы XVII – пачатку XVIII ст., бо на Панараме Старога Быхава гэты элемент адсутнічае. Акрамя таго, на дадзенай выяве не намаляваны і равелін (мал. 11), размешчаны каля вуглавога паўночнага паўбастыёна і часткова захаваны да нашых дзён, а таксама адлюстраваны на планах 1707, 1778 і 1781 гг., што таксама сведчыць пра тое, што дадзены равелін мог быць пабудаваны ў перыяд часу з 1667 г. (канец вайны Рэчы Паспалітай з Рускім царствам) да 1702 г. (першая аблога Старога Быхава ў гады Паўночнай вайны).




*Мал. 9. Фрагмент Плана аблогі Быхава рускім войскам у 1707 г.* [1]

[1] Sammlung von Festungsplänen. II. Planes von Italien, Ungarn, Pohlen und denen Nordischen Königreichen, 1732 (?) [Elektronische Ressource] // Deutsche Fotothek. URL: http://www.deutschefotothek.de/documents/obj/70300002 (Referenzdatum: 21.07.2016).





*а* *б*

*Мал. 10. Крайні паўднёвы паўбастыён*
*а — фрагмент Панарамы Старога Быхава другой паловы XVII ст.,*
*б — фрагмент фотаздымка нямецкага салдата 1941 г.*

Бастыёны служылі месцам для размяшчэння артылерыі і дазвалялі стварыць даволі вялікую шчыльнасць агню на тым участку абароны, які падвяргаўся нападу. Пры гэтым ядры праціўніка, якія траплялі ў вал, проста засядалі ў зямлі, не прычыняючы ніякай шкоды абаронцам. Вугал нахілу знешняга боку быхаўскіх валоў і бастыёнаў складаў каля 115 градусаў, што стварала істотныя цяжкасці для ворага, жадаючага падняцца на іх: пад такім вуглом падчас бою трэба было пераадолець не меней за 15 м. Прыкладна такі вугал нахілу захаваўся ў наш час на земляным вале вуглавога паўночнага паўбастыёна на скрыжаванні вул. Валадарскага і зав. Куйбышаўскі спуск (мал. 12).



*Мал. 11. Рэшткі равеліна каля вуглавога паўночнага паўбастыёна*
*(фота Ю. Шкаплярова)*

У літаратурных крыніцах адзначаецца, што ў 1707 г. найбольш зручныя для нападу месцы гарадскога вала ад падножжа да верхняй мяжы былі абкладзены вялікімі калодамі, у якія ўкручвалася шмат адмыслова зробленых нажоў[1]. Вельмі верагодна, што дадзенае паляпшэнне бастыённай сістэмы існавала ўжо ў XVII ст.

Перад гарадскім валам змяшчаўся паўкруглы роў глыбінёй 7–8 м і шырынёй 50 м[2], абрысы якога з геаметрычнай дакладнасцю паўтаралі контуры бастыёнаў. Яго рэшткі і цяпер можна назіраць у цэнтры Быхава (мал. 12).



*Мал. 12. На дне крапаснога рова Старога Быхава (фота Ю. Шкаплярова)*

Па меркаванні Ю. В. Чантурыі, роў з боку поймы наўрад ці напаўняўся вадой, бо вышыня надабалоннага плато тут складае 18–20 м, а глыбіня рова ў 20 м малаверагодная ва ўмовах ландшафту і горадабудаўнічага маштабу Старога Быхава. У той жа час аўтар дапускае магчымасць частковага абваднення рова на ўчастку паміж Магілёўскай і Рагачоўскай (пазней — Навабыхаўскай) брамамі, масты да якіх і маглі выступаць у якасці плацін. Два ўчасткі рова ад мастоў да поймавай раўніны хутчэй за ўсё былі сухімі і мелі дно, якое паступова паніжаецца прыкладна на 10 м[3].

Верагоднасць таго, што пункт гледжання Ю. В. Чантурыі адпавядае рэчаіснасці, даволі вялікая. Па-першае, на названай раней Панараме Старога Быхава, каля крайніх паўднёвага і паўночнага паўбастыёнаў якіх-небудзь плацін ці іншых гідратэхнічных збудаванняў не намалявана. Па-другое, фрагмент гарадскога рова, які захаваўся да цяперашняга часу каля Быхаўскага раённага цэнтра культуры, да канца

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 87.

[2] Там жа. С. 81.

[3] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. С. 120.

XX ст. быў запоўнены вадой (мал. 13). Пры гэтым вадой да самага берага ён быў запоўнены і раней, што пацвярджаецца фотаздымкамі гадоў Вялікай Айчыннай вайны (мал. 14). На мяжы 80–90-х гг. мінулага стагоддзя падчас работ па ачыстцы дна гэтага вадаёма было выяўлена, што пад глейкімі адкладамі і глебай яно раўнамерна пакрыта слоем гліны, пад якім знаходзіліся снапы лёну, а пад імі — зноў слой гліны. Падчас ачышчальных работ гэтаму факту ніхто значэння не надаў, і лён быў выдалены цяжкай тэхнікай. Пасля гэтага ўчастак рова больш за 30 гадоў вадой так і не напоўніўся. У сваю чаргу часткова засыпаны ўчастак рова ад вул. Леніна да вул. Савецкай абводнены і да сённяшняга дня. Акрамя таго, у інвентары Старабыхаўскага замка за 1692 г. згадваецца такая павіннасць быхаўскіх валашчан, як засыпанне рова сенам (дадатак 2). Неабходна адзначыць, што сыпаць сена ў роў не мела сэнсу, у сувязі з чым хутчэй за ўсё гаворка тут ідзе пра засыпанне дна і сцен абарончага рова слоем лёну, які там і знайшлі ў XX ст. Прымаючы да ўвагі сказанае, а таксама ўлічваючы наяўнасць у лёну водаўстойлівых якасцей, можна даволі ўпэўнена казаць пра тое, што гарадскі роў на ўчастку паміж Магілёўскай і Рагачоўскай брамамі запаўняўся вадой.



*Мал. 13. Гарадскі роў, запоўнены вадой (фота нямецкага салдата). Стары Быхаў, лета 1941 г.*



*Мал. 14. Гарадскі роў, запоўнены вадой (фота сярэдзіны 1980-х гг.)*

Апроч названых Магілёўскай і Рагачоўскай, мелася ў Старым Быхаве і трэцяя брама — Падольная (Дольная, Дняпроўская), праз якую ажыццяўляўся выхад да Дняпра, а пры неабходнасці гэта брама, прыкрытая з двух бакоў замкам і каталіцкім манастыром, дазваляла аказваць знешнюю дапамогу блакіраным у замку войскам[1]. Быхаўскія брамы ў XVII ст. былі цаглянымі неатынкаванымі і размяшчаліся ў тоўшчы вала. Пра знешні выгляд брам можна меркаваць у асноўным зыходзячы з захаваных планаў Старога Быхава канца XVIII ст. і названай раней Панарамы Старога Быхава.

Дольная брама адрознівалася ад Магілёўскай і Рагачоўскай. Гэта быў аднапавярховы будынак, які цалкам размяшчаўся ў абарончым вале (мал. 15, 16). Сучасным аналагам Дольной брамы з'яўляецца ўязная брама г. Буртанж у Галандыі.

У сваю чаргу, у адпаведнасці з выявай на Панараме Старога Быхава, Магілёўская і Рагачоўская брамы былі двух'яруснымі з плоскім дахам і ўзвышаліся над абарончым валам (мал. 17). Атыкі абедзвюх брам у XVII ст. былі ўвянчаныя «каронай» — дэкаратыўнымі зубцамі, якія наўрад ці насілі абарончы характар. Пра шмат'ярусную канструкцыю брам сведчаць і гістарычныя крыніцы. Так, у 1714 г., калі рускім салдатам прыйшоў загад пакінуць захоплены горад, «Масква ў брамах быхаўскіх мураваных вярхі поўнасцю паразбірала, а пад вывады, якія былі наймацнейшымі, выкапаўшы рвы, бочкі з порахам паставіўшы,

[1] Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. Минск : Наука и техника, 1992. С. 42.

паўзрывалі…»[1]. У 1780 г. пры апісанні Старога Быхава згадваюцца ўжо аднаўленыя над двума варотамі «…дзве каменныя моцныя вежы»[2].



*Мал. 15. Выява Дольной брамы на плане «Профілі і фасады горада Старога Быхава 1781 г.»*[3]



*Мал. 16. Выява Дольной брамы на плане «Профілі і фасады горада Старога Быхава 1781 г.»*[4]

---

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 88.

[2] Топографические примечания на знатнейшие места путешествия Ее Императорского Величества в Белорусские наместничества. СПб. : Импер. Акад. Наук, 1780. С. 85.

[3] РДВГА (Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў). Ф. 349. Воп. 5. С. 216. Арк. 3–4.

[4] Там жа. Ф. 349. Воп. 5. С. 216. Арк. 3–4.



*Мал. 17. Выява Магілёўскай брамы на Панараме Старога Быхава другой паловы XVII ст.*

Па меркаванні Ю. В. Чантурыі, кожная з гэтых брам мела побач з канструкцыяй праезду высокую шмат'ярусную абарончую вежу з шатровым завяршэннем. Аналагам такіх пабудоў, агульным па часе і тыпе, аўтар называе Замкавую гарадскую браму г. Нясвіжа, побач з якой у XVII ст. таксама размяшчалася падобная вежа. Падставай для такой высновы, на думку аўтара, з'яўляецца План Старога Быхава 1781 г., на якім Рагачоўская і Магілёўская брамы намаляваны ў выглядзе каменных тунэляў з прамавугольнымі прыбудовамі з боку на вале, якія, магчыма, і з'яўляліся абарончымі вежамі (гл. мал. 5)[1].

Аднак на Панараме Старога Быхава побач з брамамі якія-небудзь дадатковыя вежы адсутнічаюць (мал. 4). Акрамя таго, на плане горада, складзеным паміж 1778 і 1880 гг., асновы брам прадстаўлены ў выглядзе правільных прамавугольнікаў, а на плане «Профили и фасады города Старого Быхова 1781 г.» Магілёўская брама схематычна зафіксавана як аднапавярховы будынак з чатырохсхільным дахам без якіх-небудзь прыбудоў (мал. 18). Такім чынам, як у XVII, так і ў XVIII ст. названыя старабыхаўскія брамы не мелі ў сваёй канструкцыі дадатковых абарончых веж.

[1] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. С. 120.

Усе брамы Старога Быхава стаялі на сваіх месцах яшчэ ў другой палове XIX ст.[1], пасля чаго былі разабраны на цэглу мясцовымі жыхарамі.



*Мал. 18. Выява Магілёўскай брамы на плане «Профілі і фасады горада Старога Быхава 1781 г.»[2]*

У наш час абарончыя валы на ўсёй іх працягласці фактычна цалкам разбураны. Захаваліся толькі рэшткі двух паўночна-заходніх (у раёне Пеўчага поля) і двух паўднёва-заходніх бастыёнаў (насупраць будынка раённага суда). Нядрэнна захаваўся вуглавы паўночны паўбастыён (мал. 19).



*Мал. 19. Вуглавы паўночны паўбастыён гарадскіх умацаванняў Старога Быхава (фота Ю. Шкаплярова)*

[1] Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии, с присовокуплением и других сведений, к ней же относящимся / подгот. изд. В. Н. Татур. Репринт. изд. Минск : Алфавит, 1995. С. 204 ; Живописная Россия / под общ. ред. П. П. Семенова. Репринт. воспроизведение изд. 1882 г., 2-е изд. Минск : Беларус. энцыкл., 1994. С. 88.

[2] РДВГА (Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў). Ф. 349. Воп. 5. С. 216. Арк. 2.

Унутрыгарадская планіроўка Старога Быхава ў XVII ст. адпавядала асноўным правілам фартыфікацыі і прадугледжвала вядзенне вулічных баёў[1]. Захаваныя планы горада канца XVIII ст. сведчаць пра тое, што паміж замкам і цэнтральным заходнім бастыёнам знаходзілася велізарная плошча шырынёй каля 80 м, якая прызначалася для размяшчэння войскаў. На гэтай тэрыторыі сёння знаходзяцца рэдакцыя газеты, Кастрычніцкая плошча і брацкая магіла. Перад цэнтральным бастыёнам (на мяжы Кастрычніцкай плошчы і вул. Леніна) стаяў будынак уніяцкай царквы, які мог выкарыстоўвацца ў якасці вузла абароны пры пранікненні праціўніка на бастыён. Злева і справа ад плошчы знаходзіліся жылыя кварталы, якія ўтваралі вулічную сетку прамавугольнай формы, што адпавядала ўпарадкаванню гарадоў-крэпасцей эпохі Адраджэння. Вуліцы былі даволі шырокімі і забяспечвалі хуткае перамяшчэнне салдат з аднаго канца горада ў другі. Так, шырыня галоўнай вуліцы складала каля 10 м, астатнія былі вузейшымі — да 4 м[2] (мал. 20). Як мінімум галоўныя вуліцы горада ў сярэдзіне XVII ст. былі ўладкаваныя драўлянымі маставымі. Гэты факт пацверджаны падчас археалагічных раскопак. У прыватнасці, у 1989 г. у паўночнай частцы горада (у межах бастыённых умацаванняў) на глыбіні 0,7 м была выяўлена маставая названага гістарычнага перыяду з бярвёнаў шырынёй 4,5 м[3].

Забудова Старога Быхава таго часу была шчыльнай і пераважна драўлянай, пра што сведчаць гістарычныя крыніцы. У прыватнасці, І. Залатарэнка пры аблозе горада ў 1654 г. паведамляў цару Аляксею Міхайлавічу: «…город деревянный и зело домы большие и частые»[4]. Выключэнне складалі каменныя будынкі замка, згаданых брам і сінагогі. Матэрыял, выкарыстаны для пабудовы гэтых аб’ектаў, не выклікае сумнення. У той жа час, прымаючы да ўвагі выяву названай раней Панарамы Старога Быхава, можна са значнай доляй упэўненасці гаварыць аб тым, што ў горадзе каменнымі былі праваслаўная і ўніяцкая цэрквы, каталіцкі касцёл і будынак манастыра. Такую выснову можна зрабіць зыходзячы з аналізу выкарыстання аўтарам Панарамы Старога Быхава колераў падчас малявання розных будынкаў: неатынкаваныя будынкі (замак, брамы, манастыр

[1] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975. С. 206.

[2] Егоров Ю. А. Градостроительство Белоруссии. М. : Гос. изд-во лит. по стр-ву и архитектуре. 1954. С. 94.

[3] Ляўкова Т. І., Сінчук І. І. Быхаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. Мінск : БелЭн, 1993. С. 107.

[4] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. Т. 2 : Разрядный приказ. Московский стол. 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. СПб. 1894. С. 385.

і некаторыя камяніцы) маюць чырвона-белы колер (чырвоная цэгла на белым фоне), атынкаваныя (сінагога, касцёл, праваслаўная і ўніяцкая цэрквы) — шэры колер. Аўтар таксама адзначыў будынкі з драўляным каркасам (дыяганальныя лініі на шэрым фоне) — званіцы касцёла, праваслаўнай і ўніяцкай цэркваў (гл. мал. 4)[1].




*Мал. 20. Горад-крэпасць Стары Быхаў у пачатку XVII ст. Рэканструкцыя Ю. В. Чантурыі*[2]

*План: 1 — галоўная вежа замка, 2 — праязная вежа замка, 3 — касцёл Св. Казіміра, 4 — жылы будынак, 5 — брама, 6 — праваслаўная царква, 7 — гандлёвыя рады, 8 — уніяцкая царква, 9 — сінагога, 10 — Падольная (Дольная) брама, 11 — Магілёўская брама, 12 — Рагачоўская брама*

Цікава, што да цяперашняга часу агульнапрынятым з'яўлалася меркаванне пра тое, што ўсе гарадскія цэрквы, касцёл і манастыр[3] у XVII ст. былі драўлянымі. Але ж, улічваючы згаданы вышэй аналіз Панарамы

---

[1] Волкаў М. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 5. С. 19.

[2] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. С. 123.

[3] Кулагін А. М. Каталіцкія храмы Беларусі. Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. С. 395 ; Опись Старо-Быховскому приходскому костелу и плебании, преображенным из помонастырских ксендзов-каноников регулярных, а также имуществу оных принадлежащему // Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Ф. 149. Воп. 3. Спр. 189. Арк. 15.

Старога Быхава, сёння ёсць падставы сцвярджаць, што як мінімум будынкі касцёла і манастыра ў сярэдзіне XVII ст. былі цаглянымі. Таксама трэба адзначыць, што мураваны касцёл узгадваецца і ў пісьмовых крыніцах сярэдзіны XVII ст.: у 1660 г. пасля захопу арміяй Маскоўскай дзяржавы Старога Быхова цар Аляксей Міхайлавіч загадаў: «В Старом Быхове в *каменном костеле* (курсіў наш. — *Ю. Ш.*) быть соборной церкви Рождества Господа Бога и Спаса нашего Иисуса Христа»[1]. Акрамя таго, усе названыя аб'екты можна знайсці на планах Старога Быхава 1707 г. (мал. 9) і 1781 г. (мал. 5), дзе іх колер, як і колер замка, сінагогі і гарадскіх брам, адрозніваецца ад колеру іншых пабудоў.



*Мал. 21. Фрагмент «Плана Старога Быхава межавання 1783–1785 гг.»*

Падчас напісання дадзенай працы намі быў знойдзены «План Старога Быхава, межавання 1783–1785 гг.»[2]. Згодна з планам (мал. 21) і тлумачэннем да яго, каменнымі ў горадзе былі: 1) замак; 2) кляштар і касцёл; 3) яўрэйская школа; 4) брамы («ворота»); 5) дом пусты, трухлявы, які раней быў поштай, а зараз кватэра для гараднічага; 6) дамы яўрэйскія. Будынак пад нумарам пяць у гэтым спісе па сваім месцы знаходжання (недалёка ад паўднёва-ўсходняй замкавай вежы) супадае з каменным будынкам мураванай уніяцкай царквы на плане 1707 г. і з каменным будынкам на плане 1781 г. Абазначэнне на плане 1783–1785 гг. гэтага збудавання як «дом пусты, трухлявы, які раней быў поштай, а зараз кватэра для гараднічага» можна тлумачыць тым, што пасля далучэння Старога Быхава да Расійскай імперыі

[1] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. Т. 3 : Разрядный приказ. Московский стол. 1660–1664 / под ред. Д. Я. Самоквасова. СПб. 1901. С. 54–55.

[2] РДАСА (Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў). Ф. 1356. Воп. 1. Спр. 2181.

ўніяцкая царква была, хутчэй за ўсё, закрыта, а яе будынак перададзены мясцовым уладам.

Усё гэта дазваляе сцвярджаць, што ўніяцкая царква, касцёл і манастыр у XVII ст. былі мураванымі. Адносна праваслаўнай царквы такі вывад адназначна зрабіць нельга, бо на ўсіх планах (акрамя плана 1707 г.) яна адзначана як драўляная. Аднак аўтар Панарамы Старога Быхава мог намаляваць яе як каменную, каб надаць сваёй працы ці адлюстраванаму на ёй гораду значнасці і прыгажосці. Сказанае выклікае асаблівую цікавасць у сувязі з тым, што захаваны да нашых дзён будынак манастыра (сёння ў ім размяшчаецца лясгас), які лічыцца помнікам архітэктуры XVIII ст., хутчэй за ўсё быў пабудаваны на сто гадоў раней і першапачаткова выглядаў так, якім яго ўбачыў аўтар Панарамы Старога Быхава. У сваю чаргу, касцёл у XVII ст., верагодна, не быў драўляным, а толькі перабудоўваўся (мал. 22), і таксама асноўную сваю архітэктурную кампазіцыю захаваў да 60-х гг. XX ст., калі быў зруйнаваны.



*Мал. 22. План касцёла ордэна кармелітаў 1756–1761 гг. у Быхаве*[1]

Што да сінагогі, то час яе пабудовы можна ўстанавіць даволі дакладна. Вядома, што ў 1648 г. уладальнік горада Казімір Леў Сапега выдаў быхаўскім яўрэям прывілей на будаўніцтва каменнай сінагогі. Пры гэтым у прывілеі асабліва адзначалася, што сінагога не павінна быць вышэй за астатнія будынкі[2]. Існуе меркаванне, праўда не падтрыманае

[1] БДАМЛМ (Бел. дзярж. архіў-музей літаратуры і мастацтва). Ф. 149. Воп. 3. Спр. 326.
[2] Волкаў М. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 5. С. 20.

крыніцамі, што прычынай, якая прымусіла магната даць такі дазвол, была яго запазычанасць мясцовым яўрэям[1]. Магчыма, яшчэ адным фактарам было жаданне К. Л. Сапегі палепшыць абарончыя магчымасці горада: дадатковы каменны будынак, тым больш размешчаны каля ўязной брамы, істотна павялічваў шанцы абаронцаў горада. Аднак яўрэйская абшчына па максімуме выкарыстала запазычанасць магната перад ёй і не выканала ўмовы К. Л. Сапегі пра вышыню будынка.

Адносна часу заканчэння будаўніцтва можна з вялікай доляй верагоднасці казаць, што сінагога была пабудавана не пазней 1654 г. Дадзены тэзіс абгрунтоўваецца тым, што з 1654 па 1667 г., падчас вайны Рэчы Паспалітай з Рускім царствам, правядзенне якіх-небудзь будаўнічых работ у горадзе было немагчыма. Пасля вайны будаўніцтва падобных аб’ектаў таксама было малаверагодным, таму што Стары Быхаў у выніку разбурэнняў і панесеных страт заняпаў[2].



*Мал. 23. Быхаўская сінагога. На ўнутраным баку атыка бачныя закладзеныя цэглай байніцы XVII ст. (фота з сайта holiday.by)*

[1] ДАМВ (Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці). Ф. 1244. Воп. 3. Спр. 12. Арк. 2.

[2] Волкаў М. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 5. С. 20.




*а* *б*

*Мал. 24. Быхаўская сінагога*
*а — фрагмент Панарамы Старога Быхава другой паловы XVII ст.,*
*б — фотаздымак пачатку XX ст.*

Знешні выгляд і ўнутранае ўбранне сінагогі вызначыліся будаўнічай модай свайго часу. У канцы XVI ст. на змену храмам з двухнефнай залай, двума слупамі пасярэдзіне для бімы і шасцю скляпеністымі падлогамі прыходзіць дзевяціпольная сінагога. Яна асноўвалася на рэгулярным квадратным плане мужчынскай залы, у сярэдзіне якой узвышаліся чатыры слупы, якія падтрымлівалі скляпененні. Слупы дзялілі прастору на дзевяць палёў. Адпаведна сцены залы ўмоўна падзяляліся на тры часткі кожная. У кожнай з частак знаходзіліся высокія вокны (па тры ў кожным фасадзе), за выключэннем усходняга, дзе над алтаром, як правіла, знаходзілася круглае акно[1].

У пачатку XVII ст. узнікаюць дзве разнавіднасці дзевяціпольных сінагог, якія адрозніваліся адна ад адной канструкцыяй бімы. У першым выпадку біма мела выгляд чатырох слупоў, якія стаяць асобна адзін ад аднаго. У другім — чатыры слупы злучаліся ўверсе ў падабенства полага, ствараючы паміж слупамі купал з аконнымі праёмамі. Дзевяціпольныя храмы, якія належаць да другога варыянта, амаль адначасова з'явіліся ў Пінску (1640 г.), Слоніме (1642 г.), Наваградку (1648 г.) і Старым Быхаве[2]. Аналагічныя сінагогі былі распаўсюджаны і на Валыні.

---

[1] Материалы предварительных научно-исследовательских и проектных работ по реставрации памятника архитектуры XVII в. большой синагоги в Быхове. Минск : Белорусский реставрационно-проектный институт, 1991. С. 22.

[2] Там жа.

Лаканічны і строгі знешні выгляд старабыхаўскай сінагогі сведчыць пра яе абарончы характар: таўшчыня сцен складае 1,75 м, з паўночна-заходняга вугла да квадратнага збудавання прылягае круглая вежа. Характэрным элементам гэтай сінагогі з’яўляецца атыкавы ярус (высокі надкарнізны парапет). У сценах атыка раней размяшчаліся байніцы. На рэштках унутраных сцен атыка і сёння добра бачныя замураваныя праёмы круглай і вузкай прамавугольнай формы (мал. 23). Дах сінагогі ў XVII ст. быў плоскі, увянчаны, як і дахі ўязных брам, дэкаратыўнымі зубцамі («каронай») (мал. 24). Такая форма пакрыцця была абрана не выпадкова. У адрозненне ад двухсхільнага даху, яна дазваляла не памяншаць вышыні інтэр’ера храма з улікам забароны ўлад на будаўніцтва сінагогі вышэй за астатнія гарадскія будынкі. З гэтай жа мэтай у сінагогах таго часу падлогу часта паніжалі на некалькі дзясяткаў прыступак. Такі падыход назіраецца і ў старабыхаўскай сінагозе[1]. Уваход у храм зачыняўся цяжкімі жалезнымі каванымі дзвярамі з дэкаратыўным малюнкам (мал. 25). Па сведчанні мясцовых жыхароў, дзверы яшчэ былі на сваім месцы ў 60-я гг. XX ст. Тоўстыя сцены, жалезныя дзверы і байніцы дазвалялі быхаўцам не толькі хавацца ў сінагозе пры прарыве праціўніка ў горад, але і прастрэльваць частку абарончага вала.



*Мал. 25. Жалезныя дзверы Быхаўскай сінагогі*

[1] Материалы предварительных научно-исследовательских и проектных работ по реставрации памятника архитектуры XVII в. большой синагоги в Быхове. Минск, 1991. С. 24.



*Мал. 26. Фрагменты керамічных зялёнапаліўных кафляў першай паловы XVII ст. са Старабыхаўскай сінагогі, выяўленых падчас раскопак у 1988–1989 гг.*[1]

У адрозненне ад знешняга аскетычнага, унутраны выгляд сінагогі быў багаты на дэкаратыўнае ўбранне інтэр'ераў, аздобленых керамічнымі кафлямі (мал. 26)[2], ляпнінай (мал. 27) і роспісам. Пры гэтым шырока выкарыстоўваліся постаці міфічных жывёл, раслінны і геаметрычны арнамент, карціны на рэлігійныя тэмы. Манера выканання вытрымлівалася ў духу ўсходніх і элiністычных традыцый з улікам рэнесансных і барочных тэндэнцый[3]. Ляпніна і роспіс захоўваліся яшчэ ў 30-я гг. XX ст., што пацвярджаецца фотаздымкамі М. С. Кацэра (мал. 27а)[4], пасля чаго з прычыны розных акалічнасцей унутранае ўбранне храма было згублена.

Але ўсё ж сэрцам горада быў, безумоўна, замак. Ён з'яўляўся важнай часткай знешніх усходніх умацаванняў і адначасова — унутранай цытадэллю[5]. Будынак замка быў аддзелены ад горада П-вобразным ровам

[1] Раханский И. Е., Синчук И. И. Поливы керамических изделий XVII – нач. XVIII в. из г. Быхова (Беларусь) // Вестн. Псков. гос. ун-та. Сер. Социально-гуманитарные науки. 2013. Вып. 2. С. 220–223.

[2] Там жа. С. 222.

[3] Материалы предварительных научно-исследовательских и проектных работ по реставрации памятника архитектуры XVII в. большой синагоги в Быхове. Минск, 1991. С. 25.

[4] БДАМЛМ (Бел. дзярж. архіў-музей літаратуры і мастацтва). Ф. 149. Воп. 3. Спр. 323.

[5] З такім меркаваннем не згодны М. Волкаў, які лічыць, што роў вакол замка, пад'ёмны мост, падаючыя краты, або герса ў браме, а таксама дзве знешнія вежы хутчэй павінны былі ствараць ўражанне абарончага аб'екта. Такі падыход быў тыповым для архітэктуры рэзідэнцый XVII ст. Абарончыя элементы ў той час ужо ў значнай ступені страцілі свае першасныя функцыі і пераўтварыліся ў сімвалы, з дапамогай якіх падкрэслівалася дыстанцыя паміж мяшчанамі і ўласнікам горада. Старабыхаўскі графскі палац, на думку гэтага даследчыка, пастаўлены на беразе Дняпра, павінен быў аказваць уражанне на вандроўнікаў, што праплывалі па рацэ, сімвалізаваць веліч і магутнасць роду Сапегаў (падрабязней гл.: Волкаў М. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 5. С. 16–24.)

шырынёй 22–27 м і земляным валам з бастыёнамі[1]. На поўдзень ад рова, відавочна, знаходзіўся фруктовы сад[2].





*а* *б*

*Мал. 27. Ляпніна Быхаўскай сінагогі*
*а — 30-я гг. XX ст., б — наш час*

З канца XVII да сярэдзіны XIX ст. замак уяўляў сабой утвораны трыма карпусамі і сцяной чатырохвугольнік з унутраным дваром, умацаваны шасці- і васьміграннымі вежамі, пры гэтым таўшчыня сцен апошніх складала каля 1 м.

Першы ярус кожнай васьміграннай вежы меў сем байніц вышынёй 70 см, перакрытых паўкруглай аркай шырынёй 73 см. На другім ярусе размяшчаліся восем байніц[3]. Абедзве вежы ў наш час часткова адрэстаўраваны.

У замак можна было патрапіць праз мост, які вёў да ўязной брамы, змешчанай паміж васьміграннымі вежамі. На думку М. А. Ткачова, мост быў пад'ёмным. Пры гэтым, зыходзячы з тэксту, можна зрабіць выснову, што аўтар спасылаецца на інвентар замка за 1692 г.[4]. Аднак у згаданым інвентары пра пад'ёмны механізм маста не гаворыцца (гл. дадатак 2). Па абодвух баках маста стаялі парэнчы на балясінах точаных, а на сярэдзіне маста

---

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 80.

[2] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. С. 119.

[3] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. С. 80–81.

[4] Там жа. С. 80.

размяшчаліся краты з дрэва сталярскай работы. Зыходзячы з апісання, замкавы мост быў падобны да крапаснога моста ў г. Буртанж (Галандыя) (мал. 28).



*Мал. 28. Крапасны мост у г. Буртанж (Галандыя). Сучасная рэканструкцыя. На фотаздымку таксама відаць мураваную браму, якая падобна да Падольнай брамы ў Старым Быхаве*

Дакладна ўстанавіць выгляд замкавай брамы сёння немагчыма. З інвентара 1692 г. вядома, што з боку горада яна мела «вароты на бегунах з краты» (г. зн. металічную пад'ёмную рашотку-герсу), а з боку замка — яшчэ адны вароты на завесах «з форткай». Таксама вароты былі абсталяваны жалезным прутом (засаўкай) для замыкання, які размяшчаўся «над брамай». На другім паверсе брамы знаходзіўся пакой з печкай («комінам»). Завяршалася вежа круглым купалам-«галкай» з флюгерам-«ветравіком» у выглядзе герба Сапегаў (мал. 29, дадатак 2). Неабходна адзначыць, што своеасаблівасць перадачы тэксту ў інвентары дазваляе аўтарам уяўляць як браму, так і ўвесь замак у залежнасці ад сваіх ведаў і сваёй фантазіі.

У адным з планаў Старога Быхава замкавая брама намалявана з прыбудаванай з боку круглай вежай (мал. 30). Разам з тым у іншых вядомых планах Старога Быхава XVII–XVIII стст. разгляданая брама адлюстравана без якіх-небудзь прыбудоў. У гэтай сувязі ўяўляецца апраўданым казаць пра тое, што найбліжэйшым аналагам замкавай брамы Старога Быхава з'яўляецца захаваная да нашых дзён брама Любчанскага замка (мал. 31). Аналагічнага меркавання прытрымліваліся аўтары-

выканаўцы макета Быхаўскага замка, які захоўваецца ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі імя Е. Р. Раманава (мал. 32).



*Мал. 29. Брама замка ў Старым Быхаве. Фрагмент плана 1781 г.*[1]



*Мал. 30. План старой крэпасці Быхава, складзены паміж 1778 і 1780 гг.*[2]

---

[1] РДВГА (Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў). Ф. 349. Воп. 5. Спр. 218. Арк. 1.

[2] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. С. 119.

Злева ад брамы знаходзіўся будынак «мураванай кухні», а ў ёй — два пакоі з комінамі. На другім баку ад брамы размяшчалася такое ж памяшканне з двума пакоямі і комінамі ў кожным з іх (дадатак 2).



*Мал. 31. Брама замка ў г. п. Любча да рэстаўрацыі*



*Мал. 32. Макет Быхаўскага замка*
*(Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава)*



*Мал. 33. Замак у Старым Быхаве. Фрагмент плана 1781 г.*[1]

На восі ўезду стаяў палац, у якім верх займалі пакоі гаспадароў, а на першым паверсе размяшчаліся службовыя памяшканні (дадатак 2)[2]. Сярэдзіну яго галоўнага ўсходняга фасада фіксавала высокая шмат'ярусная вежа[3]. У сярэдзіне XIX ст. на знешніх сценах замка яшчэ можна было бачыць «розныя архітэктурныя ўпрыгожванні», а на галоўным уваходзе — «калоны дарычнага ордэра»[4].

---

[1] РДВГА (Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў). Ф. 349. Воп. 5. Спр. 218. Арк. 2.

[2] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 85–86.

[3] Чантурия Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в.: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм. Минск, 2005. С. 123–124.

[4] Путевые записки русского художника И. Захарова, собранные во время путешествия по России, Турции, Греции, Италии и Германии : Ч. [1]. Санкт-Петербург : тип. И. И. Глазунова и К., 1854. С. 121.



*Мал. 34. Замак у Старым Быхаве. Фрагмент плана 1781 г.*[1]

[1] РДВГА (Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў). Ф. 349. Воп. 5. Спр. 218. Арк. 2.

На ўзроўні другога паверха з тарца замка «ад заходу сонца» да яго сцяны прылягаў закруглены ганак «на чатырох слупах сталярнай работы» з закругленым дахам, накрытым гонтамі. Ад ганка да зямлі вялі сходы. Па баках ганка і сходаў былі ўсталяваны «парэнчы на точаных балясінах» (дадатак 2)[1].

Згодна з Панарамай Старога Быхава, да другой сцяны замка з боку касцёла прылягала вежа (мал. 35), якой ужо няма на планах горада XVIII ст. Акрамя таго, па меркаванні М. Волкава, менавіта са Старабыхаўскім замкам трэба атаясамляць будынак, што бачны на гравіраваным партрэце ўладальніка горада К. Л. Сапегі 1644 г. аўтарства В. Гондзіюса (мал. 3). М. Волкаў таксама звяртае ўвагу на прыбудову, размешчаную злева перад палацам. На думку даследчыка, гэта парахавы пограб ці арсенал, які ўзарваўся падчас штурму горада маскоўскім войскам у 1659 г.[2]. Цалкам магчыма, што пункт гледжання М. Волкава з’яўляецца правільным, бо пад партрэтам маецца надпіс «Казімір Леў Сапега — граф на Быхаве, Сапежыне і Чарнобылі, маршалак Вялікага Княства Літоўскага і г. д.». Уяўляецца, што такі запіс, са згадваннем у першую чаргу тытула «граф на Быхаве», а затым — астатніх пасад, больш лагічна рабіць пад партрэтам на фоне Старабыхаўскага замка, чым якога-небудзь іншага.




*Мал. 35. Фрагмент Панарамы Старога Быхава.*
*Справа да будынка прылягае не захаваная да нашых дзён вежа*

---

[1] Савіцкі М. Артылерыя, цэйхгаўз і замак у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 гг. // Гістарычны альманах. 2009. Т. 15. С. 57.

[2] Волкаў М. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2013. № 5. С. 23 ; Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 84.



*Мал. 36. Замак у Старым Быхаве. Фрагмент плана 1781 г.*[1]



*Мал. 37. Рэшткі роспісаў на сценах Быхаўскага замка*

Да нашых дзён не захавалася апісання ўнутранага ўбрання замка. У апошнія гады з-за вялікай колькасці вільгаці на ўнутраных сценах будынка на іх пачала адслойвацца фарба і сталі бачныя фрагменты роспісаў, як мяркуецца, XVII–XVIII стст. Цікавы той факт, што, апроч розных фігурных узораў (мал. 37), на сценах замка малявалі і гарматы (мал. 38).

[1] РДВГА (Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў). Ф. 349. Воп. 5. Спр. 218. Арк. 2.

Важным і цікавым элементам інтэр’ера замка былі печы, якія самі па сабе з’яўляліся ўпрыгожваннем унутраных памяшканняў. Усе печы ў XVII–XIX стст. былі абложаны кафляй з дэкаратыўнай «каронай» пад столлю (мал. 39).



*Мал. 38. Рэшткі роспісаў на сценах Быхаўскага замка*

У цэнтры замкавага двара знаходзілася накрытая гонтамі студня «з новым закругленым ганкам над зямлёй, з парэнчамі на точаных балясінах» (дадатак 2) [1]. Недалёка ад замка на беразе р. Макранкі знаходзіўся бровар, вакол якога на вадзе быў прыбудаваны крыты дранкай ганак даўжынёй васямнаццаць сажняў. Акрамя таго, недалёка ад замка размяшчаўся двухпавярховы свіран «з засекамі на доле і на гары», у які мяшчане і валашчане павінны былі «сыпаць правіянцкае збожжа» (дадатак 2)[2]. Гаспадары Старога Быхава клапаціліся не толькі пра ўмацаванне гарадскіх і замкавых баявых збудаванняў. Хадкевічы і Сапегі таксама садзейнічалі развіццю ў горадзе ваенных рамёстваў. Тут мелася свая добрая людвісарня — ліцейная пушкарская майстэрня. Вельмі верагодна, што, апроч памяшкання непасрэдна людвісарні, у горадзе знаходзіўся асобны будынак цэйхгаўза. Месца яго знаходжання можна вызначыць зыходзячы з аналізу Плана аблогі Быхава рускім войскам у 1707 г. (мал. 9). Паводле дадзенага дакумента, будынак пад нумарам 5 «MagazinHaus» (даслоўны пераклад — вайсковы магазін) размяшчаўся каля цэнтральнага заходняга бастыёна. Такі падыход да вызначэння месца размяшчэння цэйхгаўза, ці парахавога пограба, гарантаваў бяспеку замка ў выпадку выбуху пораху[3] і шырока ўжываўся пры будаўніцтве іншых крэпасцей таго часу. Напрыклад, у Нясвіжскім замку мураваны парахавы пограб быў збудаваны каля брамы. Пры гэтым значная частка пограба была схавана

[1] Савіцкі М. Артылерыя, цэйхгаўз і замак у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 гг. // Гістарычны альманах. 2009. Т. 15. С. 57.

[2] Там жа. С. 58.

[3] Як адзначалася раней, менавіта з-за выбуху цэйхгаўза, размешчанага на тэрыторыі замка, у 1659 г. была страчана частка памяшканняў палаца. Верагодна, пасля гэтых падзей цэйхгаўз быў пабудаваны як мага далей ад цытадэлі, што і знайшло сваё адлюстраванне на плане 1707 г.

ў земляным вале, што абараняла яго ў выпадку бамбардзіравання [1]. Названы план 1707 г. сведчыць пра тое, што парахавы пограб у Старабыхаўскай крэпасці шчыльна прылягаў да абарончага земляного вала і таксама мог быць прысыпаны зямлёй.



*Мал. 39. Ізаметрыя кафлянай печы XVII ст. замка ў Старым Быхаве (зялёнай залійкай без малюнка пазначаны элементы пячнога набору, якія сёння не знойдзены) (рэканструкцыя Н. П. Шутковай)*

[1] Волкаў М. Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. // ARCHE. 2012. № 6. С. 75.

З замка за межы горада вялі, як мяркуюць мясцовыя жыхары, падземныя хады. Па легендзе, адзін з іх вёў за Днепр. Аднак археалагічнага пацверджання гэтая гіпотэза пакуль не знайшла. Разам з тым дакументальныя гістарычныя крыніцы пацвярджаюць наяўнасць у горадзе такіх хадоў. У прыватнасці, у 1707 г. падчас чарговай аблогі Старабыхаўскай фартэцыі Петр І пісаў генералу Р. Баўэру: «Также заподлинно здесь сказывал Волович, что есть два или три подкопа у Быхова, о чем тамошними жителями подлежит разведать… и осторожность в том иметь»[1].



*Мал. 40. Кафля з выявай герба Я. С. Сапегі, знойдзеная на тэрыторыі Быхаўскага замка падчас раскопак у 2013 г.*

---

[1] Письма и бумаги императора Петра Великого. Т. 5 [январь–июнь 1707 г.]. СПб. : Государственная типография, 1907. С. 254.

У інвентары Старабыхаўскай крэпасці за 1692 г. зафіксаваны стан маёмасці яе цэйхгаўза (гл. табл. 1 і 2).

Табліца 1. Спіс артылерыі Старога Быхава за 1692 г.[1]

| **Від гарматы** | **Колькасць** | **Даўжыня ў локцях** | **Вага ядраў у фунтах («пушкарскі памер»)** |
|---|---|---|---|
| Гармата «Мурын», напалову прапілаваная, прывезеная з Вільні | 1 | –[2] | – |
| Гармата караля Жыгімонта Аўгуста | 1 | 4 ½ | 5 |
| Гарматы з гербам «Jmci Dobrodzeja», пасярэдзіне пеліканы з паднятымі крыламі, адлітая ў час губернатарства не названага па імі Юдыцкага, лафеты акаваныя, без колаў | 2 | 2 ½ | 7 |
| Гармата, па-іншаму шратоўня, новы акаваны лафет, з новымі коламі | 1 | 2 | 24 |
| Гарматы літоўскага падканцлера Казіміра Льва Сапегі з яго гербам, старыя акаваныя лафеты, без колаў | 2 | 2 ¼ | 7 |
| Гармата троцкага кашталяна Гераніма Хадкевіча з яго гербам | 1 | 3 | 2 |
| Гармата месца Вільні часоў караля Уладзіслава IV, перададзеная бурмістрамі Сянкевічам і Дубовічам | 1 | 5 | 5 |
| Гармата месца Вільні з гербам «Рудаміны» | 1 | 1 | 5 |
| Гармата з гербам караля Уладзіслава IV | 1 | 2 ½ | 6 |
| Маскоўская марціра | 1 | – | 100 |
| Гарматы венгерскага князя Ракочы | 2 | 3 ¼ | 8 |
| Гармата з інскрыпцыяй «IRS» і гербам «Снапок», добры лафет, колы акаваныя, старыя | 1 | 3 ¾ | 2 |
| Гармата з гербам «Птах нясе крыж» з каронай над гербам | 1 | 3 | 5 |
| Гармата караля «Жыгімонта II» з яго гербам, лафет нядаўна акаваны, без колаў | 1 | 3 | 1 ½ |

[1] Савіцкі М. Артылерыя, цэйхгаўз і замак у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 гг. // Гістарычны альманах. 2009. Т. 15. С. 48–51. Гэта праца выкарыстоўвалася намі для дапамогі ў перакладзе інвентара 1692 г. Аднак яе пераклад з польскай на беларускую мову праведзены непрафесійна, са шматлікімі памылкамі, у сувязі з чым у тэксце нашага выдання беларускамоўная праца М. Савіцкага будзе выкарыстоўвацца з нашымі папраўкамі. Тэкст табліц 1 і 2 можна параўнаць з фотакопіямі арыгінала згаданага інвентара (дададак 2).

[2] Няма даных у крыніцы.

| **Від гарматы** | **Колькасць** | **Даўжыня ў локцях** | **Вага ядраў у фунтах («пушкарскі памер»)** |
|---|---|---|---|
| Гармата з двума сатырамі па баках, новы акаваны лафет, без колаў | 1 | 4 | 1 ½ |
| Гарматы, на іх гербы «Страла раздвоеная, Пагоня, Грыф, Лебедзь і тры Лянткі (Łątki)» | 2 | 4 | 1 ½ |
| Гармата з гербам «Нацягнуты лук са стралой» | 1 | – | – |
| Інфлянцкая гармата, вакол Лілія Ягана Плятэра, стары акаваны лафет, без колаў | 1 | 4 ¼ | 2 |
| Палявая гармата з кавалерскім крыжыкам, новы лафет, добра акаваны | 1 | – | – |
| Гарматак палявых маскоўскіх з акаванымі лафетамі, без колаў | 8 | – | 2 |
| Гарматка, знойдзеная пад заваленай сцяной пасля выбуху цэйхгаўза, добры лафет | 1 | – | – |
| Гарматка жалезная ў цэйхгаўзе пад арганкамі | 1 | – | – |
| Марціра, адлітая ў Быхаве, пры губернатарстве не названага па імі Юдыцкага, рэчыцкага падкаморыя | 1 | – | – |
| Усяго гармат: | 34 | | |



*Мал. 41. «Арган» XVII ст.*

Цікавасць сярод іншага ў прыведзенай табліцы выклікае пункт «гарматка жалезная ў цэйхгаўзе пад арганкамі». Верагодна, тут маецца на ўвазе не месца захавання гарматкі ў цэйхгаўзе (ляжыць пад арганкамі), а адна

з разнавіднасцей аргана — шматствольнай агнястрэльнай зброі, прыведзенай на малюнку ў кнізе М. А. Ткачова «Замкі і людзі» (мал. 41)[1].

Табліца 2. «Спісанне цэйхгаўза» Старога Быхава ў 1692 г.[2]

| **Артылерыйскі і мінёрскі рыштунак** | **Колькасць** |
|---|---|
| Пораху вялікіх бочак | 7 |
| Пораху бочак меншых | 18 ½ |
| Свінцу «свіняў, як іх называюць, у адной адсечаных кавалкаў» | 19 |
| Свінцу ў вялікіх злітках у форме збанаў («ad instar» cebra lanych) | 6 |
| Свінцу «ў вялікіх трохгранных кусках» | 13 |
| Свінцу «ў штуках фунтовых плюс-мінус 50 штук» (w sztuczkach na funtów plus minus 50 sztuk) | 4 |
| Салетры барылаў | 16 |
| Галыну[3] палова салянкі[4] | ½ |
| Гранат вялікіх пустых | 125 |
| Гранат вялікіх запраўленых (zaprawnych) | 29 |
| Гранат меншых запраўленых (zaprawnych) для абароны ад штурму | 60 |
| Гранат ручных жалезных, пустых | 200 |
| Формаў драўляных точаных, для кідання гранат з рукі | 12 |
| Гранат ручных шкляных, не запраўленых | 35 |
| Гранат шкляных, запраўленых | 30 |
| Карцечных банак[5] вялікіх дзесяціфунтовых, запраўленых | 50 |
| Карцечных банак запраўленых шасціфунтовых | 59 |
| Карцечных банак трохфунтовых, запраўленых | 115 |
| Карцечных банак бляшаных чатырохфунтовых, запраўленых | 12 |

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 88.

[2] Савіцкі М. Артылерыя, цэйхгаўз і замак у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 гг. // Гістарычны альманах. 2009. Т. 15. С. 52–56.

[3] Галын, галун — падвойная сернакіслая соль алюмінію, марганцу і інш., якая ў крышталічным выглядзе выкарыстоўваецца ў тэхніцы, а таксама для спынення крывацёку пры парэзах.

[4] Салянка — бочка, у якой прывозілі соль, адзінка вымярэння сыпучых і вадкіх рэчываў.

[5] У перакладзе працы М. Савіцкага адносна карцечных снарадаў ужываецца тэрмін «ядры» (карцечныя ядры). Але неабходна адзначыць, што асновай шротавага снарада была драўляная банка (карцеч), выробленая на такарным станку, якая напаўнялася кавалкамі сечанага жалеза (глотам) ці свінцовымі кулямі і накрывалася спецыяльнай накрыўкай. У сувязі з гэтым намі ўжываецца тэрмін «банка». У сваю чаргу, у арыгінале інвентара дадзены пункт выкладзены ў наступным выглядзе: «Kartaczy zaprawionych wielkich dziesięcifuntowych».

| Артылерыйскі і мінёрскі рыштунак | Колькасць |
|---|---|
| Карцечных банак дзесяціфунтовых, пустых | 143 |
| Карцечных банак меншых, пустых | 175 |
| Гарматных ядраў вялікіх, не пасуюць да тутэйшых гармат | 1500 |
| Ядраў, «адпаведных тутэйшым гарматам, большым ці меншым па-над двухфунтовым» | 560 |
| Ядраў жалезных двухфунтовых, аблітых свінцом | 150 |
| Аркебузаў з надпісам «STANISLAVS DOVOINO» | 1 |
| Гакаўніцы з неадпаведным ложам | 38 |
| Арганкаў з мушкетных ствалоў | 8 |
| Мушкетаў кнотавых, нанова апраўленых | 88 |
| Мушкетаў з дрэннымі ложамі і без іх | 1013 |
| Кнотаў да запальвання зарадаў, вянцоў мочаных і 20 нямочаных | 100 |
| Гусарскіх блях | 6 ½ |
| Шуфляў да гарматаў[1] | 6 |
| Штурмспісаў[2] (Szturmspis) з жалезам | 1 |
| Штурмспісаў без жалеза, точаных | 6 |
| Крэйцар да гарматаў[3] | 3 |
| Крыжы драўляныя для запуску ракет | 5 |
| Стрыжань вялікі жалезны для адліву гармат | 1 |
| Стрыжані да формы для адліву гармат | 5 |
| Францілкуляў (Francilkul) драўляных, точаных | 3 |
| Пік з жалезнымі наканечнікамі | 25 |
| Дрэўкі да харугвы, адно без наканечніка | 3 |
| Кос, насаджаных проста | 15 |
| Каганцоў жалезных | 16 |
| Дамкрат для пад’ёму гармат на лафеты з ключамі і крукамі | 1 |
| Дзве формы для адліву мушкетных куль | 2 |

[1] Шуфель прызначаўся для засыпання пораху ў ствол гарматы і рабіўся з медзі, каб пазбегнуць раптоўнага выбівання іскры. У ідэале для кожнай гарматы мусіў быць свой шуфель, медная лапатка якога адпавядала калібру гарматы і на практыцы служыла меркай пораху (падрабязней гл.: Волкаў М. Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. // ARCHE. 2012. № 6. С. 78). У сувязі з гэтым незразумела, чаму ў Старым Быхаве на 34 гарматы было ўсяго 6 шуфляў. Гэты на першы погляд малаважны факт можа сведчыць аб дрэннай арганізацыі работы цэйхгаўза на момант напісання інвентара.

[2] Штурмспіс — штурмавое кап’ё (даслоўны пераклад).

[3] Крэйцар — прылада для вымання снарадаў і шпунтоў з гарматы.

*Заканчэнне табліцы 2*

| Артылерыйскі і мінёрскі рыштунак | Колькасць |
|---|---|
| Ланцугі сажневыя тоўстыя для апрацоўкі гармат (sprocowania armat) | 2 |
| Ланцугі меншыя таксама для апрацоўкі гармат | 2 |
| Бердыш маскоўскі | 1 |
| Скобы для прыбівання бярвёнаў | 3 |
| Свярдзёлак ці лапотня для высвідравання гарматных ядраў | 1 |
| Свярдзёлак жалезны доўгі ў паўтара сажня | 1 |
| Долаты шальмацкія (szelmackie) | 2 |
| Сякера | 1 |
| Шкуд (Szkud) сталярны | 1 |
| Долатаў для выдзёўбвання ўтулак у ядрах | 1 |
| Рубанкаў | 2 |
| Піл да воднага тартаку | 2 |
| Піла ручная | 1 |
| Жалезныя калёсы ці пруты да прабівання муроў | 3 |
| Свярдзёлкі такарскія | 2 |
| Рубанкі сталярскія | 2 |
| Цясак да выразання двухбаковы | 1 |
| Буксаў да гарматных ядраў | 11 |
| Вырвантаў (Wyrwantów) | 16 |
| Гваздадзёраў вялікіх і малых | 22 |
| Традынкаў (Tradynków) | 8 |
| Ярка, ці жалезная вага | 1 |
| Печэня (Pieczenia) | 1 |
| Краты жалезныя новыя, невялікія | 1 |
| Жалезная заслонка ад печы | 1 |
| Рыдлёвак для капання зямлі | 8 |
| Жалезныя лапаты для перамешвання вапны для муроў | 3 |
| Вялікіх кольцаў з прабоямі | 10 |
| Старыя жалезныя дзверы | 1 |
| Жалезныя кайданы | 2 |
| Вяроўкі вялікія новыя | 2 |

Дадаткова ў вопісе цэйхгаўза пазначана 6 тысяч цаглін, пакладзеных у Магілёўскай браме, і неабпаленая цэгла ў такой самай колькасці.

Таксама маецца запіс пра 70 тысяч «будульца» (напэўна, таксама цэгла), гатовага да ўжытку, г. зн. абпаленага (дадатак 2)[1].

Такім чынам, з прыведзеных табліц відаць, што старабыхаўскі цэйхгаўз быў даволі добра забяспечаны зброяй, боепрыпасамі і іншым рыштункам. 34 гарматы розных тыпаў на той час з'яўляліся сур'ёзным аргументам у абароне горада[2]. Напрыклад, у 1676 г. усе дзяржаўныя крэпасці ВКЛ налічвалі ўсяго 42 састарэлыя гарматы[3], а ў арсенале адной з наймагутнейшых крэпасцей ВКЛ — Нясвіжскім замку — у 1657–1658 гг. захоўваліся 32 гарматы і 2 вялікія марціры[4]. Разам з тым неабходна адзначыць, што фактычна гармат у Старым Быхаве магло быць яшчэ больш, таму што яны былі не толькі ў замку і на валах. Вядома, што ў сінагозе захоўваліся гарматы непасрэдна для яе абароны[5]. Таксама ў каталіцкім манастыры інвентар за 1745 г. зафіксаваў дзве «гарматкі спіжовыя»[6].

Акрамя таго, з інвентара 1692 г. вынікае, што ў крэпасці меліся значныя запасы пораху, волава, свінцу, салетры і жалеза. Гэта дазваляла самастойна вырабляць боепрыпасы, нават знаходзячыся ў акружэнні. Аднак 560 ядраў, адпаведных тутэйшым гарматам, і 150 ядраў жалезных двухфунтовых, аблітых свінцом, дазвалялі толькі на базавым узроўні забяспечыць боекамплект наяўнай артылерыі, таму што для адной палявой кампаніі патрабавалася каля 50 ядраў на гармату[7].

Згодна з інвентаром, у Старабыхаўскім цэйхгаўзе на выпадак, калі б жалезныя ядры скончыліся, меліся пэўныя запасы свінцу, з якога можна было адліваць гарматныя ядры і кулі для ручной агнястрэльнай зброі.

---

[1] Савіцкі М. Артылерыя, цэйхгаўз і замак у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 гг. // Гістарычны альманах. 2009. Т. 15. С. 56.

[2] Трэба адзначыць, што колькасць гармат у Старым Быхаве была даволі трывалай. Так, у 1655 г. падчас аблогі горада ў распараджэнні абаронцаў былі 4 вялікія гарматы і 26 палкавых гармат (гл.: Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 716), а ў 1707 г. – 1 гаўбіца і 35 гармат (гл.: Д. П. Бутурлин Военная история походов россиян в XVIII столетии: Ч. 1–3. Т. 1–4: в 4 кн. и атлас. СПб. : Военная типография Главного Штаба Его Императорского Величества, 1819–1823. Ч. 1: Полное описание походов Петра Великого против Шведов и Турок. Т. 2. 1820. С. 127).

[3] Рахуба А. Узброеныя сілы Вялікага Княства Літоўскага ў XVII ст. // ARCHE. 2015. № 12. С. 48.

[4] Волкаў М. Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. // ARCHE. 2012. № 6. С. 63.

[5] Материалы предварительных научно-исследовательских и проектных работ по реставрации памятника архитектуры XVII в. большой синагоги в Быхове. Минск, 1991. С. 11.

[6] НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). Ф. 2395. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 23в.

[7] Волкаў М. Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. // ARCHE. 2012. № 6. С. 74.

Разам з тым, у названым інвентары ўзгадваюцца толькі 2 формы для адліву мушкетных куль і адсутнічаюць формы для адліву ядраў.

Тут трэба адказаць на пытанне: на які час хапала пораху, што захоўваўся ў Старабыхаўскай фартэцыі? Як адзначалася ў табліцы 2, у горадзе ў 1692 г. было 7 вялікіх і 18,5 меншых бочак пораху. У невялікіх бочках змяшчалася хутчэй за ўсё 130–150 фунтаў (49–56 кг) пораху, а ў вялікіх — каля 210 фунтаў (80 кг)[1]. Усяго ж у горадзе знаходзілася каля 1 520 кг пораху. Для стрэлу з 6-фунтовай гарматы патрабавалася 3 фунты добрага мушкетнага пораху, для стрэлу з 4-фунтовай — 2[2]. Такім чынам, для стрэлу 560 ядраў, «адпаведных тутэйшым гарматам, большым ці меншым па-над двухфунтовым», якія захоўваліся ў старабыхаўскім цэйхгаўзе, патрабавалася (калі лічыць стрэлы толькі для 6-фунтовай гарматы з гербам караля Уладзіслава IV) 1 680 фунтаў пораху. Паводле сказанага, можна сцвярджаць, што ў Старым Быхаве запасы пораху лічыліся дастатковымі для забеспячэння абараназдольнасці фартэцыі. Пры гэтым трэба ўлічваць той факт, что ў цэйхгаўзе захоўваліся яшчэ 16 барылаў (малых бочак) салетры. У тым выпадку, калі дапусціць, што барыла — гэта невялікая бочка, якая ўмяшчае 130–150 фунтаў, можна вылічыць, што з такой колькасці салетры можна было вырабіць каля 625 кг пораху[3].

З ручной агнястрэльнай зброі асобна трэба адзначыць 1 101 мушкет, 8 арганаў, 38 гакаўніц, а таксама — 50 пар гусарскіх кірас. Аднак вялікая частка цяжкай стралковай зброі была не прыдатная да выкарыстання з-за «неадпаведных ці дрэнных ложаў». Тут жа меліся артылерыйскія і ручныя гранаты, якія рабіліся не толькі жалезнымі, драўлянымі («точанымі»), але і шклянымі. Шкляныя гранаты не трэба ўяўляць у выглядзе сучасных гранат «бутэлькавай» канфігурацыі. У XVII ст. яны выраблялiся з непразрыстага шкла ў форме шара з адтулінай усярэдзіне. У шар памяшчалася выбуховае рэчыва (як правіла — порах) і кнот. Падчас аблогі кнот падпальваўся, а шар скочвалі па вале насустрач праціўніку, дзе ён і ўзрываўся (мал. 42).

Верагоднасць мясцовага вырабу шкла ўскосна пацвярджаецца археалагічна: адзін з аўтараў дадзенага раздзела ў гістарычнай частцы Быхава знайшоў бутэлькавы «медальён» (кляймо) з выявай герба роду Сапегаў «Ліс». Здаецца, што гуты (майстэрні па выплаўцы шкла і па першаснай

---

[1] Падрабязней гл.: Волкаў М. Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. // ARCHE. 2012. № 6. С. 75–78.

[2] Там жа. С. 74.

[3] У пораху было каля 75 % салетры. Падрабязней гл.: Волкаў М. Артылерыя Нясвіжскага замка ў канцы XVI – пачатку XVIII ст. С. 77.

апрацоўцы балотнай руды), хутчэй за ўсё, знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай Ліпскай грывы на левым беразе Дняпра.





*Мал. 42. Шкляныя гранаты XVII ст. Такімі ж былі ўзброены абаронцы Старабыхаўскай крэпасці*

Выклікаюць цікавасць паказаныя ў інвентары 1500 «ядраў, якія не пасуюць да тутэйшых гармат». Хутчэй за ўсё, гэта ядры, знойдзеныя ў горадзе пасля вайны 1654–1667 г., выпушчаныя з гармат праціўніка падчас неаднаразовых штурмаў крэпасці.

Неабходна адзначыць, што забеспячэнне цэйхгаўза такога ўзроўню было даволі затратнай справай. Напрыклад, у Польшчы ў 1690–1691 гг. акоўка лафета шасціфунтовай гарматы каштавала каля 36 злотых. Акоўка лафета вялікай гарматы, на жаль невядомай вагі, каштавала ўжо 80 злотых з улікам матэрыялаў. Як здаецца, цэны ў Каралеўстве і Княстве былі аднолькавымі або нязначна адрозніваліся. Выраб аднафунтовага карцечнага ядра ў 1695 г. каштаваў 7 грошаў, а трохфунтовага — 10 грошаў[1]. У сваю чаргу 1 фунт пораху каштаваў каля 2 злотых[2]. Для параўнання: у 1689 г. у Магілёве 1000 цаглін каштавала 15 злотых, а добры конь — 100 злотых[3].

Зброя быхаўскіх майстроў мела попыт не толькі ў самой крэпасці. Так, у 1675 г. маскоўскі баярын А. С. Мацвееў набыў у беларускага купца

[1] Савіцкі М. Артылерыя, цэйхгаўз і замак у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 гг. // Гістарычны альманах. 2009. Т. 15. С. 56.

[2] Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях : в 3 кн. / сост. [с предисл.] и под ред. А. С. Дембовецкого. Могилев, 1882. Кн. 1. С. 174.

[3] Там жа.

Ісаева «40 копий быховских позолоченных, цена за копье по 40 алтын, 10 обушков Быховских позолоченных, цена за обушок по 1,5 рубля, наручий быховских позолоченных с мисюрками 6 пар, пара по 5 рублев, 6 буздыганов быховских же позолоченных, цена за буздыган по 5 рублев, да 4 винтовки быховские же, позолоченные, цена за винтовку по 5 рублев». А ў 1697 г. мясцовыя майстры Юрко і Мікалай па запрашэнні адлівалі вялікую гармату ў Магілёве[1].

У выніку адносна кароткага перыяду фартыфікацыйнага будаўніцтва і актыўнай арганізацыйнай працы Хадкевічаў і Сапегаў па павелічэнні абараназдольнасці Старога Быхава гэты населены пункт ператварыўся ў сапраўдны горад-крэпасць, штурм якога гарантаваў вялікія, а даволі часта непрымальныя страты для ворага. Так, калі ў 1590 г. лёгкаўзброеныя казакі без цяжкасцей захапілі горад, абнесены драўлянымі ўмацаваннямі, то ў 1648 г. падчас казацка-сялянскай вайны значна большыя казацкія атрады не змаглі гэтага зрабіць[2].

У Старым Быхаве ў другой палове XVII ст. пражывала не менш за 10 тысяч чалавек, у сувязі з чым даследчыкі адносяць яго да ліку буйных гарадоў ВКЛ[3]. Цікавым з’яўляецца той факт, што ў Мінску ў гэты час колькасць насельніцтва складала каля 2 тысяч чалавек. Для прыцягнення новых жыхароў у Стары Быхаў у 30-я гг. XVII ст. К. Л. Сапега заснаваў

---

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 85.

[2] У прыватнасці, у кастрычніку і лістападзе казацкія камандзіры Гаркуша («родам з Быхава») і Падабайла, узяўшы з сабой каля 15 харугваў, што налічвалі 6000 чалавек, напалі на Стары Быхаў. Горад абаранялі віленскі падкаморы Гіляры Чыж і камандзір пяхоты Ян Вайс. Тут таксама знаходзіліся харугвы Яна Паца. Казакі нечакана атакавалі прадмесце, дзе стаяла на варце казацкая харугва троцкага ваяводы Зыгмунта Слушкі. Харугву З. Слушкі заспелі знянацку ў момант, калі жаўнеры сядалі абедаць. Аднак большасць з іх змаглі схавацца за брамамі горада, якія своечасова зачынілі. Загінула ўсяго некалькі жаўнераў. Калі намер заняць Стары Быхаў з налёту не спраўдзіўся, казацкія камандзіры ўзяліся за аблогу. Наперадзе пагналі сялян, якія неслі перад сабой на звязаных жэрдках мяшкі, напоўненыя зямлёй. З іх перад валамі горада ўзвялі ўмацаванні «накшталт тэрасы». Схаваўшыся за імі, казакі абстрэльвалі абаронцаў. Тым часам пад прыкрыццём агню самапалаў казакі з нечуванай мужнасцю і зацятасцю ўзбіраліся па драбінах на валы. Калі іх адбівалі, яны спрабавалі падкапацца пад брамы і, напэўна, падарваць іх. У сваю чаргу абаронцы самі рабілі вылазкі за муры крэпасці. Падчас адной з іх яны падпалілі прадмесце, так што казакам давялося з яго адыходзіць. Гаркуша і Падабайла збіраліся аднавіць атакі на Стары Быхаў 24 снежня, паклікаўшы на дапамогу з Чарнігаўшчыны аддзелы палкоўніка Грыцкі Бутага. Аднак, атрымаўшы звесткі, што на дапамогу абложаным ідзе князь Рыгор Юрый Друцкі-Горскі на чале 5 павятовых аршанскіх харугваў і 6 харугваў полацкага ваяводства, казакі адступілі (Бярнацкі В. Паўстанне Хмяльніцкага: ваенныя дзеянні ў Літве ў 1648–1649 гг. [Вільня : Інстытут беларусістыкі ; Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства], 2010. С. 26–27).

[3] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975. С. 36, 39.

за Дняпром слабаду і назваў яе ў свой гонар Лявонаўкай[1]. Новыя жыхары гэтай слабады ў 1638 г. былі пазбаўлены ад выплаты падаткаў і выканання павіннасцей на 14 гадоў[2]. Аднак у выніку разбуральных войнаў другой паловы XVII – пачатку XVIII ст. колькасць жыхароў у горадзе значна паменшылася[3].

У горадзе пры Сапегах пастаянна знаходзіўся невялікі гарнізон, які складаўся з наймітаў. У выпадку ваеннай пагрозы колькасць салдат павялічвалася[4]. Для забеспячэння іх дзейнасці ў Старым Быхаве працавалі розныя рамеснікі. Так, у 2016 г. у паўночнай гістарычнай частцы горада сярод іншага матэрыялу канца XVI – пачатку XVII ст. на вельмі невялікай плошчы знойдзена больш за 25 даволі аднатыпных асобнікаў падковак для абутку, што дае падставы гаварыць пра наяўнасць тут майстэрні па вырабе і рамонце абутку. Больш за тое, 19 падковак вертыкальныя і плоскія з падквадратным сячэннем і маюць сляды інтэнсіўнага выкарыстання. Знаходка такіх падковак у азначаным перыядзе не характэрна для Падняпроўя, у сувязі з чым можна гаварыць пра тое, што гэта майстэрня абслугоўвала як мяшчан, так і наёмных жаўнераў, архітэктараў і разнастайных спецыялістаў з Заходняй Еўропы, якія «занеслі» сюды новую моду.

Стары Быхаў меў ваенную арганізацыю мяшчан, прынятую ва ўсіх прыватных гарадах ВКЛ таго часу. Служба ў гэтым дапаможным фарміраванні вынікала з усеагульнага абавязку абароны ў выпадку пагрозы гораду

---

[1] Месца заснавання слабады Лявонаўкі не высветлена. У раёне Старога Быхава пойма і берагі Дняпра вельмі нізкія, у сувязі з чым вясновыя павадкі тут вельмі вялікія, што не дазваляе будаваць уздоўж ракі жылыя будынкі. Верагодна, гаворка тут ідзе пра заснаванне нейкага новага населенага пункта, размешчанага на адной з пяшчаных грыў на левым беразе Дняпра. Згодна з тапаграфічнымі картамі Чырвонай Арміі за 1926 і 1936 гг., на ўсход ад возера Броннае размяшчаўся хутар Ліпецкая Грыва. Мабыць, на гэтым месцы і была закладзена Лявонаўка.

[2] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975. С. 49, 50.

[3] Неабходна адзначыць, што значна паменшылася не проста колькасць насельніцтва. Яно вельмі зменшылася якасна, што пацвярджаецца данымі археалогіі. Так, частка керамікі другой паловы XVII ст., знойдзеная ў гістарычнай частцы Быхава, уяўляе сабой начынне з чырвонай гліны, без аздаблення і з вялікай колькасцю жарствы (асабліва добра гэта прасочваецца на матэрыялах, атрыманых з траншэі каля Храма Святой Жываначальнай Тройцы (Юр’еўская слабада)). Даволі дрэнная ў параўнанні з больш ранім начыннем якасць вырабаў, поўная адсутнасць аздаблення і жарства ў цесце дэманструюць заняпад вытворчасці керамічнага посуду. Гэтыя матэрыялы залягалі над слаямі пажарышчаў і па нумізматычным матэрыяле датуюцца 1650–1660 гг. і не выходзяць за 1731 г., астатні суправаджальны матэрыял датуе такі посуд 1650–1670 гг. Акрамя таго, у гэты перыяд прасочваецца скарачэнне выпадання ў культурны слой дарагога шклянога посуду.

[4] Бабятыньскі К. Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654–1655 гг.) // ARCHE. 2008. № 7–8. С. 274.

і была падрабязна рэгламентавана магнатам [1]. Вайсковая дзейнасць мяшчан падлягала кампетэнцыі магістратаў і войтаў, якія прызначалі камандзіраў падраздзяленняў[2]. У выпадку баявых дзеянняў у якасці такіх камандзіраў выступалі афіцэры гарадскіх гарнізонаў[3]. Кожны мешчанін Старога Быхава павінен быў мець зброю. Паводле крыніц, у XVIII ст. ад быхаўцаў патрабавалася наяўнасць менавіта агнястрэльнай зброі — пішчалі[4]. Яўрэйскі ж атрад, прызначаны выключна для абароны сінагогі, як адзначалася, меў яшчэ і гарматы[5]. Мяшчане прыватных гарадоў павінны былі браць удзел у вайсковых вучэннях і абароне горада ў складзе сталых вайсковых адзінак, сфарміраваных па тэрытарыяльным і сацыяльным прынцыпах[6]. У Старым Быхаве, як і ў іншых прыватных гарадах, базавымі арганізацыйнымі адзінкамі мяшчанскага гарнізона былі «сотні» і «дзясяткі», якімі камандавалі «сотнікі» і «дзясятнікі»[7]. Трэба адзначыць, што соценнае і дзесяціннае дзяленне насельніцтва гарадоў у большасці народаў Еўропы сваімі каранямі сыходзіць углыб вякоў, у эпоху ваеннай дэмакратыі[8]. Кожнаму падраздзяленню быў загадзя вызначаны ўчастак гарадскога вала для абароны. Згодна з данымі за 1655 г., у Старым Быхаве 2 тысячы мяшчан і 1 тысяча яўрэяў[9], а таксама 600 наёмных жаўнераў, 200 гайдукоў, 100 драгуноў, каля 300 чалавек шляхты з іншых гарадоў служылі пад 21 харугвай[10]. Непасрэдна жыхары Старога Быхава былі

---

[1] Рахуба А. Узброеныя сілы Вялікага Княства Літоўскага ў XVII стагоддзі // ARCHE. 2015. № 12. С. 39.

[2] Там жа.

[3] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975. С. 221.

[4] Там жа. С. 228.

[5] Материалы предварительных научно-исследовательских и проектных работ по реставрации памятника архитектуры XVII в. большой синагоги в Быхове. Минск, 1991. С. 11.

[6] Рахуба А. Узброеныя сілы Вялікага Княства Літоўскага ў XVII стагоддзі // ARCHE. 2015. № 12. С. 39.

[7] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 446 ; Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975. С. 222, 226.

[8] Ткачев М. А. Организация обороны городов Белоруссии XIV–XVIII вв. : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.06. Минск, 1987. С. 17.

[9] Хутчэй за ўсё, тут маюцца на ўвазе толькі ўзброеныя і баяздольныя жыхары горада.

[10] Бабятыньскі К. Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654–1655 гг.) // ARCHE. 2008. № 7–8. С. 274.

аб'яднаны ў 17 харугваў[1]. Такая колькасць гарадскіх падраздзяленняў з'яўлялася даволі вялікай для таго часу.

Як сведчыць інвентар Старога Быхава 1692 г., павятовая старабыхаўская шляхта, «паводле даўняга звычаю», раз на год у дзень Святога Мікалая, г. зн. 6 снежня, станавілася на «попіс» перад камендантам крэпасці — «губернатарам». Гэта ж рабілі і «паны мяшчане… з харугвамі, бубнамі і зброяй» (дадатак 1)[2]. Акрамя непасрэдна попісаў, быхаўцы пад кіраўніцтвам сваіх камандзіраў павінны былі таксама прымаць удзел у вайсковых вучэннях[3]. Збор гарадскога апалчэння ў ВКЛ праходзіў па сігнале трывогі. Звычайна гэта быў стрэл з гарматы, барабанны бой ці стук у гарадскія бубны. Ухіленне ад вайсковай павіннасці каралася грашовымі штрафамі[4].

Усе жыхары «места», «паводле звычаю», займаліся фартыфікацыйнымі работамі: ад вясны да замаразкаў «валы і зямлю сыпаць павінны былі за дазорам і загадам Яго Мосці Пана губернатара». Быхаўская воласць, таксама «паводле звычаю», скончыўшы сеяць яравыя, «па загаду… губернатара» была абавязана выконваць валавую работу. Разам з тым, і падчас палявых работ жыхары навакольных вёсак маглі быць прыцягнутыя да «сенакосу для засыпання рова» (дадатак 2). Хутчэй за ўсё, тут гаворка ідзе пра засыпанне дна і сцен абарончага рова слоем лёну для запаўнення затым яго вадой, пра што гаворка ішла раней.

Пасля ўваходжання Усходняй Беларусі ў склад Расійскай імперыі Стары Быхаў некаторы час быў аб'ектам пільнай увагі з боку расійскіх ваенных, бо новая мяжа паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай прайшла па тэрыторыі цяперашняга Быхаўскага раёна па р. Друць. Цікавым з'яўляецца той факт, што в. Балонаўка знаходзілася тады ў «Беларусі», а в. Чачэвічы ўжо была першым населеным пунктам «Літвы»[5]. Гэтыя абставіны паслужылі падставай для вывучэння абарончых магчымасцей Старога Быхава з мэтай іх далейшага ўдасканалення. Менавіта таму ваенныя інжынеры старанна вывучалі забудову горада і складалі шматлікія яго планы, якія цяпер захоўваюцца ў Маскве. На падставе праведзеных даследаванняў рыхтаваліся праекты палепшанай абарончай сістэмы горада. Паводле аднаго з такіх

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 467.

[2] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 86 ; Савіцкі М. Артылерыя, цэйхгаўз і замак у крэпасці Стары Быхаў у 1692–1707 гг. // Гістарычны альманах. 2009. Т. 15. С. 57.

[3] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975. С. 226.

[4] Там жа.

[5] Генеральная карта губернии Могилевской. Могилев, 1777.

планаў, гістарычную частку горада прапанавалася прывесці да веернай сістэмы: вуліцы сыходзяцца да замка, пры якім арганізоўваецца прамавугольная плошча-«плацдарма» (мал. 43)[1]. Акрамя таго, на дадзеным праекце выразна відаць, што бастыёны і валы дапаўняліся другой лініяй абароны, а пасярэдзіне рова ў выглядзе астравоў размяшчаліся равеліны.



*Мал. 43. Праект рэканструкцыі крэпасці Быхава 1778 г.*

Для вывучэння на месцы абарончых магчымасцей крэпасцей у Беларусь быў накіраваны вядомы арганізатар ваеннай справы, дасведчаны ваенны інжынер Ф. В. Баўр. У сваім дакладзе 1782 г. Кацярыне II асноўнымі прынцыпамі пры выбары месца для збудавання крэпасцей ён называў:

знаходжанне крэпасці на скрыжаванні вялікіх паштовых дарог і асноўных водных гандлёвых шляхоў;

максімальнае набліжэнне да руска-польскіх меж;

адсутнасць вакол планаванай крэпасці значных вышынь, дастатковых для агляду і абстрэлу ўмацаванняў;

памеры новай крэпасці павінны быць невялікія і адпавядаць умовам размяшчэння нешматлікага вайсковага гарнізона і правіянцкіх складоў на выпадак уварвання непрыяцеля, а таксама ўмове эканомнага выкарыстання сродкаў на будаўніцтва;

выключэнне жылой забудовы на ўнутраных тэрыторыях умацаванняў, паколькі падчас вайны жыхары горада падвяргаліся б

[1] Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. Минск, 1992. С. 68, 70.

асаблівай небяспецы, а ў мірны час запатрабаваўся б вялікі ваенны гарнізон для ўзорнага ўтрымання крэпасці[1].

На заходніх межах Расійскай імперыі прапанавалася заснаваць дзве галоўныя крэпасці: новую каля «места» Будзілава і рэканструяваную ў Старым Быхаве. Пры апошняй на выгоднай гары каля Рагачова планавалася «пабудаваць цытадэль ці невялікае ўмацаванне, якое магло прыкрываць перавоз па Дняпры і Друці». Паміж галоўнымі крэпасцямі патрабавалася размясціць меншыя крэпасці ў Талачыне, Дрысе і Дынабургу[2]. Аднак далейшыя падзелы Рэчы Паспалітай зрабілі рэалізацыю гэтых планаў немэтазгоднай, бо мяжа Расійскай імперыі адсунулася далёка на захад да Брэста. Таму Стары Быхаў страціў сваё значэнне горада-крэпасці, а яго ўмацаванні паступова прыйшлі ў заняпад і былі разбураны. У першай палове XIX ст. мясцовыя жыхары разрылі бастыёны і курціны, а ў другой — разабралі на цэглу ўязныя брамы. Пасля Вялікай Айчыннай вайны пры будаўніцтве насыпу для старога моста праз Днепр у раёне Мікіцінскага спуску быў цалкам знішчаны вуглавы паўднёвы паўбастыён. У 60-я гг. XX ст. ужо для пабудовы новага жалезабетоннага моста праз Днепр знішчаецца апошні ўцалелы вал, які размяшчаўся на месцы будынка цяперашняга раённага цэнтра культуры. У гэты ж час разбураецца будынак касцёла. У выніку сёння ў абліччы Быхава не надта многа гаворыць пра яго яркае ваеннае мінулае, зараз гэта сярэднестатыстычны горад, нічым не адметны сярод дзясяткаў такіх жа малых гарадоў.

---

[1] Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. Минск, 1992. С. 71, 72.

[2] Там жа. С. 72.

## Раздзел 3

# ГОРАД-ГЕРОЙ XVII ст.: СТАРЫ БЫХАЎ У ВАЙНЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ З РУСКІМ ЦАРСТВАМ 1654–1667 гг.

XVII ст. прызнаецца даследчыкамі еўрапейскай гісторыі стагоддзем палітычнага і эканамічнага крызісу. Прафесар Ралан Мунье лічыць, што перыяд з 1598 па 1715 г. можна ахарактарызаваць як «стагоддзе ўсеагульнага крызісу», бо яно ахапляе эканамічны, фінансавы, дэмаграфічны, палітычны, дыпламатычны і інтэлектуальны складальнікі ўсіх цывілізацый. Аб нестабільнасці ў гэтым стагоддзі ў Еўропе сведчыць той факт, што мірнымі ў ім былі толькі чатыры каляндарныя гады запар. Дэстабілізацыя міждзяржаўных зносін, што пачалася ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, ваенныя дзеянні і акупаванне зямель закранулі амаль усе дзяржавы і народы гэтага рэгіёна[1]. На жаль, не засталося ў баку ад гэтых працэсаў і ВКЛ, якое спазнала ў названым стагоддзі, верагодна, самую разбуральную вайну ў сваёй гісторыі — вайну Рэчы Паспалітай з Рускім царствам 1654–1667 гг. У расійскай і савецкай гістарыяграфіі гэтую вайну звалі руска-польскай, што не адпавядае яе сутнасці. Бясспрэчна, маскоўскія і ўкраінскія войскі вялі баі і з польскімі падраздзяленнямі, аднак большасць гэтых сутычак мела месца ў Каралеўстве Польскім (у сучаснай Украіне). Разам з тым асноўны тэатр ваенных дзеянняў размяшчаўся ў ВКЛ — на тэрыторыі сучаснай Беларусі. І бітвы з маскоўскім войскам і ўкраінскімі казакамі на гэтых землях у большасці выпадкаў вяло войска Вялікага Княства.

Гэтая вайна прынесла нечуваныя спусташэнні на нашу зямлю. У выніку баявых дзеянняў, а таксама выкліканых імі голаду і хвароб на тэрыторыі сучаснай Беларусі, па падліках некаторых гісторыкаў, загінула 53 % насельніцтва[2]. Многія гарады і мястэчкі былі сцёртыя з твару зямлі, у многіх выпадках — разам з жыхарамі, а частка гэтых паселішчаў знікла назаўжды. У прыватнасці, горад Казімір у Гомельскай вобласці пасля названых падзей быў «ізноў адкрыты» толькі ў XXI ст.[3]. Найбольшыя страты панеслі ваяводствы і паветы, якія былі захоплены, або тыя, у якіх адбываліся ваенныя дзеянні. Да такіх ваяводстваў належалі Полацкае

[1] Ціла А. Скарб Вялікага Княства Літоўскага падчас Дваццацігадовай вайны (1648–1667 гг.) ; пер. з літ. мовы Алеся Мікуса. Смаленск : Інбелкульт, 2015. С. 13.

[2] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667 [Электронны рэсурс]. URL: http://knihi.com/sahanovic/vajna.html (дата звароту: 24.01.2016).

[3] Махавікова Г. Старажытны горад сапраўды існаваў [Электронны рэсурс]. URL: http://tv.sb.by/gistoryya/article/starazhytny-gorad-sapra-dy-snava.html (дата звароту: 31.07.2016).

(засталося 14,6 % дымоў), Віцебскае (засталося 29,3 % дымоў), Інфлянцкае (засталося 30,5 % дымоў) і Менскае (засталося 42,5 % дымоў)[1].

Традыцыйна Рэч Паспалітая да вайны аказалася не гатовая, хоць кіраўніцтва дзяржавы пра падрыхтоўку да яе свайго ўсходняга суседа выдатна ведала. Эліта дзяржавы — шляхта і магнаты — пераважна лічылі за лепшае дыскутаваць на соймах і змагацца адзін супраць аднаго. Найбольш красамоўным сведчаннем злачыннай нядбайнасці кіруючых вярхоў з’яўляецца той факт, што Смаленск, званы «брамай у Вялікае Княства Літоўскае», да ўдару асноўных сіл непрыяцеля стаў рыхтавацца толькі за пяць месяцаў да пачатку яго аблогі. Аднак гэтага часу для горада было вельмі мала. Вось што адзначалася ў складзеным тады інвентары Смаленска: «Гэтая памежная крэпасць на працягу 20 гадоў заставалася без усялякага догляду; абодва валы… былі цалкам зрытыя; крэпасны мур у многіх месцах да зямлі меў расколіны такія вялікія, што праз некаторыя мог свабодна пралезці чалавек. Два кавалкі сцяны забітыя глінай, залеплены граззю і зверху пабелены». А з 34 вежаў толькі 10 былі ў нармальным стане[2]. Прыкладна ў такім жа стане знаходзіліся і іншыя памежныя крэпасці ВКЛ — Дынабург, Полацк, Віцебск і Мсціслаў. Стан Аршанскай фартэцыі, якая павінна была прыкрываць цэнтральныя землі Вялікага Княства на захад ад Смаленска, у 1654 г. можна ахарактарызаваць як трагічны. 68 сажняў замкавага муру абваліліся, не стала таксама адной з брам і некалькіх вежаў. Зубцы на замкавых мурах былі абламаныя, а ў частаколе трапляліся нават дзіркі ў некалькі метраў[3].

Для бліскучай перамогі над войскам маскоўцаў і іх саюзнікаў, украінскіх казакоў, якое налічвала 60–80 тысяч салдат, шляхта дазволіла павялічыць армію ВКЛ усяго да 15 тысяч чалавек. Калі пагадзіцца з Ю. Можам, які ацэньвае колькасць насельніцтва ВКЛ у 1650 г. прыкладна ў 4,5 мільёнаў чалавек, то мабілізацыя азначанай колькасці ваяроў не была надта вялікім намаганнем, бо гэтая лічба складала каля 0,5 % усяго насельніцтва[4]. Акрамя таго, у Вялікім Княстве нават вялікага гетмана не прызначылі. Чарговы сойм Рэчы Паспалітай, які павінен быў вырашыць нарэшце гетманскае пытанне, збярэцца ў Варшаве аж 9 чэрвеня 1654 г.

---

[1] Ціла А. Скарб Вялікага Княства Літоўскага падчас Дваццацігадовай вайны (1648–1667 гг.) ; пер. з літ. мовы Алеся Мікуса. Смаленск : Інбелкульт, 2015. С. 317–318.

[2] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. Т. 14. Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1904. С. XIII.

[3] Бабятыньскі К. Падняпроўскія крэпасці ў сістэме абароны ўсходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага – XVI – палова XVII стагоддзя // ARCHE. 2014. № 12. С. 298–299.

[4] Рахуба А. Мабілізацыйны высілак ВКЛ падчас вайны 1654–1667 гг. // Беларускі гістарычны агляд. 2008. Т. 15. Сш. 1/2. С. 150, 152.

Пры гэтым толькі 18 чэрвеня Януш Радзівіл атрымае ад караля булаву вялікага гетмана, фактычна праз тры тыдні пасля пачатку вайны.

15 траўня 1654 г. армія Рускага царства пры падтрымцы ўкраінскіх казакоў распачала баявыя дзеянні супраць ВКЛ. Гэтая армія складалася з трох груповак. Першая групоўка ваяводы князя В. Шарамецева налічвала каля 15 тысяч чалавек[1] і пачынала наступ з Вялікіх Лук на Невель, Полацк, Віцебск ды іншыя гарады Падзвіння. Паўднёва-заходняя групоўка пад камандаваннем ваяводы князя А. Трубяцкога мусіла рушыць з Бранска на Рослаў, Мсціслаў і Барысаў. Цэнтральнай групоўцы, сабранай у Маскве, адводзілася галоўная мэта: авалодаць стратэгічнай фартэцыяй — Смаленскам. Гэтае злучэнне налічвала каля 40 тысяч ратнікаў[2]. Кіраваць ім браўся сам цар — Аляксей Міхайлавіч. Для дапамогі маскоўскаму войску казацкі гетман Багдан Хмяльніцкі з Украіны выслаў у ВКЛ прыкладна 20 тысяч казакоў[3] Нежынскага, Чарнігаўскага і Старадубскага палкоў на чале з наказным гетманам Іванам Залатарэнкам. Казакам даручалася дзейнічаць уздоўж Дняпра і Сожа — ударыць у фланг непрыяцелю, захапіць Гомель, Чачэрск, Прапойск, Стары Быхаў, Магілёў. Украінцы планавалі стварыць на захопленай тэрыторыі казацкую адміністрацыю і з цягам часу далучыць землі сучаснай паўднёва-ўсходняй Беларусі да Украіны. Гэтыя планы затым прывядуць да ўзброенага сутыкнення казакоў і маскоўскіх войскаў.



*Мал. 44. Маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч*

Вайна раскалола ВКЛ на тры лагеры: частка насельніцтва са зброяй у руках устала на абарону дзяржавы, іншыя з пачуцця помсты за рэлігійны

[1] Малов А. В. Русско-польская война 1654–1667 гг. М. : Цейхгауз, 2006. С. 15.

[2] Там жа. С. 15, 16.

[3] Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. М. : Издательство Москов. ун-та, 1974. С. 37 ; Малов А. В. Русско-польская война 1654–1667 гг. М. : Цейхгауз, 2006. С. 16.

прыгнёт з боку каталіцкіх вярхоў, а таксама з-за жадання захаваць сваё жыццё ці маёмасць перайшлі на бок маскоўцаў, а трэція «запісаліся» ў рады ўкраінскіх казакоў. Усе тры лагеры зацята знішчалі сваіх супернікаў, а таксама ўсіх тых, хто мог мець (нават у будучыні) хоць нейкае дачыненне да падтрымкі апанентаў. Так, напрыклад, выразаліся цэлыя вёскі, у якіх «палітычныя праціўнікі» маглі атрымаць, у тым ліку сілай, ежу і фураж. Акрамя таго, частка жыхароў ВКЛ з розных пластоў грамадства ўступала ў шматлікія добраахвотніцкія харугвы, якія, у асноўным, замест абароны дзяржавы займаліся банальным рабаваннем насельніцтва і спусташэннем уласнага краю[1].




*Мал. 45. Вайна 1654–1667 гг.*

Маскоўскія войскі і казакі ўжывалі крывавую, але дзейсную тактыку ўзяцця гарадоў: у выпадку, калі насельніцтва горада не здавала яго

---

[1] Бабятыньскі К. Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654–1655 гг.) // ARCHE. 2008. № 7–8. С. 253.

добраахвотна і не прыносіла прысягу на вернасць Аляксею Міхайлавічу, салдаты армій уварвання пасля захопу населенага пункта ўсіх яго жыхароў, уключаючы старых і немаўлят, «выразалі», а горад спальвалі. Такі лёс спасціг Мсціслаў, Брэст і іншыя гарады ВКЛ. Пры гэтым на канфесію людзей ніхто не глядзеў: знішчаліся праваслаўныя, уніяты, каталікі і іўдзеі, хаця пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі гэтую вайну назавуць «рукой дапамогі прыгнечанаму братэрскаму праваслаўнаму народу». Акрамя таго, з захопленых зямель углыб Рускага царства вывозіўся «ненадзейны элемент» — катэгорыі насельніцтва, якія ў будучыні маглі падняць мяцеж супраць новай адміністрацыі, а таксама рамеснікі і іх сем'і. Усё гэтае пекла дапаўнялі марадзёрскія дзеянні ўсіх трох ваюючых бакоў. Пры гэтым стаўленне арміі ВКЛ да свайго насельніцтва ў большасці выпадкаў не вельмі адрознівалася ад паводзін ворагаў. Менавіта таму многія гарады, такія як Магілёў, здаваліся на літасць захопнікаў, а затым, баючыся адплаты, адбіваліся ад шалёных нападаў войска Вялікага Княства.

13 жніўня 1654 г. пасля аблогі, якая доўжылася больш як паўтара месяца, Гомель адкрыў сваю браму казакам І. Залатарэнкі. Гомельскі гарнізон, які пераможцы хацелі знішчыць, уратаваўся — уцёк у Стары Быхаў. Пасля Гомеля казакі працягнулі наступ на поўнач і 29 жніўня захапілі Чачэрск. Пры гэтым «противных мечю предали, а иных, на слезы их смотря, живых оставили»[1]. Некалькі дзясяткаў вайскоўцаў з чачэрскага гарнізона, таксама як гомельцы, уцякалі да Старога Быхава, але іх усіх перабілі перад самым Быхавам. У палон захапілі аднаго князя Тышкевіча, з-за якога «рыцерев добрых немало полегло», і адаслалі цару. Тады ж казакамі быў захоплены Прапойск. Новы Быхаў без бою прыняў прысягу на вернасць цару[2].

У XVII ст. Новы Быхаў, з насельніцтвам прыблізна ў 2 тысячы жыхароў, належаў сям'і Слушкаў. Горад і замак мелі трывалыя, хоць дзесьці ўжо і састарэлыя, драўляна-земляныя ўмацаванні, з прамавугольнікам 560x370 м у плане. Як і Стары, Новы Быхаў быў размешчаны на высокім дняпроўскім беразе. Дэталі фартыфікацыі горада апісаў удзельнік яго аблогі ў студзені–лютым 1655 г. канюшы літоўскі Багуслаў Радзівіл: «З аднаго боку, з якога шырока ў раўніну цягнуцца палі, [месца] было аперазана валам, другі бок баранілі плынная рака Днепр, а яшчэ моцныя штыкеты, частаколы і тоўстыя дубы». Для паспяховай абароны горада яго

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 148.

[2] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667 [Электронны рэсурс]. URL: http://knihi.com/sahanovic/vajna.html (дата звароту: 24.01.2016).

неабходна было ўкамплектаваць шматлікай пяхотай і моцнай артылерыяй. На жаль, Слушкі, хоць і належалі да найбуйнейшых землеўласнікаў Паўднёвай Беларусі, не маглі забяспечыць належныя сілы для абароны сваёй маёмасці. Абмежаваная ў грашовых сродках, у 1654 г. сям'я не наняла ніводнага прыватнага аддзела. Калі выявілася, што ў Новы Быхаў не будуць скіраваны кампутовыя войскі, яго абаронцамі зрабіліся, апрача мяшчан, толькі навакольная шляхта ды сяляне. Гэта цалкам пазбаўляла мажлівасці наладзіць які-ніякі супраціў[1].

Без бою ў той час ворагу здалася большая частка гарадоў усходняй часткі ВКЛ: Невель, Полацк, Чавусы і інш. 28 жніўня 1654 г. капітуляваў Магілёў. Цяпер, апроч Смаленска, Дуброўны і Старога Быхава, у Падняпроўі не заставаўся няскораным ні адзін горад[2].

Капітуляцыя Магілёва перад маскоўскімі сіламі, а не перад украінскімі казакамі стварыла пагрозу для планаў І. Залатарэнкі па далучэнні паўднёва-ўсходніх зямель цяперашняй Беларусі да ўкраінскай казацкай дзяржавы, бо гэты горад уяўляў сабою найбуйнейшы ваенны і эканамічны цэнтр сярэдняй плыні Дняпра. Таму гетман вырашыў любымі сродкамі авалодаць Старым Быхавам, які пасля можна было выкарыстоўваць як важны вузел абароны. Стары Быхаў, разам з Гомелем, бачыўся нежынскаму палкоўніку цэнтрам казацкай Беларусі, падпарадкаванай Б. Хмяльніцкаму. Аблога старабыхаўскай фартэцыі пачалася недзе ў перыяд з 29 жніўня па 3 верасня 1654 г. Такое меркаванне грунтуецца на тым, што



*Мал. 46. І. Залатарэнка*

[1] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654–1655) [Электронны рэсурс]. URL: http://www.belhistory.eu/konrad-babyatynski-stary-i-novy-byxa%D1%9E-u-chas-vajny-rechy-paspalitaj-z-maskvoj-1654-1655/ (дата звароту: 15.09.2016).

[2] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667 [Электронны рэсурс]. URL: http://knihi.com/sahanovic/vajna.html (дата звароту: 24.01.2016).

29 жніўня казакі захапілі Чачэрск, а 3 верасня І. Залатарэнка ўжо дакладваў цару аб аблозе Старога Быхава[1].

У гэты ж час працягвалася аблога Смаленска. Нягледзячы на тое, што з боку кіраўніцтва Рэчы Паспалітай гораду фактычна не аказвалася дапамога, ён зацята трымаў абарону. Аляксей Міхайлавіч запатрабаваў ад І. Залатарэнкі, каб той перакінуў яму на дапамогу свае атрады. Аднак, як ужо адзначалася, у казацкага гетмана былі свае планы адносна вайны ў ВКЛ, а страта для казакоў Магілёва наогул адбіла ў І. Залатарэнкі жаданне рэальна дапамагаць маскоўцам. Таму ў лісце да цара Аляксея Міхайлавіча ён пісаў: «…в том Быхове шляхты не мало и служилых людей и волощане, до того ж места належачие, заперлися и вашему царскому величеству поклонится не хотят. Видя мы таковую их гордыню и непокорение дьявольское... осадили… их войсками...». Акрамя гэтага, немагчымасць свайго прыбыцця да Смаленска І. Залатарэнка тлумачыў просьбамі жыхароў і валашчан Новага Быхава не кідаць іх, бо апошнія сцвярджалі, што пасля сыходу казакоў быхаўцы «…ни одного живого как в Быхове Новом, також и в волости…» не пакінуць[2]. Што, у прынцыпе, было праўдай, бо ў вачах абаронцаў Старога Быхава навабыхаўскія валашчане былі здраднікамі.

На фоне агульнага поспеху царска-казацкіх войскаў праблемы са Старым Быхавам прыцягнулі ўвагу і самога Аляксея Міхайлавіча, які пры сустрэчы 27 верасня пад Смаленскам з І. Залатарэнкам аддаў яму загад: «Промышляти над Старым Быховым сколко милосердный Бог помощи подаст»[3].

Аднак гэты горад і не збіраўся здавацца. Гаспадар Старога Быхава Казімір Леў Сапега перад аблогай прыклаў усе намаганні, каб належна падрыхтаваць сваю найбуйнейшую цвердзь да абароны. Ён забяспечыў крэпасць моцнай артылерыяй, запасамі правіянту і ўвёў у яе шматлікую залогу. Апрача быхаўскіх мяшчан, да абароны ў вялікай колькасці далучылася навакольная шляхта, а таксама сяляне сапегавых уладанняў, перадусім з Талачына і Бялыніч. Паводле сведчанняў палонных, якія абаранялі горад і трапілі ў рукі казакоў, у снежні 1654 г. у скляпах заставаліся рэзервы хлеба і солі мінімум на год. Залогу складалі 2 тысячы мяшчан, 600 наёмных жаўнераў, 200 гайдукоў, 100 драгуноў, каля 300 чалавек шляхты з іншых гарадоў (найперш уцекачы з Гомеля), а таксама 1 тысяча

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 147–148.

[2] Там жа.

[3] Там жа. С. 174.

яўрэяў. А згодна з ацэнкамі кіраўніка абароны Канстанціна Багушэвіча, у ліпені ў Старым Быхаве знаходзіліся 3 тысячы чалавек, якія служылі пад 21 харугвай. Тады да крэпасці яшчэ не дайшла абяцаная Казімірам Львом немецкая пяхота, якая далучылася да абаронцаў да пачатку аблогі. Артылерыя горада налічвала, паводле звестак за 1655 г., 4 цяжкія гарматы і 26 палявых[1].

І. Залатарэнка добра ўсведамляў, што яго падначаленыя ніколі не бралі такой трывалай фартэцыі. Казакі мелі не больш за 30 гармат разам з гарматамі, захопленымі ў верасні ў Гомелі ды Чачэрску. Але практычна ўсе яны былі невялікага калібру. Гэтага, відавочна, было мала, каб стварыць пралом у земляных фартыфікацыях бастыённага тыпу. Таму І. Залатарэнка вельмі хутка адмовіўся ад плана здабыць горад генеральным штурмам і абмежаваўся блакадай і лакальнымі нападамі. Разлік быў не на згаладаласць залогі, а хутчэй на добраахвотную капітуляцыю гарнізона, пазбаўленага надзеі на дапамогу[2].

Аднак, нягледзячы ні на што, абаронцы не хацелі паўтараць лёс іншых беларускіх гарадоў і капітуляваць не збіраліся. Больш за тое, ад пачатку аблогі быхаўцы не чакалі пасіўна, што зробіць праціўнік. Яны стараліся шматлікімі вылазкамі паралізаваць падначаленых І. Залатарэнкі і нанесці ім як мага больш адчувальныя страты. Пра адзін з такіх выпадкаў, які адбыўся 2 кастрычніка 1654 г., мы можам даведацца са сведчання казака Нежынскага палка Лаўрына Шылы, пазней узятага ў палон войскам ВКЛ у Вяляцічах каля Барысава. Як вынікае са слоў Шылы, казакі стаялі пад цвердзю чатырма табарамі. З поўначы, каля Магілёўскай брамы, размяшчаўся чарнігаўскі полк, узначалены зводным братам І. Залатарэнкі Цімафеем Анікенкам. З поўдня, за Навабыхаўскай брамай, трымаў пазіцыі створаны на пачатку вайны старадубскі полк пад камандаваннем Пятра Забелы. І, урэшце, у падняпроўскіх сенажацях размясціўся нежынскі полк, якім кіраваў палкоўнік Кабыляцкі — замест І. Залатарэнкі, што скіраваў свой табар на левы бераг ракі. Спачатку абаронцы напалі на шанцы падначаленых Анікенкі і прымусілі тых вярнуцца ў табар. Пасля атакавалі з Падольнай (Ніжняй) брамы. Тут абаронцам таксама ўдалося высекчы залогі шанцаў, здабыць тры гарматы і заняць табар. Казакі распачалі

---

[1] Бабятыньскі К. Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654—1655 гг.) // ARCHE. 2008. № 7–8. С. 274 ; Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 715–716.

[2] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654–1655) [Электронны рэсурс]. URL: http://www.belhistory.eu/konrad-babyatynski-stary-i-novy-byxa%D1%9E-u-chas-vajny-rechy-paspalitaj-z-maskvoj-1654-1655/ (дата звароту: 15.09.2016).

панічныя ўцёкі праз раку «… і шмат іх патанула, іншыя сышлі ў табар І. Залатарэнкі, а… [быхаўцы]… іх пасеклі, табар спалілі і цэлыя вярнуліся ў горад». Уражанне ад той сутычкі ў казацкім абозе было такое моцнае, што ў наступныя дні І. Залатарэнка не адважваўся высылаць свае аддзелы на ўсходні край умацаванняў. Затое жыхары маглі спакойна пасвіць на лугах быдла і коней, быў адкрыты доступ да вады. Калі казакі спрабавалі вярнуцца, гарнізон адганяў іх агнём ручніц ды гакаўніц. Пагалоска пра поспех 2 кастрычніка шырокім рэхам адбілася ў рэляцыях тых дзён. Пра яго пісаў 13 кастрычніка мазырскі суддзя, камандуючы добраахвотнымі фарміраваннямі, Самуэль Аскерка ў лісце з Бабруйска да Багуслава Радзівіла: «…у гэтую пятніцу будзе два тыдні, як набеглі з Быхава ды знеслі ім [казакам] адзін табар»[1].

З набліжэннем зімы станавілася відавочным, што аблога крэпасці асуджаная на няўдачу і яе спыненне — толькі пытанне часу. Аднак казакі знаходзіліся пад Старым Быхавам аж да канца восені, калі 26 лістапада І. Залатарэнка быў вымушаны зняць аблогу і пайсці зімаваць у Новы Быхаў, папаліўшы свае табары пад нескароным горадам. Тым самым было аспрэчана ўказанне Б. Хмяльніцкага, які загадаў палкоўніку 1 снежня вярнуцца ва Украіну ды падмацаваць казацкія сілы. На такі ўчынак І. Залатарэнку падштурхнула верагоднасць страціць дасягненні апошніх месяцаў і згубіць магчымасць далейшых бліскучых поспехаў у 1655 г.[2].

Аднак казацкія раз'езды ўвесь час патрулявалі міжрэчча Дняпра і Друці. У сваю чаргу абаронцы Старога Быхава «не спалі ў шапку». Як толькі казакі адышлі ад сцен горада, яны пачалі арганізавана запасаць харчаванне ў бліжэйшых вёсках. Цікавым з'яўляецца факт, што тым часам да камандуючага быхаўскім гарнізонам Канстанціна Багушэвіча прыйшлі манашкі з Баркалабаўскага праваслаўнага манастыра, якія прасілі, каб быхаўскія салдаты не спустошылі іх мясціну. Выслухаўшы пасланак, К. Багушэвіч адправіў з Быхава Івана Данілава, шляхціча-«ляха» Гаўрылу Карлінскага і яшчэ чатырох чалавек «для бережения Барколабовского монастыря», а замест іх у якасці закладнікаў пакінуў у горадзе пяць манашак[3]. Гэта да пытання пра рэлігійную нецярпімасць у ВКЛ. Больш чым верагодна, што К. Багушэвіч і іншыя быхаўскія ўраднікі, а таксама ваенныя былі

[1] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654–1655) [Электронны рэсурс]. URL: http://www.belhistory.eu/konrad-babyatynski-stary-i-novy-byxa%D1%9E-u-chas-vajny-rechy-paspalitaj-z-maskvoj-1654-1655/ (дата звароту: 15.09.2016).

[2] Там жа.

[3] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 444–445.

ў большасці каталікамі і уніятамі. І гэтыя людзі не толькі не рабавалі праваслаўны манастыр, але і забяспечвалі яго ахову. Пазней казакі палкоўніка К. Паклонскага, набраныя ў асноўным з наваколіц Магілёва, хутчэй за ўсё ў большасці сваёй праваслаўныя, узялі ў палон пакінутых у манастыры І. Данілава і Г. Карлінскага. Пры гэтым яны нават не задумваліся пра лёс змешчаных у Старым Быхаве манашак Баркалабаўскага манастыра.

З паведамленняў палоннага жыхара сяла Холстава Рыгора Харытонава вядомы настроі абаронцаў горада ўвосень 1654 г.: «…сколко Золотаренку ни стоять, а ему николи им не сдацца… сдались де из воли Гомляне, и он де их всех приневолил… и отвез государю под Смоленск»[1]. Калі ж да быхаўцаў дайшла вестка, што магілёўцы здаліся і цар іх нікуды не выслаў — «живут все в своих домех по прежнему», у асяроддзі мяшчан з'явілася думка пра здачу маскоўскаму войску. Але шляхта аб такіх настроях не ведала, а яўрэі «николи о том не мыслили». З'яўленне ж у горадзе князя Жыжэмскага ды былога гомельскага старасты Руцкага ўсім вярнула рашучасць. Тыя сказалі абаронцам, каб яны і не думалі пра здачу: «… которые городы и сдались... Шклов, Копысь, Дубровня и иные городы, и тех городов всяких жилетцких людей неволят, грабят и в полон емлют и до Москвы отвозят, и те де все городы иные разорены и опустошены». Быхаўцы ж «…слыша то, все на том и положили, лутше де им в домех своих хотя помереть, нежели в неволю из воли самим себя отдавать»[2].

Пасля адыходу казакоў І. Залатарэнкі ад сцен Старога Быхава яго абаронцы адразу паслалі да гаспадара горада К. Л. Сапегі ганцоў [3] для абмену інфармацыяй і вырашэння пытання, што рабіць. А навін доўга чакаць не прыйшлося: у канцы снежня 1654 г. пачаўся наступ войска Вялікага Княства.

Да канца першага года вайны маскоўскія ваяводы і ўкраінскія казакі занялі тэрыторыі ВКЛ на ўсход ад Дняпра і на поўнач ад Дзвіны. Вольнымі тут заставаліся толькі Стары Быхаў, Дынабург ды Веліж. І страчаныя землі кіраўніцтву ВКЛ трэба было вяртаць. У снежні 1654 г. пачалося контрнаступленне войска ВКЛ[4]. Літоўскія вайскаводцы палічылі, што на першым этапе кампаніі галоўнае — здабыць крэпасці па лініі Дняпра

---

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 446.

[2] Там жа. С. 446–447.

[3] Там жа. С. 447–448.

[4] Драматычныя падзеі тых дзён даволі поўна і падрабязна апісаны ў працы «Ад Смаленску да Вільні…» польскага гісторыка Конрада Бабятыньскага [ARCHE. 2008. С. 188–365], у сувязі з чым пра ход баявых дзеянняў зімы 1654–1655 г. у нашай кнізе з 89 па 94 с. мы распавядзём, абапіраючыся на с. 280–286 згаданай працы. У зносках будуць адзначаны крыніцы, якія адсутнічаюць у К. Бабятыньскага.

(Новы Быхаў, Магілёў, Шклоў, Оршу, Дуброўну), каб стварыць там лінію абароны перад новым наступам маскоўцаў, якога чакалі ўлетку 1655 г. Таму асноўны ўдар войска ВКЛ і добраахвотных атрадаў быў накіраваны ў раён Старога Быхава для яго далейшага развіцця на Новы Быхаў і Магілёў. Першым меркавалася штурмаваць Новы Быхаў, бо ў ім знаходзілася найбуйнейшае варожае злучэнне — атрады І. Залатарэнкі. Знішчэнне казакоў развязвала рукі арміі ВКЛ і давала магчымасць заняцця некаторых гарадоў без бою.

Раніцай 18 снежня з Бабруйска ў Стары Быхаў прыйшлі 10 харугваў мазырскага суддзі С. Аскеркі. Праз тры дні пад крэпасцю з’явіліся пяць конных і пяхотных харугваў з Мінска. Іншыя літоўскія аддзелы стаялі ў Бабруйску (дывізія Вінцэнта Гасеўскага), у Мінску і Барысаве (дывізія Януша Радзівіла), у Лукомлі, Чарэі і Талачыне (полк Сапегаў) і рыхтаваліся да наступу. Яны выйшлі ў поле, напэўна, у першыя дні студзеня.

Пачатак кампаніі ішоў згодна з планамі літоўскіх камандуючых: быў заняты Галоўчын і паволі ачышчалася ад праціўніка тэрыторыя паміж Дняпром і Бярэзінай. 10 студзеня 1655 г. большая частка войска ВКЛ падышла пад Стары Быхаў. Частка аддзелаў, у тым ліку казацкі полк стольніка Крыштапа Патоцкага, заняла манастыр у Баркалабаве і не прапусціла магчымасць спустошыць навакольныя вёскі.

Армія скіравалася да Новага Быхава, і 12 студзеня яе аддзелы з’явіліся прыкладна за дзве мілі на поўдзень ад мястэчка, дзе разбілі два лагеры. Дывізія палявога гетмана В. Гасеўскага паставіла абоз на беразе Дняпра, у кіламетры ад умацаванняў. Крыху далей размясціўся кантынгент вялікага гетмана. Першыя важныя сутычкі адбыліся недзе 14 студзеня. Казакі былі змушаны адступіць за лінію ўмацаванняў. З гэтага часу пачалася рэгулярная аблога[1].

Як адзначалася раней, Новы Быхаў у той час уяўляў сабой крыху састарэлы, але захаваны ў добрым стане драўляна-земляны замак. Па перыметры ён быў абведзены земляным валам і ровам. Перад уязной брамай праз роў меўся пад’ёмны мост[2]. Ад пачатку снежня казакі пачалі тэрміновае фартыфікаванне Новага Быхава. Рамантаваліся ўмацаванні, падвышаўся вал, з боку Дняпра ў некалькі радоў былі выстаўлены частаколы ды драўляныя заслоны, умацаваныя зямельнымі прыпорамі. Насыпалі

---

[1] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654–1655) [Электронны рэсурс]. URL: http://www.belhistory.eu/konrad-babyatynski-stary-i-novy-byxa%D1%9E-u-chas-vajny-rechy-paspalitaj-z-maskvoj-1654-1655/ (дата звароту: 15.09.2016).

[2] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск : Навука і тэхніка, 1991. С. 89.

яшчэ 7 бастыёнаў[1]. У мястэчку захоўваліся значныя запасы правіянту, пораху і ядраў. І. Залатарэнка меў у сваім распараджэнні ўсё тых жа 30 гармат, з якімі ён абложваў Стары Быхаў. Сілы абаронцаў ацэньваліся прыблізна ў 6 тысяч — 8 тысяч чалавек. Корпус І. Залатарэнкі ў параўнанні з ранейшым скараціўся прыкладна на 50 %. Галоўная прычына заключалася не ў баявых стратах, а ў масавым дэзертырстве сялян: улетку яны тысячамі наймаліся на службу, а цяпер, не вытрымаўшы цяжкасцей вайны, вярталіся ў свае сялібы на Украіне. Разам з тым залогу мястэчка ўмацавалі валашчане Новага Быхава, якія ў далейшым прынялі актыўны ўдзел у яго абароне[2].

Армія ВКЛ пад Новым Быхавам налічвала каля 12 тысяч — 14 тысяч жаўнераў, з якіх каля 50 % складала кавалерыя, бескарысная пры аблозе. Астатнім аддзелам Я. Радзівіл вызначыў іншыя задачы. Некалькім палкам конніцы было даручана максімальна абмежаваць дзеянні залог Магілёва і Шклова: яны здзяйснялі напады на абозы і невялікія вайсковыя атрады непрыяцеля, якія рухаліся да гэтых гарадоў. Большасць павятовых харугваў вялікі гетман паслаў на поўнач ад Вільні, каб засланіць сталіцу дзяржавы ад нападаў ворага з боку Полацка. Урэшце некалькі адзінак узмацнілі абарону дзвюх прыватных крэпасцей — Старога Быхава і Слуцка.

У сваю чаргу царскія ваяводы таксама не бяздзейнічалі. У пачатку студзеня пад Новы Быхаў быў накіраваны аддзел нежынскага палкоўніка Васіля Залатарэнкі, але яго «не допустили ляхи»[3].

Акружыўшы Новы Быхаў, армія ВКЛ прыступіла да аблогі. Спрабавалася выкарыстаць супраць абаронцаў агонь артылерыі. Але яе стан у Вялікім Княстве ў сярэдзіне XVII ст. пакідаў жадаць лепшага. З усіх крэпасцей моцную артылерыю меў толькі Смаленск, а на баявыя дзеянні выстаўлялася частка палявых гармат, якія былі практычна бескарыснымі пры аблогах. Армія ВКЛ цярпела ад недахопу вопытных пушкароў. Так, па словах Я. Радзівіла, «пушкары і ўсе служачыя гэтай артылерыі такія дрэнныя і ні на што непрыдатныя, што за ўвесь гэты час штурму [Магілёва] толькі адзін снарад у горад трапіў, іншыя ўсе адны пераляцелі, другія не даляцелі і сваіх толькі людзей пабілі». Таму для паляпшэння стану артылерыі пры пасярэдніцтве палявога гетмана В. Гасеўскага са Старога Быхава пад Новы Быхаў пераправілі некалькі цяжкіх гармат. На жаль, абстрэл не прыносіў чаканых вынікаў, а ў прамерзлай зямлі немагчыма

---

[1] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654–1655).

[2] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 607, 609–610.

[3] Там жа. С. 517–518.

было рабіць падкопы і закладаць міны. Як скардзіўся Януш Радзівіл, нельга было «ні рыдлёўкі, ні матыкі выкарыстаць…».

У сваю чаргу казакі прыкладалі ўсе намаганні, каб атрымаць перамогу над сваім ворагам. Яшчэ на падыходах да Новага Быхава яны актыўна рабілі напады на войска ВКЛ і захоплівалі «языкоў». Згодна з адной з рэляцый І. Залатарэнкі, падчас адной з такіх вылазак быў атакаваны абоз войска ВКЛ. У баі казакі ўзялі «языка, немчина земли Пруской наемного», якога адправілі да цара [1]. Затым праз 10 дзён падначаленыя І. Залатарэнкі каля Новага Быхава «напавши на тотар князя Несвижского [напэўна, маецца на ўвазе татарская харугва з палка Міхала Казіміра Радзівіла] безвестно розбили, самих немало под меч подклонили, а языков дву живых взяли, которых послали до… царского величества»[2]. Цікавай бачыцца далейшая метамарфоза гэтай падзеі. Так, у XIX ст. яе апісвалі наступным чынам: «Золотаренко произвел смелую и удачную вылазку, разбил князя Несвижского, взял весь обоз его и беспрепятственно воротился в Новый Быхов»[3].

Падчас іншай сутычкі ў сур’ёзнай небяспецы апынуўся Багуслаў Радзівіл, які трапіў у засаду. Прывядзём апісанне гэтага здарэння: «У адной вылазцы пяхота, умяшаўшыся паміж коннымі казакамі і галінамі і пнямі высечаных дрэваў, паабкладаўшыся, з тых схаваных засадаў нечакана з ручной стрэльбы шмат нашых пазабівала, і князь наш Багуслаў у вялікай быў небяспецы. Бо адзін казак аднаго з важных саноўнікаў збоку ад князя Багуслава куляй з стрэльбы забіў. Куля другога казака, які ў самога Багуслава пацэліў, на шчасце, збочыла і, толькі шмат рукава адарваўшы, палец крыху параніла».

Неўзабаве армію ВКЛ чакалі больш сур’ёзныя праблемы. Праз некалькі дзён з’явіліся першыя цяжкасці з правіянтам. Ваколіцы Новага Быхава ляжалі спустошаныя за некалькі месяцаў знаходжання ў ім корпуса І. Залатарэнкі. Ён прадбачліва знішчыў усё ўшчэнт за многія кіламетры ад мястэчка: «Для выгодаў Князя [Януша Радзівіла] і месца не было, апроч адзінай дымам закуранай халупкі… Іншыя панове значнейшыя на гумнах, стадолах і хлявах мясціцца мусілі. А паспаліты жаўнер на марозах і прыкрых вятрах без ніякага прыкрыцця пры запаленым агні станцыю мець

---

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 515–516.

[2] Там жа. С. 521–522.

[3] Голицын Н. С. Русская военная история : [Ч. 1–2] / сост. кн. Н. С. Голицын, Ген. штаба ген.-лейт., член Военно-учен. ком. Глав. штаба Королевск. Шведск. акад. воен. наук. СПб. : Тип. т-ва «Общественная польза», 1877–1878. Ч. 2 : От Иоанна III до Петра I. 1878. С. 603.

мусіў». Войска пакутавала ад суровых маразоў. Уначы замярзала віно, а посуд з вадою нельга было адарваць ад вуснаў, не пакрываваўшы іх. Значна ўскладнялі становішча і моцныя снегапады.



*Мал. 47. Схематычнае размяшчэнне вайсковага абозу (малюнак невядомага аўтара XVII ст.)*

Ужо ў пачатку аблогі ліцвіны амаль на два тыдні засталіся без свайго вайскаводцы. З-за цяжкай хваробы Я. Радзівіл пэўны час не мог асабіста кіраваць арміяй. У гэтай сітуацыі вяршэнства павінен быў пераняць, згодна з законам і звычаем, яго намеснік — В. Гасеўскі. Аднак дывізію правага крыла самавольна ўзначаліў Б. Радзівіл, які не хацеў прызнаваць вяршэнства палявога гетмана. Больш за тое, з апісання пазнейшых баёў відаць, што афіцэры практычна ніяк не залежалі адзін ад аднаго. У выніку ўзнікалі недагаворанасць, канфлікты на глебе размежавання кампетэнцыі. Несумненна, гэта ўскладняла каардынацыю дзеянняў на полі бітвы, а часам рабіла яе зусім немагчымай. Гэткае становішча паўплывала і на падзеі 24 студзеня 1655 г.

У гэты дзень адбыўся генеральны штурм Новага Быхава. Пра яго ход вядома з некалькіх сведчанняў, якія па-рознаму асвятляюць паводзіны паасобных вайскаводцаў і прычыны паражэння. Вядома, што атакай асабіста не кіраваў па-ранейшаму хворы Я. Радзівіл. Войска наступала, падзяліўшыся на дзве групы. Правае крыло ўзначальваў Б. Радзівіл. На чале

левага крыла, якое налічвала каля 2 500 жаўнераў, стаялі В. Гасеўскі і Фромгальд Вольф. Першыя ў бой пайшлі аддзелы князя Багуслава. Яны хацелі прабіцца ў крэпасць у месцы, дзе каля берага ракі подступ абараняў толькі дубовы частакол, умацаваны ўнутранымі падпоркамі, насыпанымі з зямлі. Казакі чакалі атакі з таго боку і таму, каб ускладніць доступ да лініі ўмацаванняў, прарубілі ў лёдзе ў некалькіх месцах палонкі. Захапіць крэпасць наступам з аднаго кірунку, напэўна, было немагчыма, бо абаронцы, выкарыстоўваючы лютыя маразы, палівалі ўмацаванні вадою, і калі яна застывала, муры рабіліся практычна непрыступнымі. Слабая артылерыя не магла прабіць пралому, што яшчэ больш змяншала верагоднасць заняць мястэчка. Аддзелы Багуслава пачалі штурм прыкладна за паўгадзіны да світання. Заспець праціўніка знянацку не атрымалася — напэўна, яго пабудзіў лішні шум пры падрыхтоўцы да атакі. Непрыяцель паспеў паставіць атрады і артылерыю ўздоўж ракі.

Літвіны, маючы перад сабой на санях заслоны з дрэва ды саломы, каб бараніцца ад агню казакоў, «схаваныя за высокім берагам Дняпра (падышлі) па лёдзе аж пад самыя парканы; ды наша драгунія давала агню, кладучы мушкеты ў парканавыя дзіркі, аднак без (праломаў) і без сякер уламацца ў паркан было цяжка»[1]. Пасля бітвы, што доўжылася гадзіну, і контрудару казакоў літвіны змушаны былі адступіць[2]. Страты склалі 30 забітых і столькі ж параненых. Напэўна, найцяжэй прыйшлося ядру дывізіі правага крыла — палку нямецкай пяхоты, які ўзначальваў Багуслаў Прыпкоўскі. Яго самога «два разы ў гэтай бітве шротам падстрэлілі».

Сведкі падзей разыходзяцца ў ацэнцы пазіцыі левага крыла падчас штурму. Адзінкі палявога гетмана В. Гасеўскага ўвогуле не пайшлі ў бой і пасіўна глядзелі, як «заглынуўся» наступ дывізіі Б. Радзівіла, які адразу ж усклаў на гетмана віну за гэтую няўдачу. Князь лічыў, што праз няздатнасць, а магчыма і наўмысную бяздзейнасць В. Гасеўскага на яго аднаго «ўвесь імпэт (варожы) абярнуўся», а потым, «не зрабіўшы справы», ім давялося вярнуцца.

Апісаныя вышэй непаразуменні з размежаваннем кампетэнцыі маглі істотна паўплываць на ход штурму. Аднак у самай падрабязнай справаздачы пра падзеі таго дня, складзенай адным з афіцэраў ВКЛ, тлумачыцца, што аддзелы палявога гетмана не падтрымалі войска князя Багуслава перадусім таму, што той занадта рана нанёс удар. Пры гэтым не быў пададзены ўмоўны

[1] Адсутнасць гармат і інструментаў (у прыватнасці сякер) падчас штурму палявых драўляных умацаванняў сведчыць аб дрэннай арганізацыі вайсковай справы як у дывізіі Радзівілаў у прыватнасці, так і ўвогуле ў арміі ВКЛ таго часу.

[2] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654–1655) [Электронны рэсурс]. URL: http://www.belhistory.eu/konrad-babyatynski-stary-i-novy-byxa%D1%9E-u-chas-vajny-rechy-paspalitaj-z-maskvoj-1654-1655/ (дата звароту: 15.09.2016).

сігнал, які мусіў падняць на атаку адзінкі В. Гасеўскага, што чакалі ў пералеску на другім баку горада. Наступаючыя таксама хутка адышлі з-пад умацаванняў, і ў выніку дывізія палявога гетмана не паспела далучыцца да бою.

Пасля паражэння 24 студзеня Я. Радзівіл адмовіўся ад далейшых спроб узяць умацаванні Новага Быхава. Пры гэтым ён апраўдваўся, што не бачыў магчымасці прымусіць праціўніка капітуляваць, і таму не хацеў марных ахвяр сярод жаўнераў. Армія Вялікага Княства стаяла пад горадам яшчэ больш за два тыдні, да 10 лютага[1], калі зняла аблогу і перайшла да Магілёва.

Тым часам Стары Быхаў зноў рыхтаваўся да вядзення баявых дзеянняў: тут папоўнілі запасы правіянту і рыштунку[2]. А калі скончыліся баі пад Новым Быхавам і Магілёвам, К. Л. Сапега даслаў сюды 1 200 жаўнераў з ліку сваіх прыватных харугваў. Агульная колькасць абаронцаў, аднак, значна паменшылася ў выніку выезду ўглыб ВКЛ вялікай колькасці шляхты і мяшчан, якія разумелі, што новае наступленне царска-казацкіх войскаў прывядзе да адрыву горада ад краіны на доўгія месяцы[3].

Спробы заняць Магілёў беспаспяхова доўжыліся да пачатку траўня 1655 г. Увесь гэты час маскоўскі ўладар Аляксей Міхайлавіч патрабаваў ад І. Залатарэнкі, каб той сваёй зброяй дапамог магілёўцам. На гэта казацкі палкоўнік неаднаразова адказваў, што да Магілёва яго войска не можа дайсці з-за вялікіх снягоў, «из которых конем человек не может выбресть». Аднак снягі не перашкодзілі казакам паграміць некалькі вёсак Магілёўскай эканоміі, знішчыць разам з насельніцтвам гарады Бабруйск, Глуск і Казімір[4]. Апошні горад пасля гэтых падзей знікне да пачатку XXI ст., калі яго знойдуць падчас раскопак.

У траўні 1655 г. з Бранска на Магілёў вырушыла армія ваяводы А. Н. Трубяцкога. У гэты ж час І. Залатарэнка са сваімі казакамі зноў акружыў Стары Быхаў. Войска ж ВКЛ, як і чакалася, каб не сутыкнуцца з «апанентамі», таксама рушыла на захад, углыб краіны. А крэпасць Стары Быхаў зноў засталася сам-насам з ворагам.

[1] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654–1655) [Электронны рэсурс]. URL: http://www.belhistory.eu/konrad-babyatynski-stary-i-novy-byxa%D1%9E-u-chas-vajny-rechy-paspalitaj-z-maskvoj-1654-1655/ (дата звароту: 15.09.2016).

[2] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 469–470.

[3] Бабятыньскі К. Адносіны жыхароў ВКЛ да маскоўскага войска ў 1654–1955 гг. // Беларускі гістарычны агляд. 2007. Т. 14. Сш. 1–2. С. 70.

[4] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 530–537.

Пакуль царская армія з новымі сіламі вяла наступ на ВКЛ з мэтай захапіць усю тэрыторыю гэтай краіны, а кіруючыя колы Рэчы Паспалітай тым часам на сойме ў Варшаве тэрмінова разглядалі пытанне пра неабходнасць склікання паспалітага рушэння, 7 траўня пад Быхавам І. Залатарэнка пісаў у грамаце да абложаных: «…а спротивяете ся воли Господа Бога…, о хочете усю Литву задержати своим одным Быховом. Па сотно кротным упоминаньем упоминаю, жебысте се поклонили Его Царскому Величеству, а над собою, жонами и детьми своими змиловали се. Бо ведайте о том певне, коли вас достанем през меч, и малого дитяти живити не будем»[1]. На гэта жыхары Старога Быхава адказалі: «Сдавться де мы не хотим, а будем де сидеть покамест нашей мочи будет»[2].



*Мал. 48. Быхаўскі замак у часы росквіту (малюнак С. Лявіцкага)*

Тым часам наказному гетману ад цара Аляксея Міхайлавіча прыйшоў загад пра ўмацаванне аблогі Старога Быхава і адпраўленне большай часткі войскаў для ўзяцця Свіслачы і Мінска, што было выканана: украінскія фарміраванні накіраваліся за Бярэзіну. Стары Быхаў акружылі падраздзяленні казацкага палкоўніка Самойлы Курбацкага, да

[1] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. Т. 1. Вильна : Печатня Губернского Правления, 1867. С. 391.

[2] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 2: Разрядный приказ. Московский стол. 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. 1894. С. 409.

якіх 1 чэрвеня далучылася шматтысячнае войска А. Н. Трубяцкога. Напярэдадні новага маскоўскага наступу жыхарам і валашчанам Новага Быхава ад імя цара былі дадзены «палёгкі»: іх, акрамя ўсяго іншага, абяцаліся «оберегать, чтобы им от войска… царского величества обид и никакого разоренья и тесноты не было»[1].

Вынікі летняй кампаніі 1655 г. для ВКЛ былі катастрафічнымі. Да восені гэтага года царскім войскам і казакамі была захоплена практычна ўся тэрыторыя Вялікага Княства, уключаючы сталіцу Вільню. Вольнымі засталіся толькі асобныя «астравы свабоды» — Стары Быхаў, Слуцк, Берасце, Ляхавічы, а паміж гарадамі «блукалі» войскі і асобныя падраздзяленні праціўніка.

А тым часам Старабыхаўская крэпасць не выходзіла з галавы ў маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча. Яшчэ ў чэрвені ён накіраваў у войска, якое абложвала непакорлівы горад, двух дваран, якія павінны былі перадаць К. Багушэвічу царскую грамату, у якой абаронцам прапанавалася здаць Стары Быхаў без кровапраліцця. Цар у такім разе гарантаваў усім захаванне маёмасці, ранейшых правоў і да т. п. Увогуле, хто жадаў грошай — таму абяцалі грошы, хто жадаў сысці з горада ўглыб Літвы — калі ласка. Ну а непакорлівых манарх пагражаўся «предать мечу»[2]. Угаворы былі падмацаваныя актыўнымі баявымі дзеяннямі царскіх войскаў, якія працягваліся да 26 ліпеня. Абаронцаў князь А. Трубяцкі неаднаразова заклікаў здавацца. На прапановы здаць горад быхаўцы адказвалі: «Пакуль будзе хлеба і ўсялякіх прыпасаў, датуль і будзем сядзець, а здацца чаркасам і гасударавым людзям не хочам»[3]. Свае словы непакорлівы гарнізон таксама актыўна пацвярджаў сілай зброі. А. Трубяцкі пісаў аб гэтым цару: «И быховцы… тебе, великому государю, не добили челом, и города не сдали, и из городу на солдацкие шанцы вылазки у них были не по один день, и ночьми, и с твоими государевыми людьми пеших полков с солдаты и с стрельцы они, быховцы бились;

---

[1] Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века / А. Н. Мальцев ; под ред. В. А. Александрова, Л. В. Милова. М. : Изд-во Москов. ун-та, 1974. С. 85 ; Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 609.

[2] Акты исторические, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 4: 1645–1676. С. 243–244.

[3] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 716.

и твои государевы ратные люди быховцев побивали, от шанцев в ров отбивали»[1].

Акрамя гэтага, маскоўцы былі абавязаны дапытаць «языкоў», узятых падчас баявых дзеянняў з быхаўцамі, і пазнаць колькасць абаронцаў крэпасці, іх склад, наяўнасць у горадзе харчу і г. д. Згодна з атрыманай інфармацыяй, у горадзе ўсяго было «…шляхты 50 человек, желдаков 400 человек, венгров 50 человек, жидов 1000 человек, мещан 800 человек». Зусім невялікая сіла, прычым большая частка абаронцаў — цывільныя людзі. Гармат яны мелі 4 вялікія і 26 палкавых. Свінцу, пораху і харчоў у быхаўцаў было многа. Акрамя таго, порах яны рабілі самі. Ды і ад хвароб, да расчаравання маскоўцаў, абаронцы не паміралі[2].

Засяроджанасць у фартэцыі вялікай колькасці прафесійных жаўнераў-наймітаў выклікала спрэчкі аб кампетэнцыі яшчэ ў 1654 г. Вясной 1655 г. яны ўзмацніліся. Як бачна з ліста рэчыцкага скарбніка Юстыніяна Паўшаноўскага, які ад імя падканцлера зладзіў новы набор, войска не хацела прызнаваць уладу К. Багушэвіча, які кіраваў абаронай дагэтуль. Хаця той выдатна спраўляўся з ускладзенымі абавязкамі, аднак быў не ў афіцэрскім чыне і, відаць, карыстаўся не надта вялікім аўтарытэтам сярод наймітаў. Драгунскія рэгіменты лічылі за свайго кіраўніка капітана Яна Кругера. К. Бабятыньскі сцвярджае, што са згоды К. Л. Сапегі менавіта апошні ўзначальваў гарадскі гарнізон у 1655 г. К. Багушэвічу ж пакінулі толькі цывільную ўладу[3]. Разам з тым такая выснова даволі сумніўная. Пацверджаннем гэтаму з’яўляюцца сведчанні абаронцаў Старога Быхава, якія патрапілі ў 1655 і 1656 гг. у маскоўскі палон. Практычна ўсе яны заяўлялі, што абаронай кіруе К. Багушэвіч і суддзя Ярашэвіч («Ерошинской»)[4]. Акрамя таго, цар Аляксей Міхайлавіч,

---

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 83 ; Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 2: Разрядный приказ. Московский стол. 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. 1894. С. 696.

[2] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 715–716.

[3] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654–1655) [Электронны рэсурс]. URL: http://www.belhistory.eu/konrad-babyatynski-stary-i-novy-byxa%D1%9E-u-chas-vajny-rechy-paspalitaj-z-maskvoj-1654-1655/ (дата звароту: 15.09.2016).

[4] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 2: Разрядный приказ. Московский стол. 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. 1894. С. 464, 467.

калі накіроўваў лісты ў Старабыхаўскую фартэцыю, адрасаваў іх перш за ўсё «подстаросте Богушевичу и Ерошевичу»[1].

Гераізм і стойкасць гараджан былі адзначаны асабістай граматай караля Рэчы Паспалітай Яна Казіміра ад 31 траўня 1655 г. «Securitas Bychowa», згодна з якой жыхары гэтага валодання К. Л. Сапегі вызваляліся ад усіх падаткаў на 20 гадоў. Акрамя таго, за кошт каралеўскай казны для абароны Старога Быхава наймаліся 300 чалавек нямецкай пяхоты[2].

Каб пераканаць абаронцаў, казакі пайшлі на хітры псіхалагічны ход. У другой палове чэрвеня адным казацкім раз'ездам за р. Бярэзінай быў захоплены і смяротна паранены пасланец з лістамі для жыхароў Старога Быхава. Пасля азнаямлення з гэтымі лістамі І. Залатарэнка перадаў іх маскоўскаму цару. З лістоў стала вядома, што якой-небудзь істотнай дапамогі гарнізон горада не атрымае. Максімум, на што ён мог разлічваць, гэта на невялікае падраздзяленне драгунаў пад камандаваннем нейкіх Клата і Шумана. Але ў святле змены ваеннага становішча быхаўцы і на гэтых драгунаў спадзявацца наўрад ці маглі. Таму казацкі правадыр папрасіў Аляксея Міхайлавіча пасля чытання накіраваць лісты ў Стары Быхаў адрасатам. Разлік быў просты: даведаўшыся, што дапамогі не будзе, гарнізон горада здасца[3]. Але казацкі палкоўнік памыліўся. Крэпасць працягвала змагацца.

Аднак у той час як адны абаранялі сваю Радзіму, іншыя думалі толькі пра сябе. Так, сярод лістоў, якія павінны былі патрапіць у рукі быхаўцам, быў адзін, напісаны згаданым раней Ю. Паўшаноўскім Габрыэлю Вількоўскаму, у якім адпраўнік прасіў свайго швагра сабраць усю маёмасць Паўшаноўскага, змешчаную ў Старым Быхаве, у тым ліку свіное мяса, сала, змесціва дзвюх жытніц, і на калёсах накіраваць у Ляхавічы[4]. Вось толькі не вядома, выканалі просьбу Паўшаноўскага ці не.

Адразу пасля захопу Вільні маскоўскі самадзержац, які не пакідаў надзеі авалодаць Старым Быхавам, паслаў у непакорлівы дняпроўскі горад чарговую грамату, у якой спяшаўся паведаміць абаронцам, што ім «помощи... надеятся не от кого, гетманы Радивил и Госевский со всем войском побиты и столица Великого Княжества Литовского город Вилна

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 774.

[2] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 83.

[3] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 724–732.

[4] Там жа. С. 732.

за нами…»[1]. Для пацверджання факта падзення сталіцы Аляксей Міхайлавіч прапанаваў К. Багушэвічу адпусціць у Вільню пад царскія гарантыі двух надзейных людзей, а затым — «государские милости к себе поискати и город Старый Быхов... сдати»[2].



*Мал. 49. Макет Быхаўскага замка ў XVII ст.*
*(Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей)*

У гэты час пад Старым Быхавам стаялі запарожскія казакі палкоўніка Івана Касінскага і пяхотны полк Якуба Ронарта, які застаўся тут пасля адыходу ад цвердзі арміі Аляксея Трубяцкога. Царскім пасланцам Я. Ронарт распавёў шмат цікавага. Напрыклад, што казацкі палкоўнік Самуйла Курбацкі, які павінен быў актыўна абложваць крэпасць, «от Быхова отступил и стоит неведомо где». Шукаць Курбацкага Я. Ронарт не рэкамендаваў і павадыроў царскаму паслу даць адмовіўся, таму што «быховские осадные люди дороги все отняли и многих... государевых людей

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 776.

[2] Там жа.

в дороге побивают и в полон емлют»[1]. Палкоўнік Іван Касінскі таксама скардзіўся на быхаўцаў, што тыя робяць частыя вылазкі, нападаюць нават на іх умацаваны табар і здабываюць «языкоў», ад якіх даведваюцца пра ўсе апошнія падзеі. Што да царскае граматы, дык абаронцы ўзялі яе пачытаць, — дзеля гэтага выязджалі шляхціч Мікіта Рагоза з двума нямецкімі афіцэрамі Мікаласам Клатам и Грыгорыем Крэем, а на другі дзень далі адказ: каб цар больш ніколі не прысылаў ім сваіх грамат, таму што ўзяць Стары Быхаў ён можа толькі праз меч. Але на гэтым нахабства абаронцаў горада не скончылася: праз некалькі дзён пасля адказу на грамату Аляксея Міхайлавіча 18 жніўня 1655 г. яны зноў напалі на ўмацаваны табар І. Касінскага. Пры гэтым у маскоўскі палон патрапілі баркалабаўскі мешчанін Петр Сямёнаў і быхавец Восіп Прыгарын[2].

Рэгулярныя страты не бянтэжылі быхаўцаў, і яны ў далейшым не збіраліся выпускаць ініцыятыву са сваіх рук. 8 верасня 1655 г. са Старога Быхава да казакоў перабег 18-гадовы «паляк»[3] і сказаў, што з горада выйшла каля 2 тысяч салдат, якія маюць намер напасці на табары казакоў, а таксама на Магілёў і Чавусы. 9 верасня ў Магілёве забілі трывогу: быхаўскія «ляхі» выйшлі з горада (пры гэтым ні казакі, ні маскоўскі полк супраціву не аказалі наогул!) і актыўна збіраюць у вёсках Быхаўскага і Магілёўскага паветаў харчаванне на зіму. У абложаную крэпасць ужо накіроўваецца 300 калёс, а на в. Дашкаўка напалі 300 вершнікаў, якія забілі каля 50 чалавек, і цяпер праз в. Баркалабава з нарабаваным рухаюцца ў бок Старога Быхава. За імі адразу ж падрыхтавалі пагоню з 300 салдат, што нагналі быхаўцаў на р. Лахва. Паміж дзвюма групамі прэтэндэнтаў на сялянскае дабро пачаўся бой. Сутычка працягвалася да вечара. У выніку быхаўцаў «прыціснулі» да балота, але ўначы яны прайшлі праз яго і вярнуліся ў сваю крэпасць, страціўшы пры гэтым 30 чалавек і 50 калёс

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 792.

[2] Там жа. С. 795–296.

[3] Трэба адзначыць, што словы «паляк», «лях», «литовские люди», якімі царскія камандзіры і ўраднікі называлі абаронцаў Старога Быхава і іншых гарадоў, не сведчаць пра тое, што фартэцыю абаранялі палякі і літоўцы ў этнічным сэнсе. Нягледзячы на тое, што ў войску Рэчы Паспалітай вялікую колькасць складалі праваслаўныя жыхары сучасных Беларусі і Украіны, якія называлі сябе русінамі, прадстаўнікі ўлады Рускага царства ніколі не называлі іх «рускім народам» ці «праваслаўнымі хрысціянамі». Яны называлі іх палякамі, літвой ці польскімі і літоўскімі людзьмі (падрабязней гл.: Плахій С. Рускі Вавілон: Дамадэрныя ідэнтычнасці ў Расіі, Украіне і Беларусі. 2-е выд., папраўленае. Смаленск : Інбелкульт, 2014. С. 178).

з харчаваннем. Царскія ратнікі, у сваю чаргу, не далічыліся 40 салдат[1]. Як сведчаць гістарычныя дакументы, такія «акцыі» абаронцаў непакорнага горада не былі разавымі. З паведамлення магілёўскага ваяводы Васіля Якаўлевіча Ункоўскага вядома, што Асавецкае, Іструбецкае і іншыя войтаўствы ў 1655 г. былі спустошаны вайной і «быховскими людьми»[2].

Вось у такі час да Старога Быхава з цэнтральнай Беларусі зноў падышлі арміі І. Залатарэнкі і А. Трубяцкога. Цяпер, натхнёны перамогамі, наказны гетман спадзяваўся здабыць гэтую фартэцыю ды нарэшце расквітацца за ранейшыя няўдачы. Але адбылося самае нечаканае. У першыя дні аблогі, у пачатку кастрычніка, у поўдзень, «быхаўскія сядзельцы» зрабілі вылазку. Падчас сутычкі І. Залатарэнку «на герцу постреленo у ногу з мушкета, от которой ноги и помер под Быховом»[3]. Цікавасць выклікае выраз «на герцу». З герца (іншая назва — татарскі танец) у разгляданы перыяд казакі пачыналі баявыя сутычкі з праціўнікам. Перад боем самыя адважныя «рыцары» пад’язджалі на хвацкіх конях да самога непрыяцельскага стана, стралялі са стрэльбаў і ўсяляк абражалі ворагаў, імкнучыся выклікаць іх на паядынак[4]. Менавіта падчас такой сутычкі з абаронцамі горада і загінуў І. Залатарэнка.

Стары Быхаў наогул стаў фатальным горадам для казацкага войска: яшчэ раней пад яго сценамі загінуў чарнігаўскі палкоўнік Падабайла[5].

З часам жыццё і смерць І. Залатарэнкі асобнымі палітычнымі дзеячамі былі перайначаны да непазнавальнасці. Чалавек, які «ўславіўся» сваёй празмернай жорсткасцю і схільнасцю да п’янства, у псеўдагістарычнай працы «История русов или Малой России» быў прадстаўлены як заўзяты і адважны абаронца праваслаўя і ўсяго добрага[6]. Пра тое, што гэты чалавек заваяваныя гарады заліваў крывёй жанчын і дзяцей, а таксама пра тое, што ў п’яным чадзе наказны гетман забіваў сваіх падначаленых, «История русов» не згадвае.

---

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 14 (дополнение к т. 3) [Присоединение Белоруссии, 1654–1655 / ред. Г. Ф. Карпов]. 1889. С. 834.

[2] Там жа. С. 835.

[3] Белоруссия в эпоху феодализма : сб. документов и материалов : в 3 т. / ред. коллегия: А. И. Азаров [и др.] ; Акад. наук БССР. Ин-т истории. Архивное упр. МВД БССР. Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1959–1961. Т. 2: С середины XVII до XVIII века до воссоединения с Россией / сост.: А. И. Азаров [и др.]. 1960. С. 138.

[4] Яровой А. В. Воинская культура казачества: символическое пространство и ритуал : монография. М. ; Берлин : Директ-Медиа, 2014. С. 100.

[5] Батюшков П. Н. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. СПб. : Типография Товарищества «Общественная Польза», 1890. С. 254.

[6] Конисский Г. История русов или Малой России. М. : Университетская типография, 1846. С. 128–129.

Аднак у гэтай кнізе змешчаны своеасаблівы погляд на Быхаўскую аблогу. Паводле выкладзенага ў «Истории русов» міфа, І. Залатарэнка падчас польскага свята Трох Каралёў, калі гарнізон горада пасля набажэнства займаўся «пированиями», з дапамогай лесвіц і вялікіх снягоў узабраўся ў замак, адкрыў з яго страляніну з гармат па горадзе і бастыёнам. «Польскія войскі», выбітыя з замка, пакінулі Стары Быхаў і пешшу пайшлі ў Літву. Але гора-ваякі былі акружаны казакамі ў лясах на Мінскай дарозе і без супраціву здаліся ў палон. І. Залатарэнку за гэта хвалілі Б. Хмяльніцкі і сам цар. Затым, заваяваўшы Літву, наказны гетман праходзіў з войскамі г. Стары Быхаў. Але пры ўездзе на гарадскую плошчу І. Залатарэнка быў забіты стрэлам са званіцы. Забойца, вядома ж, быў затрыманы. Ім, як ні дзіўна, быў каталіцкі арганіст Томаш, які адразу прызнаўся, што здзейсніць гэтае ліхадзейства яго падгаварылі каталіцкія ксяндзы. Пры гэтым страляў Томаш куляй з лацінскімі літарамі, адлітай са святой чашы, асвячонай загаворамі. За забойства ксяндзы абяцалі яму «на ряду мучеников царство Небесное и воспитание детей его в школах Иезуитских»[1].

Разам з тым містычны складальнік у смерці І. Залатарэнкі ўсё ж меў месца. Цела наказнога гетмана прывезлі ў Корсунь, дзе яго змясцілі ў царкве Мікалая Цудатворца. У дзень пахавання падчас памінальнай службы царква па незразумелых прычынах успыхнула. У полымі і падчас узніклай таўкатні загінула 432 чалавекі. Пасля пажару цела наказнога гетмана знайшлі і перанеслі ў іншы храм. Але і ён два разы загараўся[2].

Смерць І. Залатарэнкі справакавала бунты сярод казакоў, якія абложвалі Стары Быхаў. Радавыя ваякі «повстали» на сваіх кіраўнікоў. Аднак па дарозе да казацкіх старшынаў ім трапіліся купецкія абозы з гарэлкаю. Натуральна, абозы былі разрабаваны, купцы — забіты, а казакі «позапивалися». У выніку казацкія старшыны забілі найбольш актыўных бунтароў. Тых жа, да каго адразу не дацягнулася шабля, павесілі. І ўсё ж дысцыпліна ў войску была падарвана, і нямалая частка казакоў вярнулася ва Украіну[3], пакінуўшы каля Старога Быхава полк з 22 сотняў Івана Нячая, які складаўся ў асноўным з сялян Усходняй Беларусі. А ў канцы года і маскоўскія войскі фактычна знялі аблогу з непакорлівага горада[4].

---

[1] Конисский Г. История русов или Малой России. М., 1846. С. 128.

[2] Ригельман А. Летописное повествование о Малой России и ее народе и казаках вообще. М., 1847. С. 212.

[3] Белоруссия в эпоху феодализма : сб. документов и материалов : в 3 т. / ред. коллегия: А. И. Азаров [и др.] ; Акад. наук БССР. Ин-т истории. Архивное упр. МВД БССР. Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1959–1961. Т. 2: С середины XVII до XVIII века до воссоединения с Россией / сост.: А. И. Азаров [и др.]. 1960. С. 138.

[4] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 84.



*Мал. 50. Горад каля ракі, акружаны акопамі, падчас аблогі, пазбаўлены магчымасці выкарыстання воднага шляху (малюнак невядомага аўтара XVII ст.)*

Чавускі палкоўнік І. Нячай актыўна працягваў справу свайго папярэдніка — спрабаваў авалодаць Старым Быхавам. 26 студзеня 1656 г. Б. Хмяльніцкі сваім універсалам пацвердзіў статус І. Нячая як «полковника на Белой Руси». Пры гэтым Хмяльніцкі вызначыў тэрыторыю, падуладную Украіне, у рамках Рэчыцкага, Аршан-скага, Мсціслаўскага паветаў, уключаючы Гомель, Новы Быхаў і Магілёў[1]. Прэтэндуючы на Магілёў, украінцы выказвалі незадавальненне тым, што гэты найбуйнейшы на Падняпроўі цэнтр праваслаўнай епархіі быў падначалены Маскоўскаму патрыярхату. Усё гэта выклікала канфлікты І. Нячая з царскімі ваяводамі[2]. Калі маскоўцы хацелі адабраць у яго Чавусы, казацкі палкоўнік заявіў, што будзе абараняцца з усім войскам і артылерыяй. У сваю чаргу, царскія ратнікі фізічна знішчалі тыя мясцовыя аддзелы, якія выказвалі жаданне злучыцца з украінскім войскам[3]. А І. Нячай працягваў актыўна пашыраць тэрыторыю дзеяння свайго палка. У яго фарміраванні набіралі ахвотнікаў, але боль-

---

[1] Документы эпохи Богдана Хмельницкого 1656 и 1657 гг., извлеченные из Главного Московского Архива Министерства Иностранных Дел [Электронный ресурс] / сообщил И. М. Каманин. Киев, 1911. URL: http://www.vostlit.info/Texts/Dokumenty/Ukraine/XVII/1640-1660/Dok_Bogd_ Chmeln/text1.html (дата обращения: 24.05.2016).

[2] Катлярчук А. У ценю Польшчы і Расеі // ARCHE. 2008. № 7–8. С. 597.

[3] Там жа. С. 598.

шасць запісвалі ў сотні сілай. На І. Нячая паступалі скаргі, што ён гвалтам пераводзіць у казакі «пашенных крестьян», часам — цэлымі вёскамі[1].

Між іншым у лістападзе 1655 г. са Старабыхаўскай фартэцыі збег палонны рускі салдат, які паведаміў, што «в Быхове конных и пеших людей с 1000 человек… А хлебными запасами у них… скудно, и многие бедные люди от того скучают…». Вялікія страты прыносіў «огненный наряд» (гарматы), які прыслалі па просьбе І. Залатарэнкі. Быхаўцы памкнуліся здавацца, але, калі даведаліся ад палонных, узятых падчас вылазкі, што ворагі збіраюцца адыходзіць, вырашылі горад не здаваць. «А по городу де у них, быховцев, сторожа крепкая, в день и ночь стоят беспрестанно все»[2].

Прыкладна такую ж інфармацыю ў снежні 1655 г. паведамлялі і палонныя абаронцы Старабыхаўскай крэпасці: жыхар с. Гарадзец Іван Аляксееў і драгун Лаўрын Ермалаеў. Цікавасць уяўляюць сведчанні І. Аляксеева, які значна перабольшвае колькасць абаронцаў і хлебных запасаў, якіх, па яго словах, «не скудно»[3].

Ранняй вясной 1656 г. маскоўскі цар ізноў накіраваў абаронцам Старабыхаўскай крэпасці грамату з прапановай спыніць супраціў. Мяркуючы па ўсім, гараджан праінфармавалі аб тым, што ўся тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага ўжо належыць Аляксею Міхайлавіч і ў быхаўцаў проста няма выбару. На гэта К. Багушэвіч дыпламатычна адказаў, што калі маскоўскі цар стаў гасударом «Літвы і Белай Русі», то быхаўцы яго волі супрацівіцца не будуць. Але паколькі з Рэчы Паспалітай і ад гаспадара крэпасці такіх вестак няма, абаронцы будуць і далей вернымі кіраўніку сваёй краіны. Больш за тое, гараджане, даючы цару адмову, паказвалі апошняму, што клапоцяцца пра яго годнасць, бо з «вечным насмеянием» будзе звязана наяўнасць у манарха яшчэ адных «вероломных подданных», такіх жа як «окрестный народ изменников» (меліся на ўвазе жыхары Новага Быхава і Магілёва і іншых населеных пунктаў, якія прысягнулі цару)[4].

---

[1] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667 [Электронны рэсурс]. URL: http://knihi.com/sahanovic/vajna.html (дата звароту: 24.01.2016).

[2] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 84.

[3] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 2: Разрядный приказ. Московский стол. 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. 1894. С. 464.

[4] Документы эпохи Богдана Хмельницкого 1656 и 1657 гг., извлеченные из Главного Московского Архива Министерства Иностранных Дел / сообщил И. М. Каманин. Киев, 1911. [Электронный ресурс]. URL: http://www.vostlit.info/Texts/Dokumenty/Ukraine/XVII/1640-1660/Dok_Bogd_Chmeln/text1.htm (дата обращения: 18.01.2016).



*Мал. 51. Кароль Рэчы Паспалітай Ян II Казімір Ваза*

Разам з тым «быхаўскія сядзельцы» вялі актыўную перапіску не толькі з маскоўскім уладаром. Яны рэгулярна абменьваліся інфармацыяй з кіраўнікамі Рэчы Паспалітай. Быхаўцам пісаў лісты сам Ян Казімір, кароль Рэчы Паспалітай, а таксама Павел Сапега, ваявода Віцебскі. «Войту и мещанам г. Быхава» паведамляліся апошнія навіны з тэатра баявых дзеянняў і выказвалася падзяка за зацяты супраціў. Частка гэтай карэспандэнцыі была перахоплена казацкімі заставамі і раз'ездамі, якія кантралявалі абшар ад Чэрвеня да Чавус. У ліпені 1656 г. з перапіскі І. Нячаю стала вядома, што для падмацавання ў непакорную цвердзь напраўлены аддзелы мазырскага суддзі С. Аскеркі. Гэтая інфармацыя дазволіла царска-казацкім войскам прыняць адпаведныя меры для таго, каб дапамога не дайшла[1].

Гаспадары горада і краіны разумелі, што аднымі словамі крэпасці не дапаможаш, таму да Старога Быхава рознымі шляхамі накіроўваліся абозы. Але ж казакі захапілі большую іх частку. І. Нячай даводзіў да ведама Аляксея Міхайлавіча: «В нынешнем году, месяца июля 15 дня, переняв врагов и недругов вашего царского величества, едучих рекою Березынею, а впадаючих в реку Друту, хотячих пройти до Старого Быхова, двадцать шесть суден с розными запасы и сорок три лодки…, всех… погромили: одних потопили, а других порубили. Также жидов с возами много порубили». Казацкі палкоўнік таксама дакладваў, што ад мая да 24 ліпеня 1656 г. з быхаўскай цвердзі да яго перабеглі 26 чалавек[2].

[1] Документы эпохи Богдана Хмельницкого 1656 и 1657 гг., извлеченные из Главного Московского Архива Министерства Иностранных Дел / сообщил И. М. Каманин. Киев, 1911. [Электронный ресурс]. URL: http://www.vostlit.info/Texts/Dokumenty/Ukraine/XVII/1640-1660/Dok_Bogd_ Chmeln/text1.html (дата обращения: 24.05.2016).

[2] Там жа.

Становішча старабыхаўскага гарнізона з цягам часу рабілася ўсё больш складаным. Цікавае пісьмо, напісанае ўдзельнікам абароны, якое было захоплена пад горадам і накіравана 17 кастрычніка цару, прыводзіць у сваёй працы А. М. Мальцаў. У гэтым пісьме адзначалася, што «паспольства» (просты люд) «отбежать нас имело не по одному, но и по сту и по двести вместе, мало не по всяк день до неприятеля передаются не только ис черных людей, но и из драгунов и солдат, а сверх того и ис пехоты. И вчерашнего дня остаток меския черни до единого собрався и первые через несколько дней голодавши все вместе до неприятеля покинув», жадалі Нерапшынскага (аўтара пісьма) і Багушэвіча замучыць[1]. Малаверагодным выглядае тое, што горад пакінула такая колькасць людзей адначасова (па сто, дзвесце чалавек), бо такія факты былі б адразу адзначаны ў дакладах рускіх ваявод цару. Больш за тое, гэтая інфармацыя абавязкова была б адлюстравана на старонках дарэвалюцыйных зборнікаў дакументаў, такіх як «Акты Маскоўскай дзяржавы», каб пацвердзіць «жаданне» жыхароў Літвы жыць пад уладай «блізкага ім» праваслаўнага манарха. Верагодна, Нерапшынскі згушчаў фарбы дзеля таго, каб крэпасці ўсё ж такі аказалі дапамогу або каб абгрунтаваць магчымую здачу горада.



*Мал. 52. Кіраса другой паловы XVI — пачатку XVII ст., знойдзеная ў гістарычнай частцы Быхава (Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей)*

Невядома, чым бы скончыўся для быхаўцаў 1656 год, але, як кажуць, адчайным шанцуе. 3 лістапада ў Немежы пад Вільняй паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам быў падпісаны акт аб перамір'і, у адпаведнасці з якім цар прызнаваўся наступнікам Яна Казіміра на вялікакняжацкім пасадзе. У сваю чаргу Аляксей Міхайлавіч абяцаў вярнуць ВКЛ захопленыя землі і перамагчы шведаў, якія таксама напалі на Рэч Паспалітую. На самой справе ні адзін ні другі бок не збіраліся доўга прытрымлівацца змешчаных у дамове абавя-

[1] Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. М. : Из-во Москов. ун-та, 1974. С. 167.

зацельстваў. Акт разглядаўся як часовая, вымушаная мера, але яго ўмовы забаранялі царскім войскам і казакам «чинить зацепки и наезды» на населеныя пункты, якія да таго не былі заваяванымі, «асобліво Быхову»[1]. Таму маскоўскія ратнікі на час спынілі актыўныя ваенныя дзеянні супраць Вялікага Княства. У той жа час казакі і не спрабавалі гэтага рабіць па прычыне таго, што мір паміж Рэччу Паспалітай і Масквой быў непрымальны для Б. Хмяльніцкага, бо ён не збіраўся спыняць бітву за тэрыторыю Паўднёва-ўсходняй Белай Русі. У выніку канфлікт паміж казакамі і войскамі Аляксея Міхайлавіча выліўся спачатку ў лакальныя сутычкі, а да 1659 г. у паўнамаштабную вайну.

Гэтая сітуацыя найбольш ярка адбілася на становішчы Старога Быхава. Нягледзячы на заключанае перамір'е, ён быў абложаны войскамі князя Івана Андрэевіча Хаванскага і казакамі І. Нячая. Аднак маскоўскія ратнікі знаходзіліся каля горада «для прыліку»: ваяваць з гараджанамі яны не маглі, але і пра адступленне загаду не было. Кіруючыся гэтым прынцыпам, войскі І. Хаванскага ў аблозе не намагаліся, абмяжоўваючыся толькі накіраваннем патрабаванняў пра здачу горада. У той жа час казацкі палкоўнік, які прызнаваў, што хоць «указу от… царского величества и от пана гетмана Войска Запорожского не имел», аднак па сваім жаданні не толькі акружыў сваім палком гэтую крэпасць, але і актыўна спрабаваў захапіць яе. Так, у канцы 1656 г. палкоўнік дамовіўся з князем І. Хаванскім пра дату і час штурму. Таксама вайскаводцы вызначылі, што напад пачнецца адначасова з двух бакоў горада: І. Нячай «с полком Чаусским, — половину города, а с другой половины Кн. Ив. Андр. Хованский с полком своим». У прызначаны час першымі штурм пачалі казакі, якія «впали … на валы Быховские и знамени два Быховские на валу взяли». Маскоўскі ж ваявода, у сваю чаргу, нават сігналу да нападу сваёй арміі не падаў. Гэтая акалічнасць дазволіла быхаўцам прадэманстраваць казакам усю сваю сілу. У жорсткай сутычцы гераічны гарнізон адбіў напад. Пры гэтым было забіта некалькі сотняў казакоў, «а иных живьем побрали». Прычым, па словах маскоўскага салдата Івана Спірыдонава, у аблозе тым часам знаходзілася 250 салдат-наймітаў, 1000 мяшчан і валашчан. Затое гарнізон меў ужо 60 гармат рознага калібру[2].

Пазней І. Нячай скардзіўся цару на нявартыя паводзіны ваяводы[3]. Аднак нічога злачыннага з пункту гледжання маскоўскай палітыкі таго

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 84.

[2] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 3: 1638–1657 / [ред. Н. И. Костомаров]. 1861 (обложка 1862). С. 592.

[3] Там жа. С. 589.

перыяду І. Хаванскі не здзейсніў. Хутчэй за ўсё, ён пагадзіўся на штурм толькі для таго, каб абложаныя добра «патрапалі» казакоў І. Нячая, з якімі ў маскоўцаў адносіны пагаршаліся з кожным месяцам. Улічваючы, што дзеянні войскаў Аляксея Міхайлавіча былі абмежаваныя палажэннямі Немежскага перамір'я, можна выказаць здагадку, што І. Хаванскі ўвязвацца ў бой нават не планаваў. Да канца ж 1656 г. казакі і царская армія наогул адступілі ад сцен Старога Быхава, а да горада пацягнуліся купцы з правіянтам з Магілёва, Пераяслаўля і Нежына. Напрыканцы, перад адыходам ад крэпасці, князь наогул прадаў правіянт свайго войска быхаўцам[1], чым, відаць, давёў да зубнога скрыгату чавускага палкоўніка.

На некаторы час стойкі горад быў пакінуты ў спакоі. Аднак гараджане сутыкнуліся з іншай праблемай. Дакладней, гэтая бяда закранула ўсю краіну. Ваенная разруха прывяла да таго, што ўвесну 1656 г. было засеяна вельмі мала палёў. У сувязі з чым палявыя мышы яшчэ ўлетку пачалі знішчаць хлеб на карню, а затым у клецях і гумнах. Ураджай загінуў, і краіна сутыкнулася са страшэнным голадам. Людзі елі катоў, сабак, падлу і чалавечыя трупы. Бывалі выпадкі, калі людзі рэзалі адзін аднаго, а целы забітых ужывалі ў ежу[2]. Спіс няшчасцяў ВКЛ дапоўніла «моровое поветрие» — эпідэмія, якая таксама забрала нямала жыццяў.

Аднак, нягледзячы ні на што, быхаўцы дэманстравалі стойкасць і цвёрдасць духу не толькі на родных валах. Так, у сярэдзіне 1656 г. у палон царскай арміі, якая аблажвала непакорлівую цвярдыню, патрапілі 18 абаронцаў горада. З-пад Старога Быхава яны былі адпраўлены ў Магілёў, дзе іх замкнулі ў драўлянай хаце, размешчанай у цэнтры горада. «Быховские полоняники» прасядзелі ў ёй больш за 30 тыдняў, пасля чаго здзейснілі ўцёк. Нягледзячы на тое, што знешняя варта, якая складалася з 20 ратнікаў, штодня аглядала хату, быхаўцы «подкопались под заднюю стену, которая стояла к острогу, и за город ушли под городовую стену рвом». Яны вярнуліся ў родную крэпасць і працягнулі ваяваць з ворагам[3].

Больш за тое, наяўнасць на захопленай тэрыторыі гэтага «вострава свабоды» натхняла і падштурхоўвала жыхароў ВКЛ да працягу барацьбы за сваю краіну. Паказальнай у гэтым плане з'яўляецца гісторыя шляхціча Паўла Сліўоўскага, які ў 1655 г. у баі пад Вільняй патрапіў у рукі непрыяцеля.

---

[1] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 3: 1638–1657 / [ред. Н. И. Костомаров]. 1861 (обложка 1862). С. 589.

[2] Успаміны Яна Цадроўскага [Электронны рэсурс]. URL: http://starbel.narod.ru/cadr.htm (дата звароту: 06.10.2017).

[3] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 3: 1638–1657. С. 591.

Слівоўскі знаходзіўся ў зняволенні ў заваяваным Смаленску два з паловай гады, пасля чаго, «подговорив несколько десятков шляхты и, уличив удобную минуту, бежал из плена в Старый Быхов». Тут шляхціч уступіў у атрад Мікалая Праздзецкага і працягнуў ваяваць з царскімі войскамі. Яго падраздзяленне было разбіта пад Горамі, але Слівоўскі сышоў у Мсціслаў, дзе падчас бою зноў патрапіў у палон, з якога вярнуўся толькі пасля вайны. Гэты аповед дайшоў да нас у выглядзе запісу ў актавай кнізе Мсціслаўскага гродскага суда ад 18 лютага 1667 г. пад загалоўкам «Атэстацыя, выдадзеная Шклоўскімі дамініканамі зямяніну Паўлу Слівоўскаму па вяртанні яго з Маскоўскага палону»[1]. Падобная гісторыя адбылася з Янам Панятоўскім, вайсковая дзейнасць якога пачалася пад Мсціславам. Затым ён удзельнічаў у выправах пад Магілёў, Крычаў, Копысь, паўтара гады быў у аблозе ў Старым Быхаве і ўрэшце рэшт таксама патрапіў у палон у Мсціславе[2].

Разам з тым знясіленай крэпасці з кожным днём усё цяжэй было трымаць абарону. Стары Быхаў быў адзіным горадам Вялікага Княства Літоўскага, які ў першыя месяцы вайны прыняў удар праціўніка і дагэтуль не быў заваяваны. Нягледзячы на тое, што трэці год вайны Рэчы Паспалітай і Рускага царства праходзіў ва ўмовах Немежскага перамір'я, чавускі палкоўнік І. Нячай працягваў прадпрымаць спробы авалодаць Старым Быхавам. Яшчэ ў канцы 1656 г., калі яго палкі разам з войскам І. Хаванскага стаялі пад бастыёнамі гэтай крэпасці, казацкі старшына пачаў накіроўваць быхаўцам лісты, у якіх заклікаў здаць горад не маскоўскаму войску, а менавіта яму — І. Нячаю. Пасля адступлення царскіх палкоў быхаўцы ўжо было прынялі гэтую прапанову, у сувязі з чым да сцен Старога Быхава прыбыў увесь полк чавускага палкоўніка. Аднак абаронцы не пагадзіліся ўпусціць усю гэтую арду ў свой горад і прапанавалі І. Нячаю заехаць у крэпасць толькі з 50 ці 60 казакамі. Палкоўнік, падумаўшы, паехаў назад у Чавусы[3].

Аднак у сакавіку 1657 г. Старабыхаўская крэпасць, вытрымаўшы ў аблозе два з паловай гады, усё ж такі скарылася і ўрэшце адчыніла свае брамы «беларускаму палку» І. Нячая, які адзначыў тады, што шляхта, мяшчане і ўсе

---

[1] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. 34: Акты, относящиеся ко времени войны за Малороссию (1654–1667) / предисловие Ф. Добрянского. 1909. LII, 588 с.

[2] Сліж Н. Героі, здраднікі, прыстасаванцы: асабістыя трагедыі ў вайну 1654–1667 гг. // ARCHE. 2012. № 6. С. 464–476.

[3] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 3: 1638–1657 / [ред. Н. И. Костомаров]. 1861 (обложка 1862). С. 590, 592.

жыхары Старога Быхава «паддаліся пад уладу і пратэкцыю нашу і прысягу выканалі нам...» [1]. Аб сваім дасягненні палкоўнік зараз жа паведаміў Б. Хмяльніцкаму, які, не губляючы часу, выдаў «Універсал Ягамосці гетмана Старому Быхаву аб стварэнні тут вольнага порта на Літве». Усім украінцам паведамілі, што «воляй Божай шляхта і жыхары Старога Быхава поўнасцю і ўсім сэрцам аддалі сябе пад нашу апеку і пакляліся не здаваць горад нікому іншаму, але перадаць яго ў поўную ўласнасць Запарожскага войска». Б. Хмяльніцкі вырашыў заручыцца падтрымкай кіеўскіх купцоў і заснаваць у Старым Быхаве цэнтр украінскага гандлю з Балтыкай[2].

У якасці прычын, якія падштурхнулі адважны гарнізон да прыняцця такога рашэння, можна назваць наступныя. Па-першае, нягледзячы на заключанае перамір'е, горад фактычна заставаўся ў аблозе, а дапамогі чакаць не было адкуль. Па-другое, быхаўцы сутыкнуліся са страшным голадам, у сувязі з чым трэба было прадпрымаць неадкладныя меры для таго, каб не даць абаронцам памерці галоднай смерцю. Існаваць жа за кошт «наездаў» на бліжэйшыя вёскі ўжо было немагчыма, бо ад іх практычна нічога не засталося. І, самае галоўнае, быхаўцы выдатна ведалі пра ўзаемаадносіны казакоў з маскоўскай адміністрацыяй, хутчэй за ўсё, яны чулі пра сутычкі паміж саюзнікамі, а таксама пра тое, што «черкасы» часам нападалі на царскія канвоі і вызвалялі палонных ліцвінаў[3]. Менавіта таму горад адчыніў браму не маскоўскім ратнікам, а казакам, якія не імкнуліся падпарадкоўвацца царскім уладам. Выбар аказаўся правільным. Маскоўскіх салдат да горада не падпускалі, а 16 верасня 1658 г. у казацкім абозе пад Пуціўлем, недалёка ад мяжы з Рускім царствам, прадстаўнікі Рэчы Паспалітай і казацкай старшыні падпісалі Гадзяцкую дамову — пагадненне аб вяртанні Украіны ў склад Рэчы Паспалітай. Казакі, у тым ліку І. Нячай, павярнулі сваю зброю супраць войскаў Аляксея Міхайлавіча. А Стары Быхаў без бою зноў перайшоў пад руку Яна Казіміра. Гэтыя акалічнасці давалі падставы цару не лічыць горад капітуляваўшым.

Аднак Рускае царства не збіралася адмаўляцца ад сваіх заваёў. У выніку актыўных ваенных і палітычных дзеянняў у 1659 г. Украіна ўжо ў каторы раз памяняла «палітычную арыентацыю» на прамаскоўскую, што было пацверджана тэкстам Пераяслаўскай дамовы, адзін з артыкулаў якой катэгарычна патрабаваў: «В городех, и местах, и местечках на Белой России ныне и впредь залогам черкасским не быть». І. Нячаю было загадана

[1] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667 [Электронны рэсурс]. URL: http://knihi.com/sahanovic/vajna.html (дата звароту: 24.01.2016).

[2] Катлярчук А. У ценю Польшчы і Расеі // ARCHE. 2008. № 7–8. С. 598.

[3] Там жа. С. 599.

пакінуць Стары Быхаў і здаць яго царскім ваяводам, а сваіх казакоў выслаць у Нежынскі і Чарнігаўскі палкі. У выпадку непадпарадкавання маскоўскія ўлады збіраліся распачаць супраць палкоўніка ваенныя дзеянні. Як таго і трэба было чакаць, І. Нячай не падпарадкаваўся[1] і працягваў далей ваяваць з царскімі атрадамі.



*Мал. 53. Выгляд Старога Быхава. 1780-я гг. (рэканструкцыя І. М. Слюнькова)*

Поспех пакінуў І. Нячая ў студзені 1659 г., калі са Смаленшчыны ў беларускія і літоўскія землі рушыла моцная армія князя І. Лабанава-Растоўскага. Маскоўскія ратнікі атрымлівалі адну перамогу за другой. Становішча не маглі палепшыць аб’яднаныя шляхецкія атрады, якія падтрымлівалі паўстанцаў. У выніку большая частка фарміраванняў казакоў і шляхты да лета 1659 г. была разгромлена ці перайшла на бок пераможцаў. Тыя ж казакі і шляхта, якія мелі намер змагацца да апошняга, збіраліся ў Старым Быхаве. За валамі фартэцыі сабралося каля 4 тыс. абаронцаў, якімі камандаваў І. Нячай. Палкоўнік пісаў няспынныя просьбы аб дапамозе, скіраваныя запарожскаму гетману І. Выгоўскаму, літоўскаму гетману П. Сапегу і каралю Яну Казіміру. А царскія ваяводы тым часам падводзілі пад гэтую крэпасць свае войскі з Полацка, Віцебска і Смаленска[2].

З 24 траўня 1659 г. пачалася аблога дняпроўскай крэпасці салдатамі С. Змеева, да якіх у ліпені падышлі галоўныя царскія сілы пад камандаваннем І. Лабанава-Растоўскага. А з чэрвеня яны распачалі больш рашучыя дзеянні. Вялікай была лютасць Аляксея Міхайлавіча на ўкраінскага палкоўніка, паколькі ўжо вясной гэтага года ён загадаў князю А. Трубяцкому, каб той выкінуў са Старога Быхава «изменника и душегуба»

---

[1]Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667 [Электронны рэсурс]. URL: http://knihi.com/sahanovic/vajna.html (дата звароту: 24.01.2016).

[2] Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве // ARCHE. 2006. № 6. С. 131–132.

І. Нячая, які парушыў прысягу і выступіў супраць цара[1]. Разам з акружэннем фартэцыі маскоўскія войскі рэгулярна рабілі вылазкі на заходні бераг Бярэзіны. Гэта рабілася для таго, каб прагнаць адтуль казацкія і добраахвотніцкія літоўскія аддзелы, якія падтрымлівалі кантакт з замкнёнымі ў аблозе і тым самым падбадзёрвалі іх. Сур'ёзнай жа небяспекі для царскай арміі гэтыя фарміраванні не ўяўлялі[2].

У Варшаве яшчэ 1 траўня 1659 г. было прынята рашэнне аб адпраўцы рэшткі войска на дапамогу І. Нячаю. Гэтае рашэнне было выканана ў лепшых традыцыях адміністрацыйнага апарату Рэчы Паспалітай. На працягу лета, да пачатку жніўня, дэмаралізаваная армія, якую больш цікавіла пытанне выбівання з дзяржавы свайго заробку, знаходзілася ў раёне Койданава (зараз Дзяржынск) і вёскі Лошыца (зараз раён Мінска). Увесь гэты час жаўнеры судзіліся са сваім камандзірам Янам Сасноўскім з-за шматмесячнай нявыплаты ім заробку і, не губляючы дарэмна часу, рабавалі навакольныя вёскі. Адсутнасць канкрэтных дзеянняў кароннай арміі выклікала незадаволенасць караля, тым больш што ў верасні да Яна Казіміра дайшлі звесткі, што маскоўцы пачалі інтэнсіўны абстрэл цвердзі і штурмы[3]. Разам з тым магчымасць дапамогі Старому Быхаву ўсё ж такі была. Аднак гетман Вялікага Княства П. Сапега, які кіраваўся толькі сваёй уласнай карысцю, не жадаў пакідаць Жамойць, каб яго сапернік у барацьбе за ўладу над войскам не ўзначаліў частку (12 харугваў) падначаленых яму падраздзяленняў. Урэшце, ён сабатаваў як мог выкананне рашэнняў сойма і караля[4]. Акрамя таго, верагодна, гетман не жадаў пакінуць горад пад уладай І. Нячая, каб пазбегнуць пасля вайны верагодных маёмасных спрэчак з ім. Захоп Старога Быхава царскім войскам гарантаваў захаванне цвердзі за Сапегамі ў выпадку яе вызвалення. На жаль, гэты чалавек, як і многія іншыя магнаты, свае асабістыя інтарэсы ставіў вышэй за дзяржаўныя, нават у такі цяжкі для краіны час.

Тым часам І. Нячай працягваў супраціў. Ён разлічваў на дапамогу з боку Украіны і Рэчы Паспалітай. Сведчаннем гэтага з'яўляюцца лісты казацкага гетмана І. Выгоўскага, знойдзеныя 27 чэрвеня маскоўскімі салдатамі ў захопленых недалёка ад Старога Быхава пяці «лазутчиков». І. Выгоўскі ва ўніверсале да быхаўцаў, «укрепляя их и обнадеживая

---

[1] Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве // ARCHE. 2006. № 6. С. 138.

[2] Там жа. С. 137–138.

[3] Там жа. С. 138–139.

[4] Маеўскі А. А. Павел Сапега ў дачыненнях з прыдворнай групоўкай у 1656–1660 гг. // ARCHE. 2016. № 3. С. 259–260.

в прелести их стоять крепко и сидеть в Быхове, а не сдаваться б конечно», абяцаў у хуткім часе накіраваць у горад падмацаванне[1].

У першыя тыдні асады залога нават рабіла шматлікія вылазкі, наносячы сур'ёзныя страты царскім войскам. І. Лабанаў-Растоўскі дакладваў у ліпені цару: «… а из Быхова к нашим шанцам бывают ежедневные вылазки многими конными и пешими людьми, и на тех вылазках… наших полков ратные люди быховских сидельцев побивают, шляхту и мещан и казаков многих; а выходцы, которые переметываются из Быхова к нам и которые взяты на боях у Быхова, сказывают, что побито на боях… быховцев больше 100 человек, а Нечайков де брат родной… на бою посечен по голове; а твоим ратным людям от быховцев урон бывает же; а на тех многих вылазках твоих ратных людей побито в розных числах и от ран померло…»[2].

Аднак з цягам часу надзея на дапамогу знікала, таму абаронцы пачалі ашчаджаць сілы і адмовіліся ад атак. Становішча крэпасці ўскладнялася яшчэ і тым, што сярод абложаных не было адзінства[3]. Частка казакоў выказвалася за капітуляцыю, многія зусім уцякалі з фартэцыі да маскоўцаў. У сваю чаргу некаторыя мяшчане таксама не жадалі служыць І. Нячаю і гаварылі, што слухаюцца яго «поневоле» і «впредь помогать ему не будут»[4]. Апошніх можна было зразумець: казакі, якія зараз знаходзіліся ў крэпасці, яшчэ зусім нядаўна асаджалі яе, пры гэтым забілі і паранілі многіх быхаўцаў.

Сапраўдным ударам для абаронцаў стала навіна пра падзенне ўкраінскага гетмана І. Выгоўскага, які змагаўся за незалежнасць ад Масквы. Аб гэтым чавускаму палкоўніку паведамілі самі царскія ваяводы, якія жадалі хутчэй схіліць яго здаць горад. Калі гэта не дапамагло, з Украіны прывезлі ліст да І. Нячая, падпісаны пераяслаўскім палкоўнікам Цімафеем Цяцюрай, нежынскім палкоўнікам Васілём Залатарэнкам і чарнігаўскім палкоўнікам Анікеем Сіліным. Яны пісалі, каб Нячай неадкладна здаў Стары Быхаў маскоўскім войскам і сам «біў чалом» цару. А праз некаторы час стала вядома, што І. Нячай абяцаў казацкім паслам, якія прыбылі да

---

[1] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 2: Разрядный приказ. Московский стол. 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. 1894. С. 672–673.

[2] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 2: Разрядный приказ. Московский стол. 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. 1894. С. 673.

[3] Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве // ARCHE. 2006. № 6. С. 141.

[4] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 84.

яго, што ён здасца толькі ў тым выпадку, калі да яго асабіста напіша сам новы гетман Юрый Хмяльніцкі[1]. Аднак капітуляцыя не адбылася.

Прыкладна ў гэты ж час, у пачатку верасня, дэмаралізаваная армія Рэчы Паспалітай павольна пацягнулася да Бабруйска. Адначасова ў Стары Быхаў дасылаліся лісты з заклікам трываць. Але рух быў вельмі павольны. Жаўнеры спасылаліся на тое, што цяжкая дарога пакалечыла значную колькасць коней. Нягледзячы на ўсё гэта, Яну Сасноўскаму ўдалося, выкарыстоўваючы сведчанні палонных, схопленых раз'ездамі пад Старым Быхавам, арганізаваць акцыю з мэтай дапамагчы І. Нячаю. Перад галоўнымі сіламі да Старабыхаўскай крэпасці былі адпраўлены восем конных харугваў пад камандаваннем смаленскага ваяводы Міхала Абуховіча і чатыры пад кіраўніцтвам берасцейскага суддзі Станіслава Казіміра Бабраўніцкага. Гэтыя атрады павінны былі знянацку атакаваць аддзел конніцы непрыяцеля, які стаяў на варце перад маскоўскімі акопамі, разбіць яго, прабіцца з правіянтам у Стары Быхаў і змяніць залогу. Але ўсё добра было толькі ў планах. Па дарозе да Старабыхаўскай фартэцыі многія жаўнеры пакідалі рады і вярталіся ў лагер. Дзякуючы сваёй арганізаванасці і дысцыпліне, царская конніца, якая пільнавала падыходы да горада, заўважыла харугвы М. Абуховіча і папярэдзіла свае войска, якое зарыентавалася ў намерах ворага і змагло перашкодзіць яму. А літоўскія ваяры адышлі за р. Друць[2].



*Мал. 54 Мушкецёр XVII ст.*
*Іншаземныя найміты са сваёй зброяй і з захаваннем еўрапейскай тактыкі бою служылі ў арміях Рэчы Паспалітай і Рускага царства*

Позняй восенню армія Я. Сасноўскага, якой дзяржава ўпарта не плаціла грошы, пад націскам свайго вайскаводцы прыйшла пад Магілёў. У сувязі з чым узнікае пытанне: чаму яны пайшлі ў гэты горад, калі Стары Быхаў да Бабруйска значна бліжэй? За пару дзён «грознае» войска папаліла ўцалелыя падчас вайны прадмесці Магілёва, пасля чаго, цалкам

[1] Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве // ARCHE. 2006. № 6. С. 141.
[2] Там жа. С. 143.

адмовіўшыся ад службы, самавольна пайшло на Глуск, а затым скіравалася ў Наваградчыну, страчваючы пры гэтым рэшту дысцыпліны[1]. За Друццю засталіся толькі конныя харугвы М. Абуховіча. На жаль, змаганне са сваёй арміяй падарвала здароўе і без таго хворага Я. Сасноўскага, які пасля ўцёкаў сваіх жаўнераў з-пад Магілёва з'ехаў у Слуцк, дзе памёр 26 красавіка 1660 г.[2].

А ў пазбаўленым надзеі на дапамогу Старым Быхаве ўмовы пагаршаліся з кожным днём. Аднак крэпасць пратрымалася яшчэ месяц. З-за недахопу правіянту ў канцы кастрычніка І. Нячай выпусціў з горада 216 чалавек, якія засведчылі І. Лабанаву-Растоўскаму, што ў горадзе шляхты, казакоў і мяшчан 1–1,5 тыс. чалавек і ўсе змораныя голадам. Нягледзячы на гэта, з фартэцыі рэгулярна рабіліся вылазкі ў бок маскоўскіх акопаў. Адна, асабліва моцная, была здзейснена 29 кастрычніка на пазіцыі С. Змеева і прычыніла вялікія страты яго войску. Акрамя таго, абаронцы забралі шмат зброі, у тым ліку марціру, якая прычыняла цяжкую шкоду ў горадзе. Гэтая вылазка зрабіла значнае ўражанне на царскіх ратнікаў, якіх уцекачы пераканалі, што залога бароніцца з апошніх сіл. Яшчэ большай нечаканасцю стала правядзенне наступнай удалай вылазкі 5 лістапада[3].

Такім чынам, І. Нячай і яго казакі, якія разам з мяшчанамі, нягледзячы на безнадзейнае становішча і прапановы захаваць іх жыццё ў выпадку капітуляцыі, не змянілі «палітычнай арыентацыі», да канца абаранялі свой апошні бастыён — Старабыхаўскую крэпасць. Разам з тым абложаныя разумелі, што дапамога да фартэцыі не прыйдзе, у сувязі з чым у горадзе павялічвалася колькасць тых, хто страціў жаданне змагацца. З цягам часу ўсім стала зразумела, што крэпасць доўга не пратрымаецца. Вось што пісаў у лісце да П. Сапегі са Слуцка Казімір Клакоцкі, які падтрымліваў сувязь з абаронцамі: «Быхаў, не падмацаваны дапамогай, яшчэ трымаецца, але яго ўжо можна лічыць страчаным… А пан Нячай пытаецца цяпер, чыя Украіна, бо ўжо страціў надзею. І пры гэтым ён хоча застацца. І хіба з дня на дзень здасца Маскве, бо тая яму падсоўвае прапановы здацца, гарантуючы здароўе і цэласць»[4]. Аднак палкоўнік добраахвотна не здаўся.

Даўно вядома, што моц крэпасці вызначаюць не таўшчыня яе сцен, а людзі, якія яе абараняюць. Ведаючы гэтую мудрасць, маскоўцы знайшлі слабае месца ў непакорнай цвердзі — здраднікаў. Царскія вайскаводцы

---

[1] Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве // ARCHE. 2006. № 6.
[2] Там жа. С. 144.
[3] Там жа. С. 144.
[4] Там жа. С. 145.

здолелі схіліць да здрады членаў гарадскога магістрата Габрыэля Ільініча і братоў Ранчкоўскіх, а тыя ў сваю чаргу — каменданта крэпасці немца Шульца[1]. Лёс Старога Быхава, які абараняўся па-геройску, быў вырашаны ноччу 4 снежня 1659 г., калі пачаўся штурм фартэцыі. Хутчэй за ўсё нехта са здраднікаў адчыніў браму, таму што царскім «ратным людям на том приступе урон небольшой учинился»[2].

У данясенні цару І. Лабанаў-Растоўскі паведамляў, што «государевы ратные люди город Старый Быхов приступом взяли и изменника Ивашку Нечая и брата его Самошку Выговского и жен их и шляхту и козаков и мещан многих живых взяли, а иных многих же в приступное время побили»[3]. Разам з тым зусім іншая інфармацыя адносна страт сярод абаронцаў прыводзіцца М. Ткачовым. Так, па яго звестках, «впавши» ў Быхаўскую крэпасць, раз'юшанае доўгай асадай маскоўскае войска «людей всех, в той осаде бывших, высекло». Асабліва пацярпелі палонныя шляхцічы і мяшчане, якіх «высекли в пень»[4].



*Мал. 55. Маскоўскія стральцы*

У час прыступу горад быў падпалены[5]. Моцна пацярпеў і замак, у якім «…с порохом взорвало палату, а в той… палате был порох ручной и пушечный и пушечные ядра… да семьсот пуль мушкетных»[6].

Так скончылася быхаўская эпапея. Як адзначалася, у гэтую крывавую ноч загінулі не ўсе. Шмат абаронцаў страцілі жыццё крыху пазней. Многіх уцалелых у якасці палонных вывезлі ў Маскву. Разам з тым камусьці пашанцавала ўратавацца. Сярод такіх можна назваць рабіна Іегуду-Лейб Пухавіцэра, які з жонкай і дачкой змог выйсці з крэпасці. Пасля гэтых падзей

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 84.

[2] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 2: Разрядный приказ. Московский стол. 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. 1894. С. 682.

[3] Там жа. С. 682.

[4] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 84.

[5] Коган Д. Московский разгром Быхова в 1659 г. // Еврейская старина. 1911. Т. 4. Вып. 1. С. 116.

[6] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 84.

яго сям'я з'ехала ў Палесціну праз Італію, дзе ў Венецыі І. Пухавіцэр выдаў збор сваіх пропаведзяў. У прадмове да гэтай кнігі ён апісаў жах пагрому ў Старым Быхаве і паведаміў, як перажыў тую трагедыю. Сярод іншага рабін адзначыў, што ў начным баі загінула каля 300 яўрэяў[1]. Астатнія ж дзеля захавання свайго жыцця прынялі хрост па праваслаўным абрадзе[2].

Дакументы захавалі прыклады таго, што праваслаўнае духавенства і шляхта не менш за іншых пацярпелі ад царскага войска. Вельмі цікавай крыніцай з'яўляецца тэстамент Якава Палікарповіча, аршанскага праваслаўнага пратапопа, датаваны 1662 г. З пачаткам вайны святар «…уносячы здоровъе свое от рук непрыятельских московских запровадилем был всю убогую маетность в Старый Быхов». У абложанай фартэцыі пратапоп перахоўваў не толькі ўласнае майно, але і ўратаваныя ім каштоўнасці, кнігі і архіў з аршанскай брацкай царквы. Пасля захопу горада ўсё гэта было разрабавана: «…за взятем тогож Старого Быхова през неприятелей московских тоеж моее рознае маетности на золотых пятнадцат тысяч взяли… и аппартаменты церкви брацкое Оршанское. То ест ризки две золочоные, евангелие сребroom опракос, кадильница сребреная и келихов два серебреных… крест золоцистый с каменями. А вси аппартаменты церковные тогож братства оршанского з розными справами на розных людей и кредиторов мне служачым з записами, декретами, протестаиями и листами заручными ест побрано»[3].

Маскоўскі ж уладар, калі атрымаў звесткі аб узяцці непакорнай крэпасці, адзначыў залатымі ўзнагароднымі ўсіх ратнікаў, якія ўдзельнічалі ў штурме. У 1660 г. толькі ў арміі С. А. Змеева такіх узнагароджаных налічвалася 2 400 чалавек[4]. Князь І. Лабанаў-Растоўскі «за быховскую службу 167-го, 168-го году, что он, будучи в тех годех с полком, литовских людей побивал во многих местех и город Быхов взяли взятьем», быў узнагароджаны прэміяй у 80 рублёў[5]. Акрамя таго, цар загадаў «в Старом

[1] Коган Д. Московский разгром Быхова в 1659 г. // Еврейская старина. 1911. Т. 4. Вып. 1. С. 116.

[2] Каганович А. Речица: История еврейского местечка Юго-Восточной Белоруссии. Иерусалим, 2007. С. 32.

[3] Марзалюк І. А. Людзі даўняй Беларусі: Этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.). Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2002. С. 196.

[4] Курбатов О. А. «Литовский поход 7168 года» князя И. А. Хованского и битва при Полонке // Славяноведение. 2003. № 4. С. 33.

[5] Боярская книга 1658 года [Электронный ресурс]. URL: http://www.vostlit.info/Texts/Dokumenty/Russ/XVII/1640-1660/Bojar_kniga_1658/text1.htm (дата обращения: 18.01.2016).

Быхове в каменном костеле быть соборной церкви Рождества Господа Бога и Спаса нашего Иисуса Христа»[1].

Трагічны канец геройскай абароны асабліва засмуціў і напалохаў тых, хто ў гэты час знаходзіўся ў Слуцку. Гэты горад трымаўся ў тым ліку дзякуючы таму, што дняпроўская крэпасць затрымлівала каля сябе значныя сілы непрыяцеля. Аб гэтым сведчаць словы з ліста К. Клакоцкага да князя Б. Радзівіла, у якім ён пісаў: «…цяпер чарга Слуцку, бо ўжо таксама няма ў Літве іншай фартэцыі, на якую б магла б Масква спакусіцца». Польскі мемуарыст і сучаснік тых падзей Мацей Форбэк-Летаў, заканчваючы апісанне змаганняў пад Старым Быхавам, аддаў своеасаблівую пашану мужным абаронцам, якія ў большасці сваёй не былі шляхцічамі: «Калі б абаронцам была дадзена дапамога, яны б заставаліся б непераможанымі, а цяпер яны на вечную памяць засталіся як магутныя змагары ўсялякага стану прыкладам паважнай веры перад каралём, гаспадаром нашым, і Айчынай»[2].

Зняволенага ж І. Нячая выслалі ў Сібір. Яго сваяк Ю. Хмяльніцкі неаднаразова прасіў Аляксея Міхайлавіча, каб той памілаваў палкоўніка, але заўсёды атрымліваў адмовы. Аднак пасля заканчэння вайны, падчас Андрусаўскіх перамоў, урад Рэчы Паспалітай дабіўся вызвалення І. Нячая і вяртання яго ў 1667 г. у Вялікае Княства Літоўскае[3]. Гэты факт цікавы тым, што дэманструе адрозненне ў адносінах маскоўскага ўладара да сваіх ворагаў і да сваіх хаўруснікаў. Пасля прыбыцця з Рускага царства 17 лютага 1667 г. былі пацверджаны правы палкоўніка на Бабруйскае староства, якое ён атрымаў у 1658 г., і на суму 23 тыс. злотых, якія І. Нячаю падарыла каралева Марыя. А 19 жніўня 1673 г. у памяць пра заслугі І. Нячая яму і яго жонцы нададзена пажыццёвае права на Загальскае староства[4]. Такім чынам, кіраўнік Рэчы Паспалітай не забыў пра адважнага палкоўніка, які гераічна абараняў Стары Быхаў.

Усім вядома: на чужой бядзе свайго шчасця не збудуеш. Вось і быхаўскім здраднікам не доўга шанцавала. Дакладна не вядома, які лёс іх напаткаў пасля падзення Старога Быхава, але з упэўненасцю можна сцвярджаць, што добрага з імі нічога не адбылося, таму што 29 ліпеня 1661 г. на сойме ў Варшаве маёмасць быхаўцаў Габрыэля і Яна Ільінічаў перадалі маёру Даніэлю Эйтафу, які ў 1660 г. як маскоўскі

---

[1] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 3: Разрядный приказ. Московский стол. 1660–1664 / под ред. Д. Я. Самоквасова. 1901. С. 54–55.

[2] Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве // ARCHE. 2006. № 6. С. 141, 146.

[3] Там жа. С. 146.

[4] Там жа.

камендант Наваградскага замка без бою перадаў яго пад уладу Рэчы Паспалітай[1].



*Мал. 56. План аблогі Старога Быхава. Пачатак XVIII ст.*[2]

А Старабыхаўская крэпасць у 1660 г. заваёўнікамі рыхтавалася да новых баёў. 21 сакавіка тут знаходзіўся гарнізон з 2 203 чалавек. У горадзе ствараліся запасы харчавання: «ржи и муки, и сухарей, и круп, и толокна 2 042 чети[3] с осминою и с четвериком, 370 пуд соли мелкой, да ступчатой соли 15 000 ступок, 100 пуд масла коровья». Пасля заканчэння крыгаходу на Дняпры планавалася даставіць у Стары Быхаў са Шклова яшчэ 600 чэцей сухароў, 300 чэцей мукі і 200 чэцей крупы[4].

У красавіку, калі ў горадзе яшчэ знаходзіліся палкі І. Лабанава-Растоўскага[5], сюды са Смаленска былі накіраваны 100 данскіх казакоў, якія пажадалі жыць у Старым Быхаве, а таксама дзве роты рэйтараў[6]. У гэты ж час каля р. Бярэзіны знаходзіліся нейкія літоўскія конныя аддзелы, што, на думку царскіх ваявод, складаліся з казакоў І. Нячая, С. Аскеркі і Я. Сасноўскага (які ў гэты час памраў у Слуцку). І. Лабанаў-Растоўскі вырашыў знішчыць іх, «чтобы те польские люди и изменники в том месте не умножились и не пришлиб к Быхову для порушенья Быховские осады

[1] Касажэцкі К. Кампанія 1660 году ў Літве // ARCHE. 2006. № 6.

[2] Малов А. В. Русско-польская война 1654–1667 гг. М. : Цейхгауз, 2006. С. 26.

[3] Чэць — мера аб'ёму сыпкіх рэчываў, каля 200 літраў.

[4] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 3: Разрядный приказ. Московский стол. 1660–1664 / под ред. Д. Я. Самоквасова. 1901. С. 45.

[5] Там жа. С. 58.

[6] Там жа. С. 55.

на нас»[1]. Маскоўскія ратнікі заявілі, што не пойдуць у бой. Зачэпка была простай: ваявода С. Змееў не знатнага роду, таму пад яго кіраўніцтвам яны змагацца не могуць. Празнаўшы пра гэта, І. Лабанаў-Растоўскі накіраваў да Бярэзіны двух ваявод. Пад кіраўніцтва князя І. Касаткіна-Растоўскага былі аддадзены 6 жылецкіх і гарадавых сотняў, кіраўнікі якіх не пагаджаліся ваяваць пад камандаваннем нерадавітага С. Змеева. У сваю чаргу менш пераборлівых ваяроў («витебскую шляхту да рейтар да романовских и ярославских татар да казаков донских да драгун…, полку вяземская сотня да монастырских слуг 2 сотни да 2 роты рейтар да рота могилевской шляхты да пехоты 1000 ч.») узначаліў С. Змееў[2]. З пераліку падраздзяленняў і колькасці падначаленых «радавітага» І. Касаткіна-Растоўскага і «нерадавітага» С. Змеева бачна, чыйму ваеннаму таленту аддаваў перавагу І. Лабанаў-Растоўскі.

Перад тварам падыходзячага ворага аддзелы Рэчы Паспалітай пакінулі пазіцыі і адышлі за Бярэзіну. С. Змееў прагнуў іх пераследаваць, але дух шляхецкай дэмакратыі перадаўся яго падначаленым, і яны адмовіліся ісці далей, спаслаўшыся на галечу і недахоп коней[3]. Як бачна, цяжкія ўмовы гэтай вайны адбіліся не толькі на настроях войска Рэчы Паспалітай.

29 красавіка на з’яднанне з войскамі князя І. Хаванскага, які дзейнічаў у глыбіні ВКЛ, С. Змееў вывеў са Старога Быхава амаль палову гарнізона. Пры гэтым ён канстатаваў, што за зіму 1659–1660 гг. з горада збеглі 43 рэйтары і памерлі 400 салдат (у гэтую лічбу ён уключыў і дэзертыраў). Пасля гэтага царская залога горада складалася прыкладна з 700 чалавек (кіраўнікоў гарнізона, аддзела данскіх казакоў і 607 салдат)[4].

У чэрвені 1660 г. войскі Рэчы Паспалітай пачалі наступ у цэнтральных раёнах ВКЛ. Людзей для абароны захопленых гарадоў у маскоўскіх ваявод ужо не хапала. Так, быхаўскі гарнізон складаўся ў гэты небяспечны час усяго з 952 салдат пры 20 гарматах (18 палкавых і 2 вялікіх). Прычым у іншых месцах справы былі яшчэ горшыя: залога Барысава складала 818 чалавек, Шклова — 113, Горак — 95. А гарнізон Смаленска, самай важнай крэпасці на ўсходзе ВКЛ, налічваў усяго 1 452 чалавекі. У сувязі са складанай і небяспечнай сітуацыяй Аляксей Міхайлавіч прыняў рашэнне вывесці малыя гарнізоны з некаторых гарадоў і злучыць

---

[1] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 3: Разрядный приказ. Московский стол. 1660–1664 / под ред. Д. Я. Самоквасова. 1901. С. 58–59.

[2] Там жа. С. 58.

[3] Там жа. С. 59.

[4] Там жа. С. 68, 72.

іх з залогамі больш баяздольных фартэцый. Так, напрыклад, маскоўскі гарнізон пакінуў Горкі, а Стары Быхаў было загадана «укрепить гораздо»[1]. Такім чынам, вялікія страты варагуючых бакоў, а таксама велізарныя памеры і жахлівае спусташэнне тэатра ваенных дзеянняў прывялі да таго, што ў гэты перыяд вайскаводцы ўжо не маглі аперыраваць арміямі ў некалькі дзясяткаў тысяч жаўнераў. Верагоднасць страты захопленых гарадоў прымусіла князя Б. Рапніна, які ўзначальваў маскоўскую абарону ў Падняпроўі, прасіць цара перавезці ўсе медныя гарматы з усіх гарадоў паўночна-ўсходняй часткі ВКЛ (у тым ліку і са Старога Быхава) у Смаленск, а замест іх перадаць у гарнізоны больш танныя і менш надзейныя жалезныя гарматы[2].

Восень 1660 г. адзначылася пераносам баявых дзеянняў армій Рэчы Паспалітай і Рускага царства на землі Падняроўя. У кастрычніку ў складанай сітуацыі апынулася і маскоўская залога Старога Быхава пад камандаваннем ваяводы Ф. Абярнібесава. 23 кастрычніка ён паведаміў пра цяжкі стан свайго гарнізона, у якога «хлебных запасов нет», «а ратные люди… помирают голодною смертью». Пры гэтым сам ваявода ў лістападзе — снежні захварэў настолькі моцна, што не мог гаварыць і ў яго адняліся рукі і ногі. Становішча пагаршала тое, што на салдат без перапынку нападалі казакі палкоўніка Д. Мурашкі, што стаялі «близко Быхова у Ворколабова монастыря». У сувязі з гэтым 24 кастрычніка з Магілёва на Д. Мурашку паслалі «посылку» ў выглядзе соценных людзей і рэйтараў. Адначасова з гэтым у шматпакутны горад на Дняпры на суднах направілі запасы харчавання (100 чэцей сухароў і столькі ж жыта). Казакі ж Д. Мурашкі пры падыходзе праціўніка, не чакаючы сутыкнення, адышлі ў больш бяспечнае месца — у Ігумен. Аднак правіянту, дастаўленага з Магілёва ў Стары Быхаў, было мала, у сувязі з чым Ф. Абярнібесаву загадалі, «чтобы он послал во весь Быховский уезд по обе стороны реки Днепра и велел хлебные запасы… сыскивать и возить их в Быхов»[3]. Але план па рабаўніцкім забеспячэнні харчаваннем праваліўся: збіраць было няма чаго. У сувязі з гэтым у снежні ў Стары Быхаў разам з падмацаваннем у 150 чалавек з Магілёва на падводах даставілі жыта і іншыя прадукты[4].

У 1661 г. у Старабыхаўскай крэпасці знаходзіўся полк Адама Гохварда, салдаты якога «голод и нужды всякие терпели, и траву, лебеду, и

[1] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 3: Разрядный приказ. Московский стол. 1660–1664 / под ред. Д. Я. Самоквасова. 1901. С. 105–106.

[2] Там жа. С. 105.

[3] Там жа. С. 196–197, 226.

[4] Там жа. С. 226–227.

мокрицу, и лошадиное мясо, и сырые говяжьи кожи, варя ели…». Ратнікі прасілі, каб «милосердный государ… за… службишко и за осадное терпение… велел из Старого Быхова» іх «со своей службы переместить», таму што многія з палка «побиты и в полон взяты, и с голоду со всякой осадной нужды померли… и которые остались, и те занемогли». Самога ж палкоўніка А. Гохварда арыштавалі за тое, што ён цару «хотел изменить»[1]. Зразумела, што Аляксей Міхайлавіч нават і не збіраўся пераводзіць кагосьці з фартэцыі ў іншае месца службы, у сувязі з чым 8 ліпеня 1661 г. 300 салдат і стральцоў быхаўскай залогі збеглі з горада[2].

1661 год стаў годам вызвалення Магілёва ад маскоўскай арміі. Таму значэнне Старога Быхава як апорнага пункта царскага войска істотна ўзрасло. А ў верасні гэтага года са Старабыхаўскай крэпасці адносна магілёўцаў была ажыццёўлена карная акцыя. 800 салдат пад камандаваннем падпалкоўніка Немчына прыбылі пад Магілёў і, уладкаваўшы засаду, накіравалі 50 конных ратнікаў пад гарадскую сцяну, дзе тыя напалі на прадмесце Струшню (цяпер — вуліца Магілёва) і «многих людей порубали и стада отогнали»[3]. Гарадская варта і мяшчане, натуральна, адправіліся ў пагоню за крыўднікамі, але трапілі ў рукі маскоўскім салдатам, якія «120 человек посекли», а «14 живых взяли»[4].



*Мал. 57. Кулі XVII–XVIII стст., знойдзеныя ў 2013 г. падчас раскопак у Быхаўскім замку*

М. А. Ткачоў паведамляе, што Стары Быхаў быў ачышчаны ад маскоўцаў 1 снежня 1661 г., калі да яго падступіла войска Рэчы Паспалітай пад кіраўніцтвам С. Чарнецкага ў складзе 7 тысяч конных і пешых салдат

[1] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 3: Разрядный приказ. Московский стол. 1660–1664 / под ред. Д. Я. Самоквасова. 1901. С. 390, 403.

[2] Там жа. С. 411–412.

[3] Там жа. С. 437 ; Могилёвская хроника. Полное собрание русских летописей. Т. 35. Летописи Белорусско-литовские. М. : Наука, 1980. С. 243.

[4] Акты Московского государства, изданные Императорскою Академиею наук. СПб. Т. 3: Разрядный приказ. Московский стол. 1660–1664. 1901. С. 437.

з 11 гарматамі[1]. Аднак гэта не так. Дакладна вядома, што горад яшчэ доўгі час знаходзіўся пад уладай Аляксея Міхайлавіча. Так, у траўні 1662 г. маскоўскі ўрад накіраваў сюды на падмацаванне новыя палкі, у 1663 г. царскі гарнізон у гэтым горадзе складаўся з 24 «начальных людей» і 1 тысячы салдат[2]. Але вызваленне ўсё ж такі адбылося ў 1664 г., калі мяшчане выгналі са Старога Быхава царскую залогу без дапамогі войска, сваёй уласнай сілай[3]. Хутчэй за ўсё, гэта былі тыя быхаўцы, якія пакінулі горад да таго, як ён трапіў у аблогу маскоўскіх войскаў, і рушылі ўглыб краіны. Напэўна, гэтыя людзі вярнуліся пасля захопу крэпасці І. Лабанавым-Растоўскім, таму што ва ўсім Вялікім Княстве ўжо не было бяспечных месцаў.

З гэтага часу і да заканчэння вайны ў 1667 г. Стары Быхаў фактычна знікае з пісьмовых крыніц. Ён упамінаецца ў 1664 г., калі маскоўскі князь Празароўскі перамог пад валамі гэтай фартэцыі атрады ваяводы Паца. У ліку ваеннапалонных тады апынуўся шляхціч Даніла Меньжык. Як і многія яго таварышы, ён пад канвоем быў накіраваны ў Маскву. Там ён ажаніўся і застаўся жыць назаўсёды. А праз некаторы час ужо прывычна адзываўся на прозвішча Меньшыкаў. Праз восем гадоў у яго нарадзіўся сын, Аляксандр Данілавіч Меньшыкаў, які пазней стаў «правай рукой» Пятра І[4]. У ліпені 1666 г. палкоўнік Кшыштаф Сцяцкевіч каля Старога Быхава збіраў казацкія харугвы ВКЛ для абароны ад украін-скіх «свавольных і непаслухмяных казакоў, якіх ні складзенае перамір'е, ні любыя загады спадароў іх маскоўскіх утрымаць ад вайны не могуць». Пры гэтым указанне аб адпоры «бунтарам» давалі «паны камісары і нашы, і маскоўскія»[5].

Пазіцыя абаронцаў Старабыхаўскай крэпасці яшчэ доўгія дзесяцігоддзі з'яўлялася прыкладам вернасці і стойкасці для іншых абывацеляў Рэчы Паспалітай. Гераічная пастава жыхароў горада атрымала належную ўхвалу не толькі ад Яна Казіміра, які 20 чэрвеня 1661 г. пацвердзіў прывілей ад 31 траўня 1655 г. Яго пераемнік Міхаіл Карыбут Вішнявецкі 20 лістапада 1669 г. санкцыянаваў, а на сойме 1670 г. зацвердзіў усе ранейшыя наданні

---

[1] Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мінск, 1991. С. 85.

[2] Сметы военных сил Московского государства 1661–1663 гг. [Электронный ресурс]. URL: http://www.vostlit.info/Texts/Dokumenty/Russ/XVII/1660-1680/Smet_voenn_sil_1661_3/text1.htm (дата обращения : 18.01.2016).

[3] Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667 [Электронны рэсурс]. URL: http://knihi.com/sahanovic/vajna.html (дата звароту: 24.01.2016).

[4] Курков И., Пушкин И. Могилевщина. Легенды, события, люди. Минск : Медиафакт, 2004. С. 70–71 ; Памятная книжка Могилевской губернии на 1861 год. Могилев, 1861. С. 21.

[5] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. 34: Акты, относящиеся ко времени войны за Малороссию (1654–1667) / предисловие Ф. Добрянского. 1909. С. 431–432.

быхаўцаў, права вольнага гандлю на рэках Кароны Польскай і ВКЛ ды вызваленне ад падаткаў на 20 гадоў[2]. Але адміністрацыя Рэчы Паспалітай выканала рашэнне Сейма ў лепшых сваіх традыцыях. У 1671 г. (праз год пасля прыняцця соймавай пастановы) адміністратары мытняў выдалі ўніверсал, у якім адзначалася, што «…вольнасці, наданыя канстытуцыяй 1670 года…, прыведзены вельмі невыразна і не паказваюць, ад якіх менавіта мыт яны вызваляюць жыхароў… І калі супраць іх учынена ўжо маніфестацыя, то скарбовыя дваране, пісары і іх памочнікі не павінны звяртаць увагі на гэтыя вольнасці і спаганяць мыты з усякіх тавараў па тарыфе»[3]. Як бачна, ураднікі не вельмі клапаціліся аб людзях, якія коштам свайго жыцця баранілі Радзіму ад ворага. Галоўнае, што хвалявала «эліту», — іх матэрыяльны дастатак. Пакрыўджаныя быхаўцы ў 1676 г. ездзілі на аўдыенцыю да новага караля Яна III Сабескага і прасілі яго абараніць іх ад чыноўніцкага сваволства[4]. У сувязі з гэтым Ян III, аддаючы пашану геройскаму гораду, адразу ж, 20 сакавіка 1676 г., выдаў прывілей, у якім чарговы раз пацвердзіў усе ранейшыя наданні для жыхароў Старога Быхава і выказаў надзею, што «іншыя нашы



*Мал. 58. Створка крыжа-энкалпіёна другой паловы XVI – пачатку XVII ст. з раскопак 2016 г. у Быхаве[1]*

---

[1] Гэтая медная копія-пераліўка з крыжа больш ранняга вырабу, прыкладна XIII–XIV стст. Першапачаткова меркавалася, што рэч выканана з бронзы, але падчас камеральнай апрацоўкі праступіў чырвона-карычневы остаў пад пацінай зялёнага колеру. Створка дрэнна захавалася, моцна каразіравана, пацярпела ад агню, дэфармавана. Пасля пэўнай хімічнай і фізічнай ачысткі з-пад слоя паціны праступілі раставыя выявы святара і чатырох святых.

[2] Бабятыньскі К. Стары і Новы Быхаў у час вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (1654—1655) [Электронны рэсурс]. URL: http://bha.knihi.com/10/bob10.htm (дата звароту: 07.09.2017).

[3] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. 4: Акты Брестского гродского суда / предисловие С. Шолковича. 1870. С. XLVIII-L.

[4] Там жа.

падданыя, духавенства і шляхта, да той жа цноты і веры, і абароны супраць непрыяцеля, ахвоту і прыклад з іх будуць брацьʼʼ[1].

Зараз хтосьці задаецца пытаннем: навошта быхаўцы так зацята абаранялі свой горад, калі іх дзяржава была такой дрэннай? Прасцей было б здаць яго і жыць спакойна пад уладай іншага манарха, як гэта зрабілі магілёўцы. Але дзяржаву, як і час, у якім жывуць, не выбіраюць. Краіна можа быць добрай ці дрэннай, але мы самі, а не іншаземны «добры дзядзька», можам зрабіць яе лепей. Гэтую праўду ведалі і нашы продкі, якія баранілі сваю Радзіму на быхаўскіх валах. І не іх віна ў тым, што Рэч Паспалітая і далей кацілася да прорвы. Яны зрабілі ўсё, што маглі. І нават больш.

[1] Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. 4: Акты Брестского гродского суда / предисловие С. Шолковича. 1870. С. 177–181.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Першая палова XVII ст. стала часам росквіту Старога Быхава. Ён быў пераўтвораны ў наймагутнейшую фартэцыю на землях ВКЛ, абарончы патэнцыял і ваенна-стратэгічнае значэнне якой сталі добра бачныя ў час войнаў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст. Разам з тым у першай палове XVII ст. у Старым Быхаве паўстала адна з найбольш вялікіх мураваных рэзідэнцый на ўсходзе Беларусі. Гэта значна павысіла статус паселішча. Перадумовай для гэтага стала тое, што Стары Быхаў з’яўляўся цэнтрам даволі вялікай зямельнай латыфундыі. Гэта забяспечвала магчымасці для росту і развіцця паселішча. Аднак не менш важнае значэнне меў суб’ектыўны фактар, а менавіта дзейнасць уласнікаў горада Яна Караля Хадкевіча і яго зяця Яна Станіслава Сапегі. Для іх Стары Быхаў з’яўляўся цэнтрам аднаго з найбольш значных зямельных комплексаў, асновай для ўмацавання пазіцый сваіх родаў у палітычным жыцці дзяржавы.

Адносна часу будаўніцтва Старабыхаўскіх умацаванняў да сённяшняга дня не існавала адзінага пункту гледжання. Аднак, дзякуючы выяўленым у апошні час дакументам, удалося вызначыць, што валы вакол горада пачалі ўзводзіць у 1611 г., а замак — усяго праз некалькі гадоў пасля гэтага. Такім чынам, будаўніцтва пачалося пры Я. К. Хадкевічу. Адначасова з завяршэннем мураванай рэзідэнцыі ў Старым Быхаве пры Я. С. Сапегу актывізаваліся работы на абарончых умацаваннях горада. Па ўсёй верагоднасці, у гэты час абарончыя ўмацаванні былі рэфармаваныя паводле правілаў старагаландскай фартыфікацыйнай сістэмы і набылі той выгляд, які зафіксаваны на панараме горада другой паловы XVII ст. і на планах XVIII–XIX стст.

Земляныя абарончыя збудаванні Старога Быхава складаліся з гарадскога вала і 12 бастыёнаў аднатыпнай пяцівугольнай формы на ім. Выключэнне складалі чатырохвугольны замкавы, а таксама трохвугольны крайні паўночны паўбастыёны. Сёння таксама нельга адназначна адказаць на пытанне пра тое, якой формы быў вуглавы паўднёвы бастыён. Перад гарадскім валам размяшчаўся роў глыбінёй 7–8 м і шырынёй 50 м, абрысы якога з геаметрычнай дакладнасцю паўтаралі контуры бастыёнаў. На ўчастку паміж Магілёўскай і Рагачоўскай брамамі роў быў запоўнены вадой. Часткі рова ад мастоў да поймавай раўніны, хутчэй за ўсё, былі сухімі.

Унутрыгарадская планіроўка Старога Быхава ў XVII ст. адпавядала асноўным правілам фартыфікацыі і прадугледжвала вядзенне вулічных баёў. Захаваныя планы горада канца XVIII ст. сведчаць пра тое, што паміж замкам і цэнтральным заходнім бастыёнам знаходзілася велізарная плошча шырынёй каля 80 м, якая прызначалася для размяшчэння войскаў. Злева і справа ад плошчы знаходзіліся драўляныя жылыя кварталы, якія ўтваралі вулічную сетку прамавугольнай формы, што адпавядала ўпарадкаванню гарадоў-крэпасцей эпохі Адраджэння. Вуліцы былі даволі шырокімі і забяспечвалі хуткае перамяшчэнне салдат з аднаго канца горада ў другі. Так, шырыня галоўнай вуліцы складала каля 10 м, астатнія былі вузейшымі — да 4 м.

Да цяперашняга часу агульнапрынятым з’яўлялася меркаванне пра тое, што ўсе гарадскія цэрквы, касцёл і манастыр у XVII ст. былі драўлянымі. Але праведзеныя даследаванні даюць падставы сцвярджаць, што ўніяцкая царква, а таксама будынкі касцёла і манастыра ў сярэдзіне XVII ст. былі мураванымі.

Старабыхаўская фартэцыя была даволі добра забяспечана артылерыяй: у 1692 г. у цэйхгаўзе захоўвалася 34 гарматы розных тыпаў. Пры гэтым, напрыклад, у 1676 г. дзяржаўны артылерыйскі парк ВКЛ налічваў усяго 42 гарматы, а ў арсенале адной з наймагутнейшых крэпасцей ВКЛ — Нясвіжскім замку — у 1657–1658 гг. захоўвалася 34 гарматы. Разам з тым неабходна адзначыць, што гармат у Старым Быхаве магло быць яшчэ больш, бо для абароны сінагогі і каталіцкага манастыра ў іх таксама захоўвалася невялікая колькасць гармат.

У 1654–1667 гг. Вялікае Княства Літоўскае спазнала, верагодна, самую разбуральную вайну ў сваёй гісторыі — вайну Рэчы Паспалітай з Рускім царствам. Менавіта падчас гэтай вайны Стары Быхаў увайшоў у гісторыю нашай краіны і стаў прыкладам паспяховай рэалізацыі канцэпцыі ідэальнага горада-крэпасці. Аблажаны войскамі ўкраінскіх казакоў, а таксама маскоўскімі войскамі з 29 жніўня 1654 г. да вясны 1657 г., горад не здаўся нават тады, калі практычна ўся тэрыторыя ВКЛ была захоплена непрыяцелем, а сталіца Вільня пала. На жаль, ваенныя дзеянні нанеслі гораду катастрафічныя страты, у сувязі з чым ён на доўгі час прыйшоў у заняпад.

Такім чынам, Стары Быхаў з’яўляецца адным з найбольш вядомых гарадоў-фартэцый Беларусі ранняга Новага часу. Войны сярэдзіны XVII ст. засведчылі высокі ваенны патэнцыял Старабыхаўскай фартэцыі і яе значэнне для абароны паўднёва-ўсходніх меж Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Таму далейшае даследаванне гісторыі Быхава ў азначаны перыяд з’яўляецца актуальнай задачай для айчыннай гістарычнай навукі і карыснае не толькі для вывучэння гісторыі самога горада на Дняпры, але і для пашырэння нашых ведаў аб ваеннай гісторыі і гісторыі архітэктуры Беларусі ў ранні Новы час.

# ДАДАТКІ

Дадатак 1. Сумяшчэнне спадарожнікавага здымка гістарычнай часткі Быхава з:

а) цэнтральнай часткай плана Старога Быхава 1781 г.;

б) рэканструкцыяй Ю. В. Чантурыі плана горада-крэпасці Старога Быхава пачатку XVII ст.




*а*




*б*

Дадатак 2. Інвентар Старабыхаўскай крэпасці за 1692 г.[1]


1533

INVENTARZ

Z woli Jaśnie Wielmożnego Jmć Pana Woiewody Wileńskiego Hetmana Wielkiego W. X. Lit. Dobrodzieia mego Podaniá Zamku Bychowa, Armatt Cekhauzu y amunicyey przezemnie niżey podpisanego Jmć Panu Jakobowi Dzierżbowi Maiorowi JKMci Gubernatorowi Bychowskiemu

1692

Prima Maii Anno 1692

Быховъ

Naprzod Zamek

Zamek przeciwko Rynku, idąc do zamku Most z obu stron z Poręczami na balasach toczonych w pół mostu krata z drzewa Holenderskiey Roboty wrota na biegunach z kratą nad wrotami pod Daszkiem Herb Jmći wchodząc do Zamku Brama murowana wrota z Fortką na zawiasach Pręt żelazny do zamykania nad Bramą Pokoy z kominem Piec cały y okna całe. Po lewey stronie Kuchnia murowana w niey Izby dwie z Kominami iedna Izba pusta. Po drugiey stronie Bramy Mieszkanie także murowane Drzwi dwoie na zawiasach Izby dwie Kominy dwa. Na przeciw Bramy Pałac Gurne Pokoie na dole Sklepy na gurze Izba Stołowa po zruinowaniu przez Nieprzyiaciela nowo Restaurowana z oknami bez Pieca y drzwi przystawione nowe Holenderskiey Roboty bez żelaza y tey

[1] Vilniaus universiteto biblioteka, Fond 4. Nr 34133 (A-1533). K. 1–4.

Izby stołowey przez wszystkie Pokoie drzwi na zawiasach
otwarto drzwi z Zamkami ieden zamek bez klucza okna do
koła całe szklanne z ostatney Izbai nad Stołowey Izby
od zachodu słońca wschody nad ktoremi Ganek okrągły na
cztyrech słupach Ciesielskiey roboty z Parcie na balasach
toczonych daszek okrągły guntami kryty. Nadole Skle
py pod Izbą nowo przymurowany drzwi dwoie na zawiasach
z Zamkami insze szeze drzwi Sklepy Nowe z Dawne Zas
wszystkie z kratami okna żelaznemi Drzwi na Zawiasach
z Zamkami

Studnia w Zamku denowo restaurowana ex fundo Cęgi nowy
nad Ziemią okrągły ganek z parcia[mi] na balasach toczonych
nakryty guntami

Browar nadole pod Zamkiem nowo Ezygowany na palach
nad rzeczką Makrzanką ktora tuz w Dniepr wpada do tego
Browaru drzwi dwie dwoyczaste y do Słodowni drzwi Cie
sielskiey roboty bez żelaz Pomost w sieniach y gdzie Kotły
maią być tamże Komin na słupach murowanych Izba
biała z Komnatą bez okien y bez pomostu na wodzie Ganek
do koła dłuższy tego budynku sążni osmnaście dranica
mi kryty gwoździami zbiiane dranice

Tamże nadole drzewa wywiezionego za Bramy podoląg
gdzie Nieboszczyk Wolff Gubernator miał budować stay
ni na Łąki Imci Bierwaczy kop dwadzieście Brusow
do Balek trzydzieści Kantow wielkich trzydzieści

W Mieście podle Zamku Szpichlerz na Zborze Gubernator
skie o dwu Piętrach z Zasiekami na dole y na Gorze
drzwi na zawiasach z Zamkami wewnętrznemi y z Skobla
mi Ganek do koła dranicami pobiany

Szpichlerz Skarbowy gdzie Zboże Prowiantowe sypać by
dz o dwu Piętrach z Zasiekami Drzwi na Zawiasach Zamek
wnętrzny y Skobel. y Zasuwy do Zamykania nowy

# Armata tak w Zamku iako na Wale będzia

| | | Numero armat | Jako długie łokcie | Według Moskiewskiej wagi funty kul |
|---|---|---|---|---|
| N3 2 zare | Działo Murzyn wpuł przepiłowany z Wilna przywiedziony od Pissera ... | 1 | | |
| N | Działo Zygismunda Augusta Krola ... | 1 | $4.\frac{1}{2}$ | 5 |
| N3 | Działa z Herbem Imśc Dobrodzieia posrodku pelikany z wyniosłemi skrzydłami lane pod czas Guberny Im Pana Sadyskiego Podskarbiego Lawety na truchliałe okowane bez kół | 2 | $2.\frac{3}{4}$ | 7 |
| | Działo alias Swarownia – Laweta nowa okowana z kołami nowemi okowanemi | 1 | 2 | 24 |
| N3 | Działa Im Pana Leona Sapiehy Podkanclerzego W. Ks. Lit. z Herbem MB ... Lawety okowane stare bez kół | 2 | $2.\frac{1}{4}$ | 7 |
| N | Działo Im Pana Hieronyma Chodkiewicza Kasztelana Trockiego z Herbem M ... | 1 | 3. | 2. |
| N3 | Działo Miasta Wilna za Krola Władysława trzeciego Burmistrzowie Senkiewicz Dubowicz | 1 | 5 | 5 |
| N3 | Działo także Miasta Wilna z Herbem Radziwiłłowskim | 1 | 5 | 5 |
| N | Działo z Herbem Krola Władysława Czwartego Przymi skrzy... | 1 | $2.\frac{1}{2}$ | 6 |
| | Mozdzierz Moskiewski funtow – | 1. | | 100 |
| N3 | Działa Rakoczego Xiążęcia Węgierskiego | 2 | $3.\frac{1}{4}$ | 8 |
| | Działo z Inscriptią I R S. Herb Snopek Laweta dobra koła kowane stare | 1 | $3.\frac{3}{4}$ | 2 |
| N3 | Działo Na nim Herb Ptak niesie krzyż y korona nad nim – | 1 | 3 | 5 |
| N3 | Działo Krola Zygismunda wtorego z Herbem zapał wielki Laweta nowa okowana bez kół | 1 | 3 | $1.\frac{1}{2}$ |
| N3x | Działo ze dwiema satyrami po bokach – Laweta nowa okowana bez kół | 1 | 4. | $1.\frac{1}{2}$ |

10 Działo na nim Herby Mała wydarta Pogonia, Gryff Łabędź y trzy Łątki — — — 2 4 1.2

Działo na nim Herb Łuk wyciągniony z Działa — 1 wtyle zapalu troche wyrwano

13 Działo Inflanskie do kola Łotwę Pharaulacak 1 1.4 2 Lawetakowa stara bez koł

14 Działko Polne z krzyżem Kawalerskim 1 Laweta nowa dobra okowana

Działek Polnych Moskiewskich z Lawetami okowanemi bez koł 8 2

Działko na rozione pod cegłą zawalone pod wyrwaną Prochem Cekauzu z Lawetą dobrą 1

Działko w Cekauzie pod Arganhami żelazne 1

Mozdzierz w Bychowie lany za Guberny Imć Pana Tudy chie Podkomorze o Krzyszkie 1 Laweta nowa nie okowana

Armat sztuk 34

Lawety do Wielkich armat dwie dobre okowanych nowych 2 ... dobre okowanemi do tej Lawe... ty ... dobre okowane Nowych

Kary co Działo ... na ... przywieziono okowane żelazem dwa Koła Wielkie y ... dwa na przedzie

Dzesięć dobrych ... ... do Lawet bez ... y ... 39

Laweta mozdzierzowa w Cekauzie nowa okowana —

Lawety dwie ... bez żelaz

Koło jedne od Kartanu złamane żelazo wszystkie dane

Od dwuch Lawet żelazo w Cekauzie wszystkie w całości stare od Starych Lawet

# Spisanie Cekauzu

| | | |
|---|---|---|
| Prochu beczek wielkich — — — — — — — — | # | 7. |
| Prochu beczek mnieyszych — — — — — — | # | 18. |
| Ołowu świn iako się nazywaią — w cięzney armatek od beczk — | # | 19 |
| Ołowu w armatach wielkich trzy graniastych — — | # | 13 |
| Ołowu sztuk wielkich ad instar cebra lanych — — | # | 6 |
| Ołowu w sztuczkach na funtow plus minus 50 sztuk | # | 7 |
| Saletry Barył — — — — — — | # | 16 |
| Ałunu Put Szlanki. | | |
| Granatow wielkich prożnych — — — — — — | | .2 |
| Granatow wielkich zaprawnych — — — — | # | 120 |
| Granatow mnieyszych zaprawnych iako to od szturmu bronige | # | 29 |
| Granatow ręcznych żelaznych prożnych — | # | 60 |
| Form do rzucenia z ręki granatow ręcznych drewnianych | # | 200 |
| | | 12 |
| Granatow szklannych ręcznych nie zaprawnych — | # | 35 |
| Granatow szklannych zaprawnych — — — | # | 30 |
| Karteczy zaprawnych wielkich dwiescie funtowych — | # | 50 |
| Karteczy zaprawnych sześć funtowych — — — | # | 59 |
| Karteczy zaprawnych trzy funtowych — — — | # | 115 |
| Karteczy zaprawnych blaszanych ośmiu funtowych — — | # | 12 |
| Karteczy prożnych dwieście funtowych — — | # | 143 |
| Karteczy mnieyszych prożnych bez oryłka — — | # | 175 |
| Kul armat wielkich do tuteyszych dział nie zgodnych — | # | 1500 |
| Kul zgodnych do tuteyszych armat większych y mnieyszych nad dwa funtowych — — | # | 560 |
| Kul dwa funtowych żelaznych ołowem oblanych — — | # | 150 |

## Strzelba

| | | |
|---|---|---|
| Arkabuz z napisem STANISLAUS DOVOINO — | # | 1 |
| Hakownic — łoże u nich złe u drugich niemasz — | # | 38 |
| Organkow z rur muszkietowych sztuk — | | 8 |
| Muszkietow lontowych nowo osadzonych co ich może zażyć — — | # | 88 |
| Muszkietow z łożami złemi a więcey bez łoż — — Tysiąc trzynaście — — | # | 1013 |
| Lontow do zapalenia abunde | | |
| Wiencow mocnych — 20 nie mocnych ~~mocnych~~ | | 100 |

| | | |
|---|---|---|
| Blach Warszawskich puł szodmey Pary | | |
| Sztuflow do Armat | N | 6 |
| Szturmspis z Zelazem | | |
| Szturmspisow bez Zelaz toczonych to iest Rodłbow | N | 1 |
| Krayczarow do Armat | N | 6 |
| Krzyzow drewnianych do przykrywania Rac | N | 3 |
| Pręt Zelazny wielki do Lania Armat | N | 5 |
| Do Formy do Lania Armat Zelaznych Prętow | N | 1 |
| Franciszkow toczonych drewnianych | N | 5 |
| Pik z grotami zelaznemi | N | 3 |
| Drzewca od chorągwiow iedna bez grotu | N | 25 |
| Kos prosto nasadzonych | N | 3 |
| Kayanciow Zelaznych | N | 15 |
| Lewar do podniesienia Armat na Lawetach z Kluczami z Kluczami | N | 10 |
| | | 1 |
| Formy dwie do Kul muszkietowych Lania po kilkunastu miesiac | | 2 |
| Łancuchy Szrubowe grube do spuszczowania Armat | N | 2 |
| Łancuchy mnieysze takze do spuszczowania armat | N | 2 |
| Bardysz Moskiewski | N | 1 |
| Klamrami do przybiiania Kłod kiedy tartakiem na wodzie | N | 3 |
| Swider alias Zagotnia do wyszadrowania Krzyz Kol armatnych | N | 1 |
| Sweder Zelazny długi pułtora łokcia | N | 1 |
| Dłoty Stelmachoe | | |
| Siekira | N | 2 |
| Skłut Cieselski | N | 1 |
| Dłot do wydłubania Piast armatnych | N | 1 |
| Strugi do ostrugania drzewa | N | 1 |
| Pił do tartaku wodnego | N | 2 |
| Piła Re[illegible] | N | 2 |
| Koły Zelazne alias Kęty do przebiiania murow | N | 1 |
| Swidrow Stolarskich | N | 3 |
| Hebłow Stolarskich | N | 2 |
| Rzezak do Gwintow wyrzynania odwiasłon | N | 2 |
| ~~[illegible]~~ | N | 1 |
| Od Kol Armatnych Buxow | | |
| | N | 11 |
| Wyrwantow | | 16 |
| Rez wielkich y mnieyszych | | 22 |
| Tradynkow | | 8 |

b[illegible] ompt[illegible]

Szalka albo Waga żelazna — — ze wszystkimi — — 1
Presznia — — — — — — 1
Krata żelazna nowa niewielka — — — — 1
Zasłonka żelazna od pieca — — — — 1
Rydlów do kopania ziemi — — — — 1
Łopaty żelazne do mieszania wapna domowe — — 8
Kotłów wielkich z pokrywami — — — — 3
Drzwi żelazne stare jedne — — — — 10
Kajdany żelazne dwoie — — — — 1
Łyny wielkie nowe — — — — 2
— 2

Krzyż od Bani Kościelney Rogi wszystkie wierzch złamany

Cegły Palonej gotowej w Cegielni Siedemnaście Tysięcy
Cegły złożonej w Bramie Mohilewskiey Sześć Tysięcy
Cegły niepalonej w Cegielni Sześć Tysięcy

Na Święty Michał według dawnego zwyczaju PP. Ziemianie Mają popisować się takze Dożywotnicy na Komi nstwie Siedzący co Rok na popis stawać przed Imcią Panem Gubernatorem powinni

PP. Mieszczanie Miasta Starego Bychowa także według zwyczaiu z Chorągwiami z Bębnami z Orężem Woiennym przed Jm Panem Gubernatorem popisować mają

Robotę Wałową Miasto powinno robić według ich zwyczaiu dawne począwszy z Wiosny aż do Zamrozków darnia wozić y ziemię sypać powinni za dozorem y roskazaniem Jm Pana Gubernatora

Wsi zaś skonfiskowanych [illegible] według zwyczaiu Powinności Wałową Robotę maią odrobić za Roskazaniem Jm Pana Gubernatora Te zaś wsi które na Kuźnicy siedzą do wału nie powinni y do żadnej [illegible] na [illegible] y do Zasypania Grobli

Zar Włosc w Jesieni z pola zwiezc takze Wałową Robotę odpra wowac maią y powinni za danem znac od Jm Pana Gubernatora

Ten tedy Inwentarz spisawszy stosuiąc się do Listu Jasnie Wielmożnego Dobrodzieia Jm Pana Gubernatorowi z pismem Rękj moiey podaię. Pisan w Starym Bychowie Roku y dnia ut supra.

Piotr Stanisław Rakocza

Kazimierz Minucki

# Rejestr Niedoszczyka Stolarza 5

| | | |
|---|---|---|
| Mieiz ieden | № | 1 |
| Multan ieden | № | 1 |
| Do Kuchni Żelazo to iest obtożyny | № | 2 |
| Kozły | № | 2 |
| Rożny dwa wielki y mały | № | 2 |
| Alembik wielki z czapką z trąbami y z prętami trasfka do mies żelazny Trzynog | № | 1 |
| Sagany trzy ieden wielki dobry drugi mnieyszy zły trzeci mały zepsowany | № | 3 |
| Kociołki trzy czwarty mosiężny zły | № | 4 |
| Trzynogi dwa trzeci mały zły | № | 3 |
| Kopyty dwa | № | 2 |
| Fajerka iedna żelazna druga miedziana | № | 2 |
| Brytwanna iedna bez rączki | № | 1 |
| Petelnia stara iedna | № | 1 |
| Konewka miedziana | № | 1 |
| Flaszka Cynowa iedna | № | 1 |
| Lewary do ciągnienia zbeczek napoiow dwa ieden krzywy drugi prosty | № | 2 |
| Lichtarze Cynowe cztyry z desuss po jeden ka do każdego | | 4 |
| Miednic dwie iedna wielka druga mnieysza | № | 2 |
| Piły ręczne trzy | № | 3 |
| Formy do lania kulei z rożnych | № | 1 |
| Puzderko bez flasz kwartowa | № | 1 |
| Szkatułka korzenna iedna | № | 1 |
| Skrzynieczka mała włoska zamkniona | № | 1 |
| Żelazo do opłatkow pieczenia | № | 1 |

[illegible]

Roku 1692. M[ie]ca maja 2 d[ni]
Inwentarz Ammunicyi
w Zamku Bychowskim
znayduiącey się przez Jmci
Pana Rohrze Czemilia Min-
skiego, przy podaniu Guber-
niy JmciPanu Dorohowi
z woli JW. JmciPana Sapiehi
Woiewody Wilen. Hetmana W.
WXL. spisany.

Inwentarz admunicyi
w Bychowie będący

5